Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

# БЕЛАРУСЬ У ГІСТАРЫЧНАЙ РЭТРАСПЕКТЫВЕ XIX–XXI СТАГОДДЗЯЎ: ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ І НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРАЦЭСЫ

Матэрыялы Рэспубліканскай
навуковай канферэнцыі

(Гомель, 14 кастрычніка 2021 г.)

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2021

УДК 94:39:323.1(476)“18/20”

**Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы :** матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (Гомель, 14 кастрычніка 2021 г.) / рэдкалегія : А. Р. Яшчанка (гал. рэд.) [і інш.] ; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2021. – 243 с.
ISBN 978-985-577-767-1

У зборніку прадстаўлены матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў : этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы», якая адбылася ў УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны» 14 кастрычніка 2021 г. Разгледжаны разнастайныя аспекты палітычнай і канфесійнай гісторыі Беларусі, сацыяльнага развіцця, асвятляюцца праблемы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, надаецца ўвага характарыстыцы сучасных этнакультурных працэсаў.

Адрасаваны навукоўцам, аспірантам, студэнтам, краязнаўцам, настаўнікам.

Матэрыялы канферэнцыі выдаюцца ў адпаведнасці з арыгіналам, падрыхтаваным рэдакцыйнай калегіяй, пры ўдзеле выдавецтва.

Рэдкалегія:
А. Р. Яшчанка (гал. рэд.), С. А. Чаропка, Дз. М. Талочка,
А. Дз. Лебедзеў, В. А. Міхедзька, М. І. Старавойтаў

**ISBN 978-985-577-767-1**

© Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», 2021

УДК 94:323.2:316.344.32(476)"18"

**А. І. Багдановіч**
(Мінск, УА «Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт»)

## ПАЛІТЫКА САМАДЗЯРЖАЎЯ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

У другой палове XIX ст. у Беларусі, як і ва ўсёй Расійскай імперыі, былі праведзены буржуазныя рэформы, якія карэнным чынам змянілі жыццё грамадства. Яны спрыялі развіццю прамысловасці, сельскай гаспадаркі, укараненню перадавых тэхналогій ва ўсіх сферах матэрыяльнай вытворчасці, што, у сваю чаргу, патрабавала дасле-даванняў, тэхнічных удасканаленняў і вынаходак. Нягледзячы на невялікую колькасць буйных навуковых цэнтраў ў беларускіх губернях, менавіта тут з'яўляецца мноства цікавых распрацовак, і даследаванняў ў галіне прыродазнаўчых і сацыяльных навук.

Матэрыяльна дзяржава не падтрымлівала ніякіх праектаў і даследаванняў у галіне прыродазнаўчых навук за выключэннем экспедыцыі генерала І. І. Жылінскага. Мясцовыя навукоўцы і вынаходнікі займаліся сваёй дзейнасцю за свой кошт або за кошт агульнарасійскіх грамадскіх навуковых таварыстваў, такіх як Рускае геаграфічнае, Рускае фізіка-хімічнае, Рускае тэхнічнае і інш. Членамі гэтых таварыстваў былі заможныя людзі, што плацілі ўзносы, за кошт якіх і падтрымлівалася навуковая дзейнасць інтэлігенцыі. Свае вынаходкі навукоўцы ўкаранялі ў масы праз рэгіянальныя, усерасійскія, міжнародныя выставы, якія ў другой палове XIX ст. па большай частцы знаходзіліся ў прыватных руках [4, с. 36].

Віленская археаграфічная камісія, заснаваная па ініцыятыве генерал-губернатара У. І. Назімава, а затым і М. М. Мураўёва атрымала ад урада заданне абгрунтаваць палітыку самадзяржаўя ў Паўночна-Заходнім краі. Яна павінна была адабраць для публікацыі крыніцы, якія пацвярджаюць "спрадвечную рускасць" беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх зямель, таму дзяржава асігнавала значныя сродкі. Толькі ў 1863 г. на патрэбы Археаграфічнай камісіі было выдзелена 14 тысяч рублёў.

Спачатку ўлады паспрабавалі жорстка кантраляваць дзейнасць камісіі за кошт уключэння ў яе склад адданых самадзяржаўю чыноўнікаў. У выніку атрымалася, што з 4 членаў камісіі толькі адзін умеў чытаць старажытныя тэксты – астатнія падыходзілі толькі для палітычнага нагляду. Менш чым праз год Мураўёў зразумеў, што такая

камісія не толькі не можа ідэалагічна адстойваць інтарэсы царызму, але і наогул нічога не можа і перагледзеў падыход да справы. Склад камісіі памянялі на больш прафесійны, і за 50 гадоў свайго існавання яна апрацавала і апублікавала 63 тамы крыніц аб'ёмам каля 35 тыс. старонак, а таксама правяла шэраг каштоўных крыніцазнаўчых даследаванняў [7, с. 32].

Рускае геаграфічнае таварыства было больш незалежнае ад улады таму, што існавала за кошт узносаў сваіх членаў і мела большую свабоду ў дзеяннях. Спробы дзяржавы дыктаваць яму тэматыку даследаванняў часцяком ігнараваліся, асабліва ў беларускай правінцыі. Гэта увыніку стала асноўнай прычынай негалоснай забароны дзейнасці яго Паўночна-Заходняга аддзялення.

У сярэдзіне 1860-х гг. улады спрабавалі прымусіць Рускае геаграфічнае таварыства выканаць ідэалагічны заказ. У 1863 г. яны падтрымалі планы РГТ па адпраўцы навуковай экспедыцыі на Паўночна-Заходнюю тэрыторыю для вывучэння насельніцтва, рэлігіі, класа і роду заняткаў. Аднак у сувязі з паўстаннем 1863 г. працы ў экспедыцыі былі спыненыя. Пытанне пра гэта зноў было узнята ў 1866 г. Экспедыцыю дазволілі, але пры ўмове, што асаблівае значэнне атрымаюць этнаграфічныя даследаванні, вынікі якіх трэба было прывесці ў адпаведнасць з афіцыйным пунктам гледжання прыналежнасці насельніцтва рэгіёну да рускага народа  Аднак члены РГТ не спяшаліся выконваць жаданне ўладаў і фальсіфікаваць факты таму, што вывучэннем беларускай зямлі займаліся добрасумленныя і высокамаральныя навукоўцы: Н. І. Насовіч, П. В. Шэйн, М. А. Дзмітрыеў, І. А. Берман і іншыя [6, с. 91].

У пачатку 1960-х гг. беларуская інтэлігенцыя выступіла за стварэнне Паўночна-Заходняга аддзялення Рускага геаграфічнага таварыства, якое павінна было аб'яднаць усіх краязнаўцаў і стаць цэнтрам культурнай, адукацыйнай і навуковай дзейнасці. Ініцыятыва яго арганізацыі належала прадстаўніку афіцыйных колаў – папячыцелю Віленскай навучальнай акругі І. П. Карнілаву, які хадайнічаў аб стварэнні Паўночна-Заходняга аддзела РГТ у якасці процівагі Археалагічнай камісіі пры Віленскім музеі старажытнасцей, які быў заснаваны ў 1855 г., на думку І. П. Карнілава, як цытадэль сепаратызму [5, с. 120].

Аднак Паўночна-Заходні аддзел РГТ стаў дрэннай процівагай, бо яго сябры таксама бачылі ў якасці асноўнай мэты сваёй працы аб'ектыўнае навуковае вывучэнне Беларусі, а не выкананне ідэалагічных заказаў. Таму ў 1875–1876 гг. дзейнасць аддзялення спынілі. Фармальна яно не было ліквідавана, але фактычна спыніла сваё існаванне. Актывізацыя мясцовай прагрэсіўнай інтэлігенцыі, якая выходзіць за

рамкі афіцыйнай прапаганды, была не ў інтарэсах самадзяржаўя. Вядомы беларускі этнограф Е. Р. Раманаў сведчыў аб тым, што на падставе імператарскіх цыркуляраў мясцовыя ўлады пагражалі дзяржслужачым, настаўнікам, урачам і іншым прадстаўнікам інтэлігенцыі, якія займаліся навуковай, літаратурнай, культурнай і адукацыйнай дзейнасцю, звальненнем і іншымі рэпрэсіўнымі мерамі [2, с. 84].

У 1855 г. Е. П. Тышкевіч стварыў Віленскі музей старажытнасцяў і Віленскую археалагічную камісію, якая існавала пры музеі. У музеі была сабраная найбагацейшая калекцыя помнікаў беларускай даўніны, якая налічвала больш за 27 тысяч экспанатаў. У першы год працы музей наведала 71500 жыхароў і гасцей Вільні. Супрацоўнікі музея і археалагічнай камісіі, напісалі працы па гісторыі, археалогіі, краязнаўстве і мовазнаўстве Беларусі. У планы стваральнікаў уваходзіла арганізацыя публічных курсаў у кожным з аддзяленняў: этнаграфічным, гісторыка-археалагічным, прыродазнаўчым. Планавалася таксама ператварыць Віленскую археалагічную камісію і музей у навуковае таварыства, што зрабіла б гэтыя ўстановы незалежнымі ад дзяржавы (і музей, і Камісія былі падпарадкаваныя Міністэрству адукацыі). Аднак гэты план не ажыццявіўся [3, с. 108].

Намер ператварыць музей у самастойнае навуковае таварыства супаў з паўстаннем 1863 г., што і справакавала яго разгром. Музей быў абвешчаны ідэалагічным гняздом сепаратызму і М. Мураўёў падпарадкаваў Музей старажытнасцяў і археалагічную камісію публічнай бібліятэцы. У Румянцаўскі музей было перададзена 268 экспанатаў, якія нагадваюць пра “... польскае у краі валадаранне і штучна падтрымлівюць паміж мясцовым насельніцтвам нязбытныя надзеі і злачынныя памкненні”. Па сведчанні сучаснікаў пасля мураўёўскага разгрому, музей уяўляў сабой сумнае відовішча, збор старажытнасцяў стаў дрэнна арганізаваным прыдаткам Віленскай публічнай бібліятэкі, а спробы яе кіраўнікоў Іллі Уладзімірава і Івана Спрагіса абараняць музей праз друк не ўвянчаліся поспехам [1, с. 85].

Як відаць з прыведзеных фактаў, самадзяржаўе матэрыяльна падтрымлівала толькі тыя навуковыя праекты, якія былі накіраваныя на вырашэнне яго надзённых праблем (экспедыцыя генерала Жылінскага) або на яго ідэалагічную падтрымку (Віленская Археаграфічная камісія). Самадзяржаўе імкнулася захаваць палітычны кантроль над іншымі навуковымі арганізацыямі, а часам проста прымушала іх прасоўваць вядомую Увараўскую трыяду. Калі навуковыя грамадства спрабавалі выйсці з-пад дробязнай ідэалагічнай апекі, яны зачыняліся. Нягледзячы на гэта, інтэлігенцыя, імкнуліся да аб’ектыўнага вывучэння беларускай

зямлі і большай часткай супраціўляліся спробам дзяржструктур прымусіць яе адыгрываць ролю правадыроў русіфікатарскай палітыкі. З-за сваёй навуковай і грамадзянскай сумленнасці большасць даследчыкаў не магло зрабіць неабходныя высновы, таму рэалізацыя фінансуюцца самадзяржаўем праектаў заставалася незавершанай або дала вынікі, якія супярэчаць чаканым.

## Список использованных источников и литературы


1 Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси. XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев – Минск : Белорус. наука, 1996. – 286 с.

2 Бондарчик, В. К. Евдоким Романович Романов / В. К. Бондарчик. – Минск: Изд-во АН БССР, 1961. – 307 с.

3 Гужалоўскі, А. А. З гісторыі музейнай справы ў Беларусі / А. А. Гужалоўскі // Беларускія музеі: гісторыя, хроніка, сучаснасць. – 1998. – № 4. – С. 15–57.

4 Киштымов, А. Л. Беларусь на выставках XIX начала XX в. : дисс. … канд. истор. наук: 07.00.02 / А. Л. Киштымов. – Минск, 2001. – 205 с.

5 Савицкая, А. А. О культурно-просветительской работе Северо-Западного отдела РГО / А. А. Савицкая // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. – 1987. – №. 6. – С. 119–127.

6 Шейн, П. В. Этнографическое исследование Северо-Западных губерний экспедицией Императорского Русского Географического общества / П. В. Шейн // Известия Императорского Русского Географического общества СПб, 1867. – Т. 3. – С. 87–98.

7 Яцкевіч, Д. Л. Віленская археаграфічная камісія. / Д. Л. Яцкевіч // Беларуская мінуўшчына – 1994. – № 2. – С. 29–35.



**УДК 94:314.151-054.73:341.241.7(476)"1921-1924"**



**В. М. Бароўская**

(Мінск, ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі»)


## ПРАЦА ЗМЕШАНАЙ РЭЭВАКУАЦЫЙНАЙ КАМІСІІ Ў 1921–1924 ГАДАХ. ЗВАРОТ КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

Пытанне аб звароце польскіх культурных каштоўнасцей узнікла па ініцыятыве расійскага боку непасрэдна пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., яшчэ да абвяшчэння незалежнасці Польшчы ў 1918 г.

і заключэння Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Так, Дэкрэтам от 28 лістапада 1917 г. быў створаны Камісарыят па польскіх справах, а 17 (30) студзеня 1918 г. СНК РСФСР прыняў дэкрэт, у якім рэгламентавалася, што прадметы даўніны і мастацтва, бібліятэкі, архівы, карціны, і наогул музейныя прадметы, дзе б яны не знаходзіліся, прымаюцца як нацыянальная маёмасць польскага народа пад абарону ўлады Рабочага і Сялянскага ўраду ў асобе Камісарыята па польскіх справах і Грамадства аховы старажытнасцей да перадачы іх польскім народным музеям [1, с. 205].

У сувязі з гэтым дэкрэтам былі прадпрыняты энергічныя меры па выяўленні, уліку і захаванні каштоўнасцей польскай культуры на тэрыторыі Савецкай Расіі, што дазволіла пазней перадаць Польшчы цалкам многія культурныя каштоўнасці. Іх частка, у тым ліку абсталяванне каралеўскіх замкаў у Варшаве і Кракаве, шматлікія скульптуры, карціны, габелены і інш. былі вернуты ўжо ў снежні 1921 г., праз месяц з пачатку працы змешанай спецыяльнай камісіі. Напрацягу 1922–1924 гг. прадметы даўніны і іншыя культурныя каштоўнасці, па меры іх знаходжання, вызначэння прыналежнасці (у некаторых выпадках нават частковай рэстаўрацыі – карціны Каналета) вярталіся ў Польшчу.

У сувязі з неабходнасцю рэалізацыі XI артыкула Рыжскага мірнага дагавора эканамічна-прававы аддзел Народнага камісарыята замежных спраў РСФСР 1 сакавіка 1921 г. правёў нараду па пытанні аб эвакуіраванай з Польшчы маёмасці і архівах [2, арк. 25–30]. У выніку нарады быў распрацаваны праект цыркуляра ва ўсе ўпраўленні музеяў, палацаў, архіваў, бібліятэк і іншых мастацкіх і навуковых сховішчаў РСФСР аб зборы дакладных звестак, складанні вопісаў прадметаў [2, арк. 18–23].

Канкрэтна пытаннямі перадачы культурных каштоўнасцей займалася створанная 7 кастрычніка 1921 г. змешаная расійска-украінска-польская камісія. На чале польскага боку стаяў А. Альшэўскі, савецкага – О. Ю. Шмідт (пасля яго змяніў П. Л. Войкаў). У складзе камісіі існавалі некалькі падкамісій: музейная (у складзе дырэктароў музеяў Львова і Кракава – А. Чалоўскі, Ф. Копер), бібліятэчная і гістарычных архіваў (у складзе прадстаўнікоў бібліятэк Кракава, Варшавы і Познані – Э. Кунцэ, С. Рыгель, Э. Хвалевік, К. Пекарскі), адміністратыўных архіваў (пад кіраўніцтвам У. Сухадольскага). У рамках камісіі існавалі пасады экспертаў. Яе месцазнаходжаннем была выбрана Масква, з аддзяленнямі ў Санкт-Пецярбурзе і Варшаве. Праца камісіі каардынавалася сакратаром С. Стажыньскім. У канцы сакавіка

1921 г. у Галоўным архіўным упраўленні было прынята рашэнне аб стварэнні 27 красавіка Камісіі для высвятлення пытанняў, звязаных з перадачай дакументаў Польшчы. У склад Камісіі ўваходзілі У. І. Пічэта, М. Ф. Бельчыкаў, С. К. Багаяўленскі, М. К. Любаўскі [2, арк. 59].

У выніку працы камісіі большасць прэтэнзій польскага боку было задаволена ці вырашана палюбоўна шляхам прадастаўлення раўнацэннага эквівалента. Разам з тым некаторыя польскія прэтэнзіі былі адхілены. Гэта датычылася, у прыватнасці, Літоўскай метрыкі. Эксперт расійска-ўкраінскай дэлегацыі У. І. Пічэта, у сваіх запісках адзначаў, што Літоўскай метрыка для беларусаў і літоўцаў з'яўляецца такім жа помнікам мінулых гадоў, як і Каронная метрыка для палякаў [3, арк. 13–17]. Пры атаясамленні архіва з культурнай каштоўнасцю дзяржавы неабходна кіравацца прынцыпам тэрытарыяльнага паходжання. Такім чынам, Літоўская метрыка, як збор дакументаў, створаны на тэрыторыі Беларусі і Украіны, не можа быць польскай культурнай спадчынай. Гэты прынцып лёг у аснову дакумента, падрыхтаванага П. Л. Войкава [4].

Падчас працы змешанай рээвакуацыйнай камісіі адзначыліся спрэчкі адносна звароту так званай калекцыі С. М. Красноўскага, якая налічвала 507 скрынь, сам уладальнік ацаніў яе ў 15 млн. рублей. У канцы 1917 г. пры пасрэдніцтве А. Лядніцкага, старшыні Ліквідацыйнай камісіі па справам Каралеўства Польскага, Красноўскі ахвяраваў свае каштоўнасці “польскаму народу”, што абараняла іх ад нацыяналізацыі і рабіла магчымым рэвіндыкцыю на карысць Польшчы. Дзякуючы намаганням А. З. Смалінскага, калекцыя захоўвалася на складах Петраградскага аддзела Таварыства апекі помнікаў мінулага.

Пытанне перадачы калекцыі С. М. Красноўскага было пастаўлена яшчэ ў 1918 г., калі сам уладальнік ад'яджаў у Варшаву. Пасля сямі месяцаў разгляду справы ў Народным камісарыяце замежных спраў РСФСР рашэнне звароту каштоўнасцей было адкладзена на нявызначаны тэрмін. Ужо пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г., у адпаведнасці з XI артыкулам, зноў было пастаўлена пытанне аб рэвіндыкцыі. Напрацягу пяці месяцаў (з 7 кастрычніка 1921 г. з моманту стварэння змешанай спецыяльнай камісіі і да канца сакавіка 1922 г., калі ў Варшаву былі накіраваны першыя эшалоны з рарытэтамі) у рамках пасяджэнняў польска-расійска-украінскай рэвіндыкацыйнай і рээвакуацыйнай камісіі абмяркоўвалася справа перадачы. С. М. Красноўскі вымушаны быў непасрэдна звярнуцца да Савета народных камісараў РСФСР, і калекцыя цалкам была адпраўлена цягнікам Масква–Варшава [5]. Згодна матэрыялам

перыядычнага друку [6], у раёне Стаўбцоў (Мінская вобласць) састаў з 17-ці вагонаў быў спынены, агледжаны супрацоўнікамі Народнага камісарыята замежных спраў РСФСР, што зменшыла колькасць каштоўнасцей на 48 скрыней.

Праблемным пытаннем у працы камісіі стала справа звароту званоў. Польскі бок прадставіў патрабаванні на 19848 адзінак, аднак не падмацаваў іх якімі-небудзь дакументальнымі доказамі. У выніку абследванняў 275 сховішчаў (толькі ў Ніжнім Ноўгарадзе было знойдзена 1373 адзінкі) савецкімі спецыялістамі было выяўлена 5874 званы, якія тэрытарыяльна належалі Польшчы. Астатнія былі вывезены або з беларускіх ці ўкраінскіх зямель. Па патрабаванні царкоўных суполак і мясцовых улад БССР 9 лістапада 1921 г. з Казані ў Мінск былі накіраваны па прыналежнасці 153 званы. Тым не менш гэта выклікала пратэст з боку польскай дэлегацыі, якая сцвярджала, нібыта яны належаць Польшчы [7, s. 117, 178].

Найбольш складанай справай стаў зварот Польшчы кніжных збораў, якія былі вывезены ў Расію пасля 1 студзеня 1772 г., а таксама архіваў. Рыжскі дагавор устанаўліваў, што “сістэматызаваныя, навукова апрацаваныя і якія прадстаўляць закончанае цэлае калекцыі, якія з’яўляюцца асновай скарбу сусветнага культурнага значэння, не павінны падлягаць разбурэнню” і калі выключэнне якой-небудзь часткі магло парушыць цэласнасць калекцыі, то гэты прадмет “павінен быць пакінуты на месцы за эквівалент у выглядзе прадмета роўнага навуковага ці мастацкага значэння” [8, с. 630]. У выніку з 1923 г. па 1934 г. у Польшчу вярнуліся бібліятэчныя зборы XVIII–XIX стст. агульнай колькасцю 13 257 рукапісаў, у тым ліку зборы А. Панінскага (каля 200 асобнікаў), зборы Нацыянальнага польскага музея (2308 рукапісаў) і іншыя рарытэты.

Расійска-ўкраінскай дэлегацыяй быў прадстаўлены ў ЦК УКП (б) даклад аб выніках яе працы ў 1921–1923 гг. У ім у главах “Музейная маёмасць”, “Архіўная маёмасць” і “Бібліятэкі і рукапісныя зборы” падрабязна апісваецца ход перагавораў з польскім бокам, пералічваюцца, якія культурныя і мастацкія каштоўнасці былі выданы польскаму боку, а якія з’ўляліся прадметам спрэчак. Даклад завяршаецца наступнымі вывадамі, што Рыжскі дагавор не ўтрымлівае ніякіх санкцый за яго невыкананне і так як у любым выпадку пры разнагалоссях бакоў не ўстанаўліваецца якіх-небудзь трацейскіх суддзяў, то гэтыя пытанні будуць вырашацца ўжо дыпламатамі ў наступныя дзесяцігоддзі. Гэта датычылася справы Літоўскай метрыкі, Кіеўскага цэнтральнага архіва, Крэменецкага музея.

Канчатковая рыса пад пытаннем аб звароце Польшчы культурных каштоўнасцей была праведзена ў Генеральнай дамове, падпісанай 16 лістапада 1927 г. У ёй бакі згадзіліся, што з моманту падпісання гэтага дакумента яны не могуць заяўляць ніякія новыя патрабаванні і прэтэнзіі, заснаваныя на артыкуле XI Рыжскага мірнага і дагавора і Дадатка № 3 да гэтага дагавора [9, с. 617]. У выніку працы камісіі па выяўленні тых ці іншых рарытэтаў спецыялісты прыходзілі да высновы, што частка прадметаў тэрытарыяльна і гістарычна звязана не з польскім народам, а з беларускімі і ўкраінскімі землямі. У адзінкавых выпадках гэта прыводзіла да перадачы каштоўнасцей беларускаму боку.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1 Ольшанский, П. Н. Рижский договор и развитие советско-польских отношений 1921–1924 / П. Н. Ольшанский. – М. : Наука, 1974. – 288 с.;

2 Иванов, Ю. В. Очерки истории российско (советско)-польских отношений в документах. 1914–1945 гг. / Ю. В. Иванов. – М., 2014. – 384 с.

3 Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). – Ф. 5325. Воп. 9. Спр. 223.

4 Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗП РФ). – Ф. 0384. Воп. 1. П. 102. Спр. 17658.

5 Войков, П. Л. Два года работы российско-украинской делегации в смешанных российско-украинско-польских реэвакуационной и специальной комиссиях по исполнению Рижского мирного договора. Доклад / П. Л. Войков. – М., 1923.

6 Grochowska, M., Nykiel Kinga, B. Krosnowski Stanislaw Maciej / M. Grochowska, B. Nykiel Kinga // [Электронный ресурс]. – 2020. – Режим доступа: http://www.polskipetersburg.pl/hasla/krosnowski-stanislaw-maciej – Дата доступа: 09.08.2021.

7 Kurjer Warszawski. – 1922. – № 100, 11 kwietnia. – S. 5. Zbiory muzealne prof. St. Krosnowskiego.

8 Dokumenty dotyczące akcji Polskich w Komisjach Mieszanych Reewakuacyjnej i Specjalnej w Moskwie. – Z. 6 : Szoste sprawozdanie roczne z działalności Delegacyj (17.V. 1922 – 17.V. 1923). – Warszawa, 1924. – 83 s.

9 Документы внешней политики СССР. У 24 т. – Т. 3: 1 июля 1920 г.–18 марта 1921 г. / редкол. : Г. А. Белов [и др.]. – М., 1959. – 723 с.

10 Документы внешней политики СССР. У 24 т. – Т. 10: 1 января – 31 декабря 1927 г. / редкол. : Г. А. Белов [и др.]. – М., 1965. – 687 с.

УДК 323.2:330.34(476)

**М. В. Бубнов**
(Минск, Белорусский государственный университет)

# ПРОЦЕСС ПРИНЯТИЯ ПОЛИТИЧЕСКИХ РЕШЕНИЙ КАК ЭЛЕМЕНТ ОБЕСПЕЧЕНИЯ УСТОЙЧИВОГО РАЗВИТИЯ (НА ПРИМЕРЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ)

Процесс принятия политических решений занимает существенное место в рамках современного государственного управления. Благодаря добросовестному, эффективному и своевременному осуществлению процесса принятия политических решений система государственного управления способна обеспечивать реализацию фундаментальных для современного государства функций. Значимыми функциями системы государственного управления служат: разработка, реализация, оценка эффективности политического курса, необходимого для обеспечения устойчивого развития в краткосрочной, среднесрочной, долгосрочной временной перспективе.

М. А. Щеткина отмечает: «Цели устойчивого развития – навигатор по пути к лучшему будущему человечества» [1, c.13]. М. А. Щеткина также считает необходимым обратить внимание на следующее: «Республика Беларусь является активным участником международного движения по обеспечению устойчивого развития. В июле 2017 г. в Нью-Йорке в рамках политического форума ООН наша страна в числе первых государств региона представила добровольный обзор по достижению Целей устойчивого развития. В нем были обозначены стартовые позиции на пути к выполнению Повестки-2030. Таким образом Беларусь продемонстрировала готовность внести свой вклад в решение важнейших мировых проблем, среди которых – укрепление мира, борьба с бедностью и неравенством, охрана окружающей среды, совершенствование систем здравоохранения и образования и другие» [2, c. 3].

Под терминологической категорией «устойчивое развитие» может пониматься создание таких условий функционирования и развития экономики государства, при которых базовые отрасли экономики государства способны достигать установленных на отчетный период показателей прибыльности и эффективно противостоять воздействующим на экономику внешним (повышение цен на сырье и энергоресурсы) и внутренним (снижение показателей занятости населения) негативным факторам.

В белорусском законодательстве нормативные основы устойчивого развития закреплены в Национальной стратегии устойчивого развития Республики Беларусь до 2030 г. Обеспечение устойчивого развития – один из наиболее важных императивов принятия политических решений в Республике Беларусь.

Под терминологической категорией «политическое решение» может пониматься одиночный либо кодифицированный, временный (рассчитанный на 1–3, 3–5, 10–15 лет действия) либо бессрочный нормативно-правовой документ общегосударственного уровня, принятый в рамках компетенции органов государственного управления и в пределах своего содержания (правовых положений, норм, принципов) устанавливающий, уточняющий, отменяющий, запрещающий, разъясняющий, корректирующий правовые основы функционирования и (или) развития важнейших сфер деятельности государства и общества – экономики, промышленности, науки, культуры, обеспечения государственной безопасности и т.д.

Процесс принятия политических решений как организационно-управленческий процесс может быть представлен в виде совокупности последовательно идущих этапов, таких как: сбор и анализ управленческой информации, формулирование вариантов политического решения, выбор необходимого варианта политического решения, ввод в действие политического решения, выбор средств и методов реализации политического решения, формирование плана мероприятий, необходимых для реализации политического решения, оценка (мониторинг) эффективности реализации политического решения.

Процесс принятия политических решений также может быть представлен в виде последовательности из трех основных организационно-управленческих этапов, таких как: подготовительный этап, основной этап, заключительный этап.

Подготовительный этап процесса принятия политических решений подразумевает осуществление предварительных мероприятий, необходимых для осуществления процесса принятия политических решений. В число указанных мероприятий могут быть включены следующие:

1. Мониторинг (информационно-аналитический обзор) политических проблем на внутригосударственном и международном уровне. Под политической проблемой следует понимать внутригосударственные либо воздействующие на государство извне противоречия, которые в неотложном либо плановом порядке требуют урегулирования путем принятия политических решений;

2. Выдвижение политической проблемы на повестку дня – включение политической проблемы в перечень вопросов, которые должны быть вынесены на обсуждение органами государственного управления и в дальнейшем урегулированы путем принятия политических решений. Информационной основой для выявления актуальных политических проблем служат публикации общегосударственных общественно-политических масс-медиа;

3. Сбор и систематизация управленческой информации, необходимой для принятия политических решений. Под управленческой информацией может пониматься информация следующего характера: публикации в общественно-политических средствах массовой информации, публикации в сборниках материалов научно-практических конференций, публикации в научных периодических изданиях (научных журналах), монографии. Важно помнить: переизбыток управленческой информации точно так же нежелателен, как и ее недостаток (нехватка).

Основной этап процесса принятия политических решений предполагает анализ собранной управленческой информации о политической проблеме. В ходе указанного анализа важно выяснить следующее:

1. Почему возникла политическая проблема, какие факторы могли оказать наиболее существенное влияние на ее генезис?

2. Какие могут быть варианты действий, необходимых для урегулирования политической проблемы?

3. Какой из вариантов действий для урегулирования политической проблемы является наиболее приемлемым для сложившейся обстановки?

4. Какие средства и методы необходимы для урегулирования политической проблемы: распоряжение органа государственного управления, выделение материально-финансовых средств, применение силы в рамках закона?

Заключительный этап процесса принятия политических решений предполагает оценку своевременности и финансовой эффективности реализации данных решений. На заключительном этапе процесса принятия политических решений устанавливается, было ли политическое решение реализовано (исполнено) в рамках отведенных для этого временных значений и объемов финансово-бюджетных и (или) материальных средств.

В рамках политического устройства государств, имеющих республиканскую форму правления, система государственного управления

представляет собой следующую совокупность структур (политических институтов):

1. Центральные и местные органы законодательной власти. Парламент формирует правовую базу процесса принятия политических решений – формулирует и вводит в действие законодательные акты (законы, кодексы законов, постановления), регулирующие порядок принятия политических решений. Местные законодательные собрания по мере необходимости уточняют и дополняют содержание правовых актов, составляющих правовую базу процесса принятия политических решений;

2. Центральные и местные структуры исполнительной власти. Правительство осуществляет формирование правовой базы процессов реализации и оценки эффективности процесса принятия политических решений. Местные органы исполнительной власти по мере необходимости уточняют и дополняют правовую базу, касающуюся процессов реализации и оценки (мониторинга) эффективности политических решений;

3. Конституционный суд государства отменяет политические решения, которые противоречат нормам Конституции либо противоречат иным нормативным актам общегосударственного значения. Верховный суд государства, а также суды административно-территориальных единиц привлекают к ответственности за нарушения законодательства процессе реализации политических решений;

4. Глава государства (президент, премьер-министр) координирует работу системы государственного управления, а также обладает полномочиями (законодательной инициативой,) в области подготовки, принятия, реализации политических решений;

Значимое место в процессах подготовки, принятия, реализации политических решений занимают методы информационно-аналитической деятельности. В совокупность данных методов могут быть включены: общенаучные методы исследования, методы социально-гуманитарных наук (статистика, экономика, маркетинг, социология и т.д.), а также методы политического анализа.

Общенаучные методы исследования (анализ и синтез, индукция и дедукция, абстрагирование и конкретизация, экстраполяция и интерполяция) занимают важное место в процессе принятия политических решений. При помощи общенаучных методов исследования в рамках процесса принятия политических решений осуществляются следующие аналитические действия: систематизация собранной информации, выделение самой важной и значимой информации из общей совокупности

собранных материалов, построение логических гипотез, подтверждение либо опровержение логических гипотез, формулирование промежуточных вариантов политического решения, выбор наиболее оптимального варианта политического решения.

Методы социально-гуманитарных наук (статистический анализ, методы экономической статистики, метод Дельфи (метод сбора и анализа управленческой информации), SWOT-анализ (анализ преимуществ и недостатков управленческой стратегии), построение дерева целей, методы управленческого планирования (разработка и реализация бизнес-плана) и прогнозирования метод сценариев)) и методы политического анализа активно используются в процессах реализации и оценки эффективности политических решений. Назначение данных методов – сформировать план мероприятий для реализации политических решений, а также оценить эффективность реализации данных мероприятий на практике.

**Список использованных источников и литературы**

1 Щеткина, М. А. Для достижения целей устойчивого развития нужно думать глобально, действовать локально / М. А. Щеткина // Беларуская думка. – 2018. – № 4. – С. 12–20.

2 Щеткина, М.А. На пути к глобальным целям / М. А. Щеткина // Беларуская думка. – 2019. – № 7. – С. 3–9.

**УДК 94:070:2-67(476)"1921-1939"**

**В. Ю. Булатая**
(Мінск, ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»)

## ДЫНАМІКА ПУБЛІКАЦЫЙ МАТЭРЫЯЛАЎ НА КАНФЕСІЙНУЮ ТЭМАТЫКУ НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «KRYNICA» (1921–1939)

У міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі выходзіў шэраг беларускамоўных сродкаў масавай інфармацыі. Прадстаўнікі разнастайных палітычных і царкоўных рухаў выдавалі прэсу, якая адлюстроўвала іх погляды на палітычнае, канфесійнае і нацыянальнае жыццё. Адным з самых стабільных і трывалых выдавецкіх праектаў стала тыднёвая газета “Крыніца” (“Беларуская Крыніца”), якая выходзіла ў перыяд з 1917 па 1940 гг. У масе матэрыялаў, якія былі апублікаваныя

ў вышэй названы час, адлюстроўвалася пазіцыя актывістаў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, якія, пераважна, былі звязаны з колам беларускага рыма-каталіцкага духавенства. У сувязі з гэтым, актуальным з’яўляецца вывучэнне матэрыялаў газеты “Крыніца” прысвечаных узаемаадносінам з іншымі канфесіямі. Дзякуючы таму, што газета стабільна выходзіла адносна доўгі час, уяўляецца магчымым прасачыць дынаміку публікацый матэрыялаў на канфесійную тэматыку, а ў сувязі з тым, што выдаўцы – гэта прадстаўнікі каталіцкіх колаў, на старонках газеты можна адзначыць іх стаўленне да іншых канфесій.

Матэрыялам даследавання з’яўляецца нумары газеты “Krynica” (“Białoruskaja Krynica”; 1917–1940). Выдавецкі орган газеты – Беларуская хрысціянская дэмакратыя. У 1921 г. газета пазіцыянавала сябе як хрысціянска-дэмакратычная, з 1921 па 1927 гг. – сялянская газета, 1927–1939 гг. – палітычная, грамадская і літаратурная газета [1, с. 107]. “Krynica” мела выразную грамадска-палітычную скіраванасць. Так, тэматычны спектр матэрыялаў – гэта палітыка, нацыянальнае пытанне, сельская гаспадарка, эканоміка, культура, кнігавыдавецтва. Сярод іншых тэм – праграмы БХД, гістарычныя нарысы, станаўленне Касцёла да царкоўнай ўніі. Тэма рэлігіі на працягу ўсіх гадоў не з’яўлялася асноўнай тэмай выдання, а фігуравала ў асобных інфармацыйных і аналітычных матэрыялах газеты [2].

Газета выходзіла раз на тыдзень, аднак часта канфіскоўвалася ўладамі. У 1926 г. “Krynica” была зачынена адміністрацыяй, замест яе стала выходзіць “Białoruskaja Krynica” [3, с. 547]. З 1937 г. выхад газеты стаў нерэгулярным праз закрыццё яе на пэўны час.

З той прычыны, што выдавецкі орган газеты “Białoruskaja Krynica” – Беларуская хрысціянская дэмакратыя, у якой большая частка кіраўніцтва была каталіцкімі актывістамі і святарамі, натуральна, што асноўны рэлігійны змест – публікацыі аб праблемах каталіцкага касцёла ў межах міжваеннай Заходняй Беларусі. Але ў газеце публікавалася пра жыццё і навіны з іншых канфесій. У прыватнасці, аб праваслаўных, уніятах і пратэстантах, якіх тады называлі “сэктантамі”. Гэта лагічна, бо адным з кірункаў працы БХД з’яўляўся рэлігійны кірунак [3, с. 547].

Матэрыялы на тэму Праваслаўнай царквы. Варта адразу адзначыць, што па матэрыялах у газеце назіраецца сімпатыя да Праваслаўнай Царквы. Некаторыя аўтары нават выказвалі ідэі аб’яднання царквы і касцёла [4, с. 2–3; 5, с. 1]. Да 1926 г. у газеце сустракаліся рэдкія матэрыялы аб жыцці ПАПЦ. Аднак сітуацыя пачала рэзка мяняцца. Пасля 1926 г. у газеце было яскрава адзначана: яе аўдыторыя – гэта, у тым ліку, праваслаўнае сялянства [6, с. 1]. У іншым нумары

ў артыкуле было акцэнтавана, што газета не выключае і праваслаўных беларусаў [7, с. 1–2].

У 1930 г. праваслаўнае жыццё ў Заходняй Беларусі сталі рэгулярна асвятляць і ўласныя праваслаўныя аўтары. У 1-ым нумары "Крыніцы" за 1930 г. на праваслаўнае свята Божага нараджэння ў газеце з'явіўся матэрыял, які быў падпісаны аўтарам "Праваслаўны беларус" [8, с. 1]. Пасля гэтага матэрыялы аб становішчы ПАПЦ і развагі як "праваслаўнага беларуса", так і "міраніна-беларуса", і "Праваслаўнага дзеяча" станавіліся больш частымі. Тэмы, на якую былі гэтыя матэрыялы – беларусізацыя ПАПЦ, шкода ўніі і магчымасць аб'яднання Праваслаўнай царквы і Касцёла [9, с. 1; 10, с. 1]. Аднак ужо ў 1936 г. матэрыялаў на тэму Праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі станавілася значна менш. Верагодна, гэта было звязана з цяжкасцямі, якія ўзнікалі ў газеты з яе выданнем, канфіскацыяй нумароў і перыядычным яе закрыццём.

Публікацыя праваслаўных аўтараў на старонках газеты "Крыніца" не з'яўляецца выпадковасцю. Вядома, што ў БХД дзейнічала праваслаўная фракцыя, віцэ-старшынямі БХД былі праваслаўныя беларускія дзеячы Я. Красоўскі і М. Дварэцкі [3, с. 544]. Таксама сама "Крыніца" пісала аб тым, што пасля 1926 г. адбылася пэўная трансфармацыя ў газеце: высветлілася, што сярод супрацоўнікаў і прыхільнікаў газеты былі і праваслаўныя, таму з таго моманту газета паступова перастала быць толькі выключна каталіцкай, наадварот, яна ставіла сабе за мэту аб'ядноўваць беларусаў, а не падзяляць [12, с. 1]. Супраца каталіцкіх і праваслаўных актывістаў на беларускай ніве адлюстравалася і на змесце газетных матэрыялаў аб жыцці праваслаўных беларусаў.

Матэрыялы на тэму ўніяцтва. У 1921 г. папулярнай рубрыкай газеты "Крыніца" стала рубрыка "Куток аб уніі", дзе аўтары разважалі аб тэарэтычным паяднанні Праваслаўнай царквы і Касцёла [11, с. 2; 12, с. 2; 13, с. 2]. Аднак пасля таго, як неаўнія стала распаўсюджвацца на тэрыторыі Беларусі (1924 г.) стаўленне аўтараў "Крыніцы" да з'явы ўніі стала негатыўным. Напрыклад, негатыўным ўспрымаўся той факт, што да адраджэння ўніі спрычыніліся польскія езуіты: нібыта яны пайшлі па лініі польскай традыцыйнай палітыкі, абмінаючы пры гэтым мову і характар беларусаў [14, с. 1]. Да ўніі, па меркаванні аўтара, далучаліся або тыя, "што пасварыліся з сваім свяшчэннікам, або тыя, што дзеля розных асабістых мэтаў хочуць мець добрую марку ў палякаў, а таксама тыя, хто пабачыў што прадстаўнікі альбертынскай місіі за духоўныя паслугі бяруць менш грошай, чым праваслаўныя, або зусім не бяруць" [14, с. 1]. Такое стаўленне аўтараў да ўніі прасочвалася падчас усяго перыяду выхаду газеты. Тэзіс аб тым, што неаунія – з'ява чужая для

Беларусі, выгодная польскім уладам для паланізацыі насельніцтва, суправаджаў публікацыі на працягу ўсяго выхаду газеты. Гэты тэзіс падтрымлівалі як каталіцкія, так і праваслаўныя аўтары.

Матэрыялы на тэму пратэстанцкай царквы. Увага аўтараў была звернута і да вернікаў-пратэстантаў, якія ў міжваенны час распаўсюджваліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Тады іх называлі ў друку "сэктантамі".

У артыкуле "Касцёл, Царква, Метадызм (да ідэалогіі БХД)" дакладна паказана аўтарамі, каго яны лічаць за "сваіх", а каго – за "чужых" [15, с. 1]. Так, Касцёл і Царква – "гэта не ворагі нашай народнасці, а сапраўдныя прыяцелі". У той жа час, метадызм, па іх меркаванню, прыносіў загубу веры, аслабленне маральных сіл і поўная яго залежнасць ад свецкай улады [15, с. 1]. "Сэкта метадыстаў – гэта нешта цалкам новае і чужое нам" [15, с. 1]. Аўтары лічылі, што метадызм не мог дапамагчы беларускай справе і рэлігійнаму выхаванню беларусаў.

Газета "Крыніца", з той прычыны, што яе выдавецкі орган – БХД, актыўна публікавала на сваіх старонках матэрыялы аб стане і жыцці іншых канфесій. На гэтай падставе можна зрабіць наступныя высновы па дынаміцы публікацый такіх матэрыялаў.

1. Найперш трэба адзначыць, што ў выдаўцоў і аўтараў газеты "Крыніца" ішла супраца з праваслаўнымі беларускімі актывістамі. 1926 г. – пераломны год у стасунках паміж імі. Газета па крысе стала мяняць арыентацыю: з каталіцкай аўдыторыі, на каталіцкую і праваслаўную, аб чым і заяўляла на сваіх старонках. З 1930 г. па 1936 г. на старонках газеты сталі актыўна публікавацца лідары праваслаўнай фракцыі БХД: яны разважалі аб становішчы Праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі, неабходнасці рэлігійнага аб'яднання, пісалі пра жыццё ў беларускіх вёсках.

2. Тэма ўніі прысутнічала ў газеце на працягу ўсіх гадоў свайго выхаду. Спачатку – як з'ява магчымая, а пасля 1925 г. – як з'ява, якая пачала свае распаўсюджванне на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Меркаванне аб тым, што унія – з'ява чужая для беларусаў і няшчырая – суправаджала фактычна кожную публікацыю на тэму неаўніі да 1937 г. Варта адзначыць, што такіх жа тэзісаў прытрымліваліся і праваслаўныя актывісты ў сваіх матэрыялах.

3. Да "сэктантаў" (пратэстантаў) стаўленне аўтараў газеты было такое ж негатыўнае, як і да ўніятаў. Тлумачэнне такога стаўленне было падобным да тлумачэння негатыўнага стаўлення да неауніі. Аўтары лічылі, што метадызм аніяк не мог дапамагчы Беларусі і беларусам – як канфесія, яна толькі падзяляе беларусаў, карысці не нясе і спрыяе паланізацыі.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1 Говін, С. В. Канфесійны друк у Беларусі / С. В. Говін. – Мінск : БДУ, 2008. – 287 с.
2 Białoruskaja Krynica. – 1927. – № 40.
3 Станкевіч, А. З Богам да Беларусі / А. Станкевіч. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.
4 Krynica. – 1924. – № 36.
5 Białoruskaja Krynica. – 1931. – № 32.
6 Białoruskaja Krynica. – 1926. – № 1.
7 Białoruskaja Krynica. – 1926. – № 38.
8 Białoruskaja Krynica. – 1930. – №1.
9 Białoruskaja Krynica. – 1928. – № 42.
10 Białoruskaja Krynica. – 1932. – № 36.
11 Krynica. – 1921. – № 29.
12 Krynica. – 1921. – № 27.
13 Krynica. – 1921. – № 23.
14 Białoruskaja Krynica. – 1927. – № 34.
15 Białoruskaja Krynica. – 1928. – № 28.

**УДК 94:796(476.2)"19"**

**С. И. Бусько**
(Минск, УО «Белорусский государственный
университет физической культуры»)

## ФИЗИЧЕСКАЯ КУЛЬТУРА И СПОРТ В ГОМЕЛЬСКОМ РЕГИОНЕ В НАЧАЛЕ XX ВЕКА

Формирование физической культуры современного типа и спорта следует рассматривать в широком культурно-историческом контексте, сквозь призму реалий Российской империи на рубеже XIX–XX вв. Спорт в белорусской провинции зародился, сформировался, развивался, как и в других странах, под влиянием множества факторов: объективных и субъективных, социально-экономических, культурных, религиозных, политических, военных, географических. Но зарождение спорта в Беларуси имело свою локальную специфику. Необходимо раскрыть эту специфику, выявить особенности, характерные черты зарождения и становления отечественного спорта и физической культуры современного типа.

К началу XX в. Гомель превращается в крупный экономический и административный узел в юго-восточной части Беларуси, уступая лишь губернскому Могилеву. Тесные связи устанавливаются с соседними центрами, Мозырь, Речица, Рогачев и другие города активно взаимодействуют с Гомелем. Экономические интересы связывают Гомель с Киевом, откуда приходят в регион новые явления в социальной и культурной сфере. Новые тенденции в сфере физической культуры и спорта проникают в эту часть белорусских губерний как закономерный итог процессов модернизации белорусского общества. Футбол, велосипед, теннис, яхт-клубы, гимнастика сокольского типа и другие явления отражаются как на страницах прессы, так и отражаются в архивных материалах. Общие тенденции хорошо просматриваются на примере двух ярких направлений – футбол и яхтинг.

1907–1914 гг. становятся «золотым» периодом для формирования новой городской культуры в белорусских губерниях. Политическая стабилизация, развитие промышленности, урбанизация приводят к возникновению социального запроса на городской досуг.

В июле 1911 г. на страницах газеты «Гомельская копейка» была озвучена идея создания в городе яхт-клуба. Автор заметки «О речном яхт-клубе» резонно отмечал: «Теперь, когда все увлекаются всякого рода спортом, необходимо подумать об учреждении яхт-клуба». Отдельно подчеркивалось, яхты и лодки на реке есть, преимущества судоходного Сожа также не стоило игнорировать. В качестве удобного варианта был предложен Мельников луг [1, с. 3]. Востребованность такой формы организации досуга в Гомеле была очевидна. Например, в этом же июле 1911 г. журналисты описывают лодочные гонки в двух классах: «с рулевым» и «без рулевого» на дистанции от городской пристани до упомянутого Мельникова луга [2, с. 2]. Особенностью Гомеля было отсутствие в городе и отделения Общества спасения на водах, при этом в контексте решения проблемы рассматривалась и возможность часть вопросов с безопасностью на воде возложить на потенциальный яхт-клуб [3, с. 3]. Однако, даже с таким интересом горожан и освещением в местной прессе, вопрос о создании яхт-клуба остался открытым.

В отличие от своих гомельчан, горожане Мозыря смогли юридически оформить создание яхт-клуба в городе. Устав был рассмотрен на заседании Минского по делам об обществах присутствия 13 июня 1913 г., а яхт-клуб был внесен в реестр обществ и союзов Минской губернии уже через несколько дней. Озвученные цели звучали достаточно широко и не ограничивались сугубо яхтами: «Доставить своим членам возможность заниматься всеми видами речного спорта как в летнее, так

и в зимнее время; знакомиться с приемами полезных гимнастических упражнений, изучать плавание и пользоваться удобными местами для купания» [4, с. 3]. Через несколько месяцев Отдел торгового мореплавания Министерства торговли и промышленности утвердил описание формы одежды мозырского яхт-клуба, устанавливаемой для почетных и действительных членов, должностных лиц и матросов (доминировали темно-синие цвета).

Архивные материалы детализируют интересы организаторов: содействие физическому развитию, организация полезных развлечений и воспитание любви к речному спорту среди учащихся местных учебных заведений, а также возможность удобного общения членов клуба и их семей. Для достижения намеченных целей яхт-клуб приобрел несколько и планировал построить в собственных мастерских несколько судов, закупались принадлежности летнего и зимнего спорта и гимнастические приборы, устраивался популярный в белорусских городах зимний каток. Яхт-клуб снимал помещение, организовал библиотеку, буфет, несколько танцевальных вечеров, лекции и игры [5, л. 5].

Как и в других уставах ограничивался приём в члены яхт-клуба воспитанников учебных заведений. Но в уставе мозырского яхт-клуба было интересное дополнение: по соглашению с учебными заведениями и за отдельную плату члены яхт-клуба брали на себя обязанность обучать плаванию с инструктором, управление судами на веслах и под парусом, бег на коньках и лыжах [5, л. 6 об.].

Для повышения своего статуса Правление мозырского яхт-клуба во главе с командором А. А. Перреном воспользовалось популярным в начале XX в. механизмом – обратилось с просьбой о покровительстве к Великому князю Александру Михайловичу. Его Императорское высочество рескриптом от 18 сентября за № 2041 уведомил командора, что он согласен. В свою, очередь Николай II одобрил принятие под покровительство Александром Михайловичем Мозырского яхт-клуба 12 августа 1914 г. Это давало еще больше вариантов для расширения деятельности членам яхт-клуба, однако события Первой мировой войны прервали развитие этого общества. Уже в конце сентября 1914 г. поступило распоряжение об исключении из членов клуба всех австрийских и германских подданных [5, л. 21]. С началом военных действий на территории Беларуси спортивная жизнь почти полностью прекращается.

Самый динамично развивающийся вид спорта в начале XX в. – футбол. Гомель и соседние населенные пункты считаются одними из первых в Беларуси, где отмечены полноценные футбольные матчи. Именно 1911 г. указывает федерация футбола Беларуси в качестве

начала этого вида спорта в нашей стране [6, с. 5]. С одной стороны, в пользу нового вида спорта сыграло отсутствие полноценных альтернатив (хотя трек в городе существовал). С другой стороны, ощущалось влияние Киева, где футбол был развит на высоком уровне, с этим городом у Гомеля были налажено тесное сотрудничество.

Киевлянин А. Либман стоял у истоков «Первой гимназической команды», это явление в условиях запроса на новые формы физической активности привело к возникновению и других команд «Надежда», «Виктория», «Окраина», «Новобелицкий кружок любителей спорта», «Стелла», в Ченках – даже две команды. Рост популярности футбола был ощутимым: уже летом 1912 г. гомельские футболисты проводят матчи в населенных пунктах южной части губернии – Добруш, Новозыбков, Клинцы и др. [6, с. 6]. Под влиянием Гомеля появляется футбол в Речице, где в 1912–1913 гг. были организованы футбольные команды спичечной фабрики «Днепр», проволочно-гвоздильного завода, ремесленного училища и некоторых казённых учреждений города [7, с. 9]. Кстати, появление обществ на гражданской основе, без участия государства, приводило к появлению параллельных консервативных патриотических организаций с физкультурным профилем. В упомянутой Речице в ноябре 1913 г. начало работать Речицкое общество ревнителей изучения в учебных заведениях г. Речицы и Речицкого уезда военной гимнастики и военного строя (председатель – Е. В. Ольденкоп, уездный предводитель дворянства) [8, л. 35].

Важно отметить, что и понимание футбола не сводилось к «беготне». Интересна позиция А. Либмана, озвученная в газете «Гомельская копейка». Он описывает историю футбола, его эволюцию и социальные задачи, отмечает педагогический аспект игры [9, с. 3]. Летом 1911 г. в газете отмечается многозадачность его кружка: «Кроме игр, молодые спортсмены выписали из-за границы гимнастические снаряды: диск, колья, шест для прыжков…думали даже устроить состязания на трэке» [10, с. 3]. О наличии программы развития свидетельствует факт быстрой трансформации футбольных команд в юридически зарегистрированные организации с типовыми уставами. Это дало им возможность проводить состязания, вечера, печатать афиши, продавать билеты, арендовать поля.

Физическая культура и спорт в Гомеле и в прилегающем регионе в начале XX в. развивались динамично, о чем свидетельствует растущее количество новых форм организации досуга. Спорт выходит за пределы Гомеля, охватывая как города, так и местечки: Речицу, Мозырь, Новозыбков и др. Футбол, яхт-клубы, общества физического развития свидетельствуют о качественных изменениях в городской среде.

**Список использованных источников и литературы**

1 О речном яхт-клубе // Гомельская копейка. – 1911. – № 4. – С. 3.
Адным з першых, хто паспрабаваў класіфікаваць беларусаў на асобныя «нацыянальныя групы», быў афіцэр расійскай арміі, этнограф і картограф нямецкага паходжання Р. Ф. Эркерт. У сваёй працы «Взгляд на историю и этнографию западных губерний России» [2], якая выйшла ў якасці дадатку-тлумачэння да «Этнографический Атлас западнорусских губерний и областей» [3], наконт этнатэрытарыяльнай адрознасці беларусаў ён разважаў наступным чынам: «Первоначальные национальныя особенности, свойство почвы, соседство Литовцев и влияние Поляков создали несколько национальных групп Белоруссов, которыя существуют еще и теперь, или именно теперь-то более или менее ясно. Особенно заметны две главныя группы. Первую из них составляют так называемые настоящие Белоруссы [*тут і далей вылучана Р. Ф. Эркертам – Ю. В.*] в губерниях Витебской и Могилевской (также далее на восток) и в восточной части Минской губернии. Они примыкают на западе к Латышам, к Двине вверх до Десны и далее к Борисову, вниз по Березине. Другую группу составляют живущие далее на западе Белоруссы, которые однако сами не зовут себя этим именем, да и Поляками

не называются Белоруссами; они по большей части не дают себе никакого национального названия, а язык свой называют «простым». Великоруссы и Поляки в общежитии обыкновенно обозначают их словами: «из униятов». <...> Большая часть Подлясья, в особенности Сокольский уезд, и весьма немногия места Августовской губернии в Царстве Польском, населены третьей, наиболее ополяченной категорией Белоруссов (Подляшанами)» [2, с. 64].

Галоўным крытэрыем свайго падзелу беларусаў на тры этнаграфічныя групы (жыхароў Заходняга Палесся ён аднёс да «маларусаў») Р. Ф. Эркерт паспрабаваў зрабіць як ідэнтыфікацыю людзьмі, што непасрэдна ўваходзілі ў гэтыя групы (г. зн. уласна беларусамі), так і знешнюю катэгарызацыю тымі, хто ў гэтыя групы не ўваходзіў, але жыў тут па-суседству («в общежитии») (г. зн. рускімі і палякамі). Пры гэтым, што вельмі важна, высновы даследчыка грунтаваліся не толькі на асабістых назіраннях, але, як сцвярджалася, і на сведчаннях «некалькіх сотняў салдат, ураджэнцаў тых мясцовасцей» [2, с. 5]. Аднак знешнім маркерам этнічнай ідэнтычнасці, як вядома, у працах Р. Ф. Эркерта выступала канфесійная прыналежнасць як афіцыйная ўліковая адзінка Расійскай імперыі таго часу. Нельга не заўважыць, што прапанаваная ім фармалізаваная класіфікацыя беларусаў на дзве асноўныя групы – заходнюю і ўсходнюю, з якіх толькі апошняя прызнавалася «сапраўднай», у цэлым адпавядала гістарычна-геаграфічнаму падзелу тэрыторыі іх пражывання на «Літву» і «[Белую] Русь», дыферэнцыяльныя прыкметы якіх у XIX ст. ужо моцна размыліся [4, с. 159].

Кожную з гэтых груп беларусаў Р. Ф. Эркерт у духу свайго часу надзяліў прымардыяльнымі этнаграфічнымі ўласцівасцямі: «Настоящие Белоруссы находятся на очень низкой степени образования; жители Могилевской губернии очень бедны, малаго роста и слабаго сложения; их язык, одежда и нравы подверглись польскому влиянию меньше, нежели в большей части уездов Витебской губернии, которая, по своему географическому положению, была долго театром войн между Поляками и враждебными им соседами на севере». «Собственную Белоруссию», дзе «обработка земли в высшей степени запущена», даследчык метафарычна параўноўваў «с бедной, но прекрасной девушкой, которая может рассчитывать на богатое наследство» [2, с. 65].

А вось заходнія, ці «каталіцкія» беларусы ўсяляк прыраўноўваліся ім да палякаў і супрацьпастаўляліся «велікарусам»: «Католические Белоруссы вообще (которых мы более или менее считаем Поляками) почти все носят польский костюм, отличающийся от одежды православных Белоруссов; по своему образу мыслей, привычкам и роду

жизни, они совершенные Поляки. <...> В нравах и роде жизни западных, не настоящих Белоруссов, сильно обнаруживается польское влияние; но у них до сих пор и не было почти никакой связи с Великоруссами. Они бреют бороду и усы, одеваются очень бедно, и имеют темный цвет лица. Общественные удовольствия их заключаются в музыке (скрипка) и пляске; для последней они собираются по праздникам в корчме (совершенно польском заведении, составляющем резкую противуположность к чисто русскому постоялому двору) и попарно, мущина с женщиной, пляшут польские танцы» [2, с. 66]. Зазначым, што падобны стэрэатып заходніх беларусаў, як моцна спаланізаваных і акаталічаных, захоўваўся цягам усяго XX ст.

Выкананая такім чынам этнаграфічная класіфікацыя беларусаў добра ўпісвалася не толькі ў гістарычны, але і ў тагачасны палітычны кантэкст, калі тэрытарыяльная ідэнтычнасць беларусаў вымяралася даследчыкамі ў параўнальнай сістэме каардынат іншасці/падобнасці з іх ідэалагічна супрацьпастаўленымі суседзямі – рускімі і палякамі. Паказальна, што сімвалічнай шкалой адліку прасторавай адрознасці беларусаў ад рускіх і палякаў для Р. Ф. Эркерта служыла Маскоўская шаша: «Если мы, следуя по древней Московской дороге, внимательно станем подвигаться вперед из Подлясья к востоку, то нас поразит интересный факт постепенного уменьшения польскаго элемента и прогрессивнаго усиления русскаго элемента» [2, с. 65].

Што тычыцца літоўцаў, то Р. Ф. Эркерт падзяліў іх толькі на дзве групы, «находящиеся между собою в близком родстве, а именно на Литовцев в тесном смысле слова, или Литвинов, и Жмудь» [2, с. 69]. Аднак, калі беларусы на створанай ім этнаграфічнай карце былі пазначаны адным якасным фонам, то літоўцы ў адпаведнасці з гэтай класіфікацыяй выяўлены ў двух розных колерах, што адпаведна пазначаюць рассяленне «літвінаў» і «самагітаў» (ці «Жмудзі») [3, Т. I]. Па сутнасці, гэта была першая картаграфічная спроба этнаграфічнага рэгіянавання Літвы, якая адлюстроўвала гістарычны падзел літоўцаў на дзве вялікія групы: аўкштайтаў («Літву») і жэмайтаў («Жмудзь»).

Характарызуючы розніцу паміж гэтымі групамі «літоўскага племені», Р. Ф. Эркерт адзначаў, што «Жмудь в нравственном и материальном отношении стоит гораздо выше Литовцев», а «самый чистый тип ея можно найти в Тельшевском уезде, где в тоже время и очень любимое земледелие развито гораздо более, нежели во всех прочих уездах, населенных Жмудью» [2, с. 69]. Апісваючы Жэмайцію, даследчык параўноўваў яе са Швейцарыяй: «В топографическом отношении страну, населенную Жмудью, можно назвать чем-то в роде

Швейцарии; селения и дома отличаются чистотою и довольством». Жэмайты, на ягоную думку, вылучаліся таксама «большою религиозностью, привязанностью к католической вере, твердостью и энергиею характера и воинственным духом», а «жмудское наречие отличается от литвинскаго самостоятельным развитием и отсутствием польскаго влияния» [2, с. 70].

Фактычна, як і ў выпадку з «сапраўднымі беларусамі», меншая апалячанасць жэмайтаў аўтаматычна ўздымала іх у афіцыйнай этнічнай іерархіі на прыступку вышэй за сваіх усходніх супляменнікаў літоўцаў, сярод якіх «в качестве дворянства, шляхты и городских жителей» глыбока ўкараніўся і падначаліў свайму ўплыву «польский элемент» [2, с. 69]. Таму Жмудзь, дзе «нисколько не пострадала национальность туземнаго народа», а «все попытки иезуитов ввести польский язык не удавались», разглядалася Р. Ф. Эркертам як рэгіён яскрава самабытны і культурна эталонны: «Нравы просты и патриархальны; любовь к родине очень сильна. Народ отличается приветливым и веселым характером; мущины ростом меньше, нежели Литвины; женщины очень красивы собою, прекрасно сложены и хорошо одеты, привязаны к дому, чистоплотны и очень целомудрены» [2, с. 70]. Падобны стэрэатып Жэмайціі, як своеасаблівага рэзервата «сапраўднай» літоўскасці, канструявалі многія даследчыкі XIX ст. [5, с. 73].

Такім чынам, этнаграфічная класіфікацыя беларусаў і літоўцаў, выкананая Р. Ф. Эркертам у кантэксце пошуку іх этнічнай тыповасці, адлюстроўвала гістарычны падзел літоўцаў на дзве вялікія групы – аўкштайтаў («Літву») і жэмайтаў («Жмудзь»), а беларусаў – на ўсходніх (пераважна праваслаўных («сапраўдных»), з выразнай этнічнай ідэнтыфікацыяй), і заходніх (канфесійна неаднастайных («не сапраўдных»), з размытай этнічнай ідэнтыфікацыяй).

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1Лескинен, М. В. Великоросс/великорус. Из истории конструирования этничности. Век XIX / М. В. Лескинен. – М. : Индрик, 2016. – 680 с.

2 Эркерт, Р. Ф. Взгляд на историю и этнографию западных губерний России (с атласом) / Р. Ф. Эркерт. – Санкт-Петербург : В тип. Дома Призрения Малолетних Бедных, 1864. – 72 с.

3 Эркерт, Р. Ф. Этнографический Атлас западнорусских губерний и соседних областей / Р. Ф. Эркерт. – Санкт-Петербург, 1863. – 28 с.

4 Белы, А. Хроніка Белай Русі: Імагалогія Беларусі XII–XVIII стст. / А. Белы. – 2-е выд., папраўл. і дапоўн. – Смаленск, 2013. – 468 с.

5 Внукович, Ю. И. «Главное, здесь Литва уже выделена от Руси». Конструирование отличительности литовцев и белорусов в этнографическом дискурсе XIX века / Ю. И. Внукович // Этнокультурная идентичность: феноменология и вариативность в контекстах истории XIX–XXI веков: Материалы Девятнадцатых Международных Санкт-Петербургских этнографических чтений. – СПб., 2020. – С. 70–75.

**УДК 338.487-6:39(476.5-37Браслав)"2021"**

**М. С. Высоцкая**
(Мінск, ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі»)

## РАЗВІЦЦЁ РЫНКУ ТУРЫСТЫЧНЫХ ПАСЛУГ БРАСЛАЎСКАГА КРАЮ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ Ў КАНТЭКСЦЕ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯЎ

Развіццё турыстычнай сферы ў Браслаўскім раёне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь “Аб турызме” і Дзяржаўнай праграмай “Беларусь гасцінная” на 2021–2025 гг. У цяперашні час развіццё сферы турызму адбываецца ва ўмовах сусветнага турыстычнага крызісу, выклiканага пандэміяй каронавіруса COVID-19 і наступнымі абмежавальнымі мерамі. Следствам гэтага стала практычна поўная адсутнасць міжнародных выязных і ўязных турыстычных патокаў.

Агульная колькасць турыстаў, якія наведалі гасцініцы і аздараўленчыя арганізацыі Браслаўскага раёна за студзень-ліпень 2021 г., склала 7196 чалавек, з іх 381 замежны грамадзянін або 5,3% ад агульнай колькасці. Для параўнання: студзень – ліпень 2020 г. 4634 чалавек, з іх 303 замежных грамадзян; студзень – ліпень 2019 г. 6600 чалавек, з іх 1 526 замежных грамадзян [1].

За студзень – ліпень 2021 г., паводле аператыўных дадзеных, аб’ём экспарту турыстычных паслуг склаў 96,07 тыс. дал. ЗША пры планавым гадавым заданні 220,4 тыс. дал. ЗША ці 40,5% да ўзроўню 2019 г. Для параўнання: студзень – ліпень 2020 г. – 21,6 тыс. даляраў ЗША; студзень – ліпень 2019 г. – 237 тыс. даляраў ЗША [1].

Турыстычную інфраструктуру раёна складаюць 3 гасцініцы, 8 аздараўленчых арганізацый, 84 турыстычныя стаянкі (агульнага тыпу,

заказныя). Маецца 28 агульнадаступных аб'ектаў грамадскага харчавання, з іх – 4 аб'екты прыдарожнага сэрвісу, 352 гандлёвых аб'ектаў.

Браслаўшчына таксама з'яўляецца лідэрам у Беларусі па аказанні агратурыстычных паслуг, тут зарэгістравана 343 аграсядзібы. Толькі за студзень-ліпень 2021 г. зарэгістравана 43 новыя суб'екты аграэкатурызму.

Найважнейшым суб'ектам на турыстычным рынку Браслаўскага раёна з'яўляецца дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова "Нацыянальны парк "Браслаўскія азёры"". Выканана рэканструкцыя адміністрацыйнага будынка, выраблены касметычны рамонт нумарнога фонду баз адпачынку і абнаўленне турыстычных стаянак. Працягваецца праца на аб'ектах для масавага адпачынку насельніцтва ў рэкрэацыйнай зоне Струста і Снуды. Для гасцей Браслаўшчыны прадстаўлены новы турыстычны прадукт – назіральная вежа на гары Маяк. Тут арганізавана работа новага інфармацыйнага пункта, уключаючы продаж білетаў і сувенірнай прадукцыі. Устаноўлены новыя драўляныя арэлі, арганізаваны выязны гандаль, згодна распрацаванага маршруту па турыстычным аб'ектам. Да турыстычнага сезона абсталяваны экалагічная сцежка «Слободковская озовая гряда», турыстычны маршрут «Турбазовский рог» з малымі архітэктурнымі формамі, інтэрактыўнымі элементамі і фотазонамі. Пашырыўся і пералік пракатнага інвентару: было набыта 20 горных ровараў, 6 лодак, 8 электраскутараў і элептычны трэнажор для трэнажорнай залы базы адпачынку "Дрывяты".

Для турыстаў Нацыянальнага парку "Браслаўскія азёры" прапануюцца 15 тураў на рускай і англійскай мовах з рознай тэматыкай, якія ўключаюць поўны комплекс паслуг (харчаванне, пражыванне, экскурсійныя і дадатковыя паслугі) з працягласцю знаходжання ад 2 да 10 дзён з анансаваннем на афіцыйным сайце Нацыянальнага парку, а таксама ў сацыяльных сетках. 26 экскурсійна-турыстычных маршрутаў, 14 веласіпедных, водных маршрутаў. Да летняга сезона распрацавана 5 новых культурна-забаўных тураў. Для арганізацыі экскурсій прадастаўлены 2 аўтобусы, 2 прагулачных караблі па акваторыі азёр Дрывяты і Струста.

Зроблены рамонт альтанак і ценявых падстрэшкаў, лодачных прычалаў, месцаў рыбнай лоўлі. Выканана ландшафтна-рэкрэацыйнае ўладкаванне турыстычных стаянак і месцаў адпачынку на суму 289,75 рублёў. Для параўнання: за студзень-ліпень 2021 г. выручка ад аказання турыстычных паслуг склала 3 798,52 рублёў; за студзень – ліпень 2020 г. – 2 990,17 рублёў; за студзень – ліпень 2019 г. – 1 575,57 рублёў [1].

Турысцка-аздараўленчым прадпрыемствам "Браслаўскія азёры" вядуцца работы па будаўніцтве 2-х павярховага катэджа з пакоем адпачынку і лазнева-аздараўленчым комплексам, завершана будаўніцтва 2-х драўляных хатак, праведзена закупка атракцыёну «водны банан», 3-х і 4-х мясцовых катамаранаў, усталяваны пірс і пешаходная дарожка да яго.

Да турыстычнага сезона ўладкоўваецца кемперная стаянка, паблізу возера Дрывяты.

Турыстычнымі арганізацыямі вядзецца работа па паляпшэнню якасці абслугоўвання турыстаў і пашырэнню паслуг. Для падтрымання цікавасці турыстаў клубам "Дрывяціч" распрацаваны 3 новыя веламаршруты: вакол возера Бярэжжа, возера Дрывяты і па лесапарку Дубкі, водны маршрут на яхтах класа AVA, сплавы на лодках-дракарах, прагулкі на яхце "Mariner", выязныя экскурсіі. Для турыстаў былі набыты 5 ровараў, турыстычнае абсталяванне і 2 электрасамакаты. Для прыклада: за студзень – ліпень 2021 г. выручка па пракаце спартыўнага абсталявання склала 26 936,80 рублёў; за студзень-ліпень 2020 г. – 6 309,50 рублёў; за студзень – ліпень 2019 г. – 2 065,50 рублёў; за студзень – ліпень 2018 г. – 867 рублей [1].

Для інфармацыйнай падтрымкі турыстаў і гасцей Браслаўшчыны распрацаваны сайт Браслаўскага раёна www.braslavtravel.bv і запушчана адзіная інфалінія.

Сумеснымі намаганнямі Браслаўскага раённага выканаўчага камітэта, Нацыянальнага парку і клуба "Дрывяціч" была ўладкаваная аматарская велатраса даўжынёй 3 км у лесапаркавай зоне Дубкі. Устаноўлены паказальнікі, якія вызначаюць напрамкі руху па трасе для 3-х узроўняў складанасці, інфармацыйныя стэнды, фотазоны, лаўкі. У далейшым плануецца на гэтым месцы будаўніцтва лыжаролернай трасы са стрэльбішчам для правядзення рэспубліканскіх спаборніцтваў па біятлоне.

Установай культуры "Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў" праводзяцца кірмашы рамёстваў, майстар-класы па традыцыйных рамёствах для гасцей і турыстаў горада, экскурсійныя туры, выставы вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, экскурсіі па выставачных залах, квэст-гульні. З чэрвеня арганізаваны турыстычны маршрут для самастойнага падарожжа "Кругасветка ўражанняў", сумесна з аграсядзібай "Вусце-Лайф", сямейнай фермай "Кароль-памідор", стайняй "Гарбунок", асабістай падсобнай гаспадаркай "Хутар Крапачы", кафэ "Струстянскі прытулак", сядзібай "У ганчара". Так за чэрвень – ліпень 2021 г. турыстычны маршрут наведала больш за 500 чалавек, выручка

склала больш за 2 тыс. рублёў. За студзень – ліпень 2021 г. было праведзена 238 выязных экскурсій, за студзень – ліпень 2020 г. праведзена 163 экскурсіі [1].

Пераўтварэнні турыстычнай інфраструктуры закранулі і Браслаўскі раён. З'явіліся новыя архітэктурныя формы у а. г. Друя і г. п. Відзы. З'явілася новая аглядная пляцоўка з арэлямі на Замкавай гары. Варта адзначыць, што на працягу ўсяго турыстычнага сезону 2021 г. на цэнтральным пляжы воз. Дрывяты працавалі летняе кафэ "Ветразь" і кафэ "Пляж", ажыццяўляўся продаж сувенірнай прадукцыі, пракат электраскутараў.

З мэтай прасоўвання турыстычных паслуг арганізацыямі актыўна праводзіцца рэкламная дзейнасць турыстычнага патэнцыялу рэгіёна. Выдадзены буклеты, брашуры, флаеры, лістоўкі, календары, візітоўкі з падрабязнай кантактнай інфармацыяй. Нацыянальным паркам "Браслаўскія азёры" распрацаваны і размешчаны 172 інфармацыйныя таблічкі, 32 рэкламна-інфармацыйныя шчыты, 4 банеры.

У мэтах папулярызацыі турыстычнага патэнцыялу Браслаўскага раёна і павелічэння большага патоку турыстаў праводзіліся здымкі такімі тэлеканаламі як АНТ, БТ-1, БТ-4, Беларусь 1. Таксама неаднаразова публікавалася інфармацыя ў раённай і рэспубліканскіх газетах і часопісах.

Адной з многіх знакавых падзей для рэгіёна стала прэзентацыя ў 2021 г. "Фотаальбом Браслаўскі край". Гэта выданне адлюстроўвае гісторыю, вытворчую дзейнасць, культурныя і спартыўныя падзеі, турызм, адпачынак і прыроду Браслаўскага Паазер'я.

Прыцягненню дадатковага турыстычнага патоку ў рэгіён спрыяла і правядзенне разнастайных відовішчных мерапрыемстваў: Міжнародны фестываль традыцыйнай культуры "Браслаўскія зарніцы", міжнародны музычна-спартыўны фестываль "Viva Braslav", свята сярэднявечнай культуры "Меч Брачыслава", святы народнага каляндара "Масленіца" і "Купалле", канцэрты выхаднога дня ў лесапарку "Леснічоўка", забаўляльныя праграмы ў зоне адпачынку "Бруканка". Таксама праходзяць і спартыўна-масавыя мерапрыемствы, такія як "Чэмпіянат і Першынство Рэспублікі Беларусь па зімовым трыятлоне", спаборніцтвы па спартыўным рыбалоўстве, бегавеламарафон, алімпійскае крос-кантры, этап Кубка Беларусі па вейкбордзе, спаборніцтвы па веславанні на лодках "Цмок".

Усе арганізацыі турыстычнай індустрыі актыўна прымаюць ўдзел у выставах-кірмашах, якія праходзяць у Рэспубліцы Беларусь, з прэзентацыяй турыстычных паслуг рэгіёну. Для прыцягнення большай

плыні турыстаў больш за 60 прадстаўнікоў турыстычнай сферы з усіх рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь сабраліся 14-15 траўня 2021 г. у Браславе для ўдзелу ў турыстычнай выставе «OPEN AIR “Браслаў – Цэнтр устойлівага развіцця”.

Для развіцця турыстычнай галіны ў Браслаўскім раёне распрацаваны інвестыцыйныя прапановы па стварэнні турыстычнай інфраструктуры.

Зараз ў Браслаўскім раёне рэалізоўваюцца 6 міжнародных праектаў па турызме. У рамках праекта “Поддержка предпринимательства в сфере туризма на местном уровне в Республике Беларусь” працягнулася ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы парусная школы. Набыта абсталяванне і інвентар для ўдзелу ў турыстычных выставах, зняты прэзентацыйны відэаролік аб турыстычным патэнцыяле Браслаўскага краю. У рамках праекта “Сетеобразование в туристическом секторе Браслава как инструмент устойчивого развития территории” для далейшай рэалізацыі распрацаваны “План развіцця ўстойлівага турызму ў Браслаўскім раёне да 2035 г.”.

Акрамя вышэйпералічанага плануецца добраўпарадкаванне парка XVIII ст. “Бяльмонты” ў а. г. Ахрэмаўцы; стварэнне кластарнай ініцыятывы і адзінай турыстычнай паслугі, у якую ўваходзяць паслугі пражывання, харчавання, пракату, экскурсій; стварэнне школы інфармацыйных тэхналогій з мэтай навучання гаспадароў аграсядзібаў навыкам прымянення сучасных інфармацыйных тэхналогій; стварэнне сэрвісу онлайн заказаў і дастаўкі прадуктаў з дапамогай электрамабіля.

З улікам попыту турыстаў на паслугі суб’ектамі турыстычнай індустрыі і далейшага развіцця Браслаўскага раёна – як бяспечнай і квітнеючай тэрыторыі, распрацавана стратэгія развіцця рэгіёну да 2025 г., якая прадугледжвае доўгатэрміновыя шляхі і напрамкі развіцця турызму на тэрыторыі раёна, арыентаванага на захаванне прыроднай спадчыны, развіццё культурна-пазнавальнага, падзейнага, экалагічнага, сельскага, гастранамічнага відаў турызму.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры

1 Справочно-аналитическая информация Браславского райисполкома по вопросу «О выполнении «Плана развития рынка туристических услуг в 2021 г. и формирование стратегии развития рынка услуг до 2025 г.»

УДК 94:656.628(476-15)"1921-1939"

**А. К. Гецевич, Е. Н. Обухова**
(Гродно, УО «Гродненский государственный университет
имени Я. Купалы»)

# РОЛЬ АВГУСТОВСКОГО И ОГИНСКОГО КАНАЛОВ В РАЗВИТИИ ВОДНОГО СООБЩЕНИЯ В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ (1921–1939)

Водный транспорт имел важнейшее значение для торговли и грузоперевозок в Беларуси вплоть до середины XIX в., когда появление железнодорожного сообщения отодвинуло его на второй план. С течением времени природные и рукотворные водные объекты страны стали всё более активно выполнять рекреационную и туристско-познавательную функции, однако становление данных направлений использования водоёмов было не одномоментным. В современных условиях, когда активно развивается экотуризм в Беларуси, изучение истории использования каналов Западной Беларуси приобретает особую актуальность. Целью данной статьи является выявление роли и места Августовского и Огинского каналов в водном сообщении в Западной Беларуси в 1921–1939 гг.

К исследованию развития водного туризма в Западной Беларуси в межвоенный период отечественные исследователи обратились в 2010-х гг. [1; 2; 3; 4; 5]. Непосредственный взгляд на водные дороги Западной Беларуси оставили современники. А. Шмук издал свои дорожные заметки о путешествии на паруснике по Западной Беларуси в 1937 г. под названием «Z Pinska do Augustowa kajakiem» [6].

Последовавший за Первой мировой войной польско-литовский конфликт и установившаяся новая граница, которая прошла в 1920-х гг. около Друскенинкая, остановили традиционное судоходство по Нёману [8, s. 429; 4, с. 221]. Канал Огинского очень сильно потерпел в годы Первой мировой войны, однако в 1920-х гг. его обстоятельно восстановили, и в 1928 г. навигация по каналу полностью была восстановлена [3, с. 140; 4, с. 227].

По состоянию на 1939 г. судоходными в течении Нёмана были 842 км, Припяти – 1351 км [8, s. 433]. Следует отметить, что 70 % грузов и пассажиров перевозились в межвоенной Польше водным транспортом по Висле, а участие Нёмана и других водных путей в восточных воеводствах не доходило до 1 % от общего объёма перевозок водным

транспортом [8, s. 438]. Реки и каналы Западной Беларуси активно использовались в межвоенный период для транзита леса. Так, по Нёману в 1934–1936 гг. ежегодно сплавляли около 200 тыс. куб. м. леса, по Вилии – меньше 100, по Припяти с притоками – от 150 в 1934 г. до 88 в 1936 г. Лес по Припяти и её притоках сплавлялась в Королевский (Днепро-Бугский) канал, затем в Мухавец и затем в Буг, также для лесосплава использовали и канал Огинского [3, с. 138, 140]. Следует отметить, что Нёман выступал важной транспортной артерией для сплавки леса наряду с Вислой [8, s. 439]. Лесосплав по Августовскому каналу продолжался до 1952 г. [4, с. 231].

Что касается перевозок пассажирским транспортом, то их значение было невелико. По Нёману и Августовскому каналу в 1921–1930 гг. Ежегодно перевозили 15000 человек, в 1932 – 8000, в 1936 – 14300. Значительно выше были данные цифры на Пинском водном узле: в 1921–1930 гг. там перевозили 33000 человек ежегодно, в 1932 – 21000, в 1936 – 106300.

В середине тридцатых годов XX в. регулярное пассажирское сообщение в Западной Беларуси было налажено на реках Нёман (Гродно – Пышки, Гродно – Лунно), Вилия (Вильно-Верки), остальные маршруты размещались в Полесском воеводстве. По каналу Огинского проходил пассажирский маршрут Пинск-Телеханы, который помимо канала включал реки Ясельда и Пина [7, s. XLII]. Путь на пароходе из Пинска в Телеханы занимал 9–10 часов [10, с. 55]. По другим данным, Гродно имело речное сообщение с Лунно и Мостами, а из Друскеник организовывались водные экскурсии по Нёману и Августовскому каналу [9, с. 17]. В начале 1930-х гг. на гродненской пристани появились корабли с дизельными двигателями, на них жители города ездили на экскурсии в район парка Румлёва или Меловых гор [4, с. 234].

Одним из самых массовых видов туризма в Западной Беларуси был водный, в особенности сплавы на байдарках. Его развитие началось еще в середине 1920-х гг., но настоящий бум пришелся на вторую половину 1930-х гг. [10, с. 54]. По подсчётам В. А. Ганского, по состоянию на 1935 г. на территории Виленского, Новогрудского, Белостокского и Полесского воеводств насчитывалось 104 водных туристических маршрута, из них 69 были разработаны для маломерных судов [9, с. 14].

Туристический маршрут, обеспеченный превосходными условиями для плавания на лодках и байдарках, пролегал вдоль Августовского канала. Первыми из байдарочников в середине 1920-х гг. там появились скауты. По маршруту Гродно – Августов регулярно курсировали два пассажирских парохода [10, с. 54]. В 1930-х гг. Августовский канал стал «меккой» для туристов-байдарочников. За 35 грошей с человека можно

было пройти шлюзование и, отдохнув в многочисленных лагерях или местах отдыха, неспешно доплыть до Нёмана или Вислы [4, с. 231]. На шлюзе Домбровка ежегодно с большим размахом проходил «Праздник моря». Туристическая функция Августовского канала была настолько важна, что по этой причине в 1938 г. было принято решение построить еще один канал, который соединил бы пруд Свободы с озером Сайно [10, с. 54].

В межвоенное время пользовался большой популярностью сплав по р. Ясельде и Огинскому каналу, вдоль которых было организовано множество турбаз. Некоторые любители гребли доплывали до Варшавы за несколько месяцев с Львовского воеводства по следующему пути: правые притоки Припяти – Припять – Ясельда – канал Огинского – Щара – Нёман – Августовский канал – Бобр и Буг до Вислы [4, с. 227].

Посмотреть на такой летний сплав глазами туриста в 1936 г. можно, прочитав книгу А. Шмыка «Из Пинска до Августова на байдарке» [6]. Водный поход путешественников начался из Пинска на байдарке «Вилк». Плывя по Пине и Ясельде, они почти не встречали людей, редко одиноких рыбаков, в целом описывали Полесье как заболоченную местность, где мало участков, пригодных для земледелия, а люди бедные и неграмотные [6, s. 20]. Путешественников допекали комары, оводы и мухи. После мелей, ветров, поворотов и заболоченных участков Ясельды путешественники с радостью продолжили свой путь по каналу Огинского, ровному и спокойному. Вдоль канала были посажены деревья, сделаны земляные валы, в некоторых местах ещё встречались бетонные доты времён Первой мировой войны, пугавшие путешественников чёрными зияющими оконцами для пулемётов [6, s. 34]. Незабываемым для А. Шмыка стало прохождение шлюзования, когда они с друзьями испугались, что в глубокой нижней камере их затопит прибывающая вода [6, s. 32]. До Выгонощанского озера шлюзование парни проходили 10 раз вверх [6, s. 33]. В Телеханах путешественники сделали остановку и купили еды, так как дальше их ждал отрезок пути без населённых пунктов. После Телехан канал досматривали не так хорошо, его гладь заросла зелеными водорослями, которые затрудняли греблю [6, s. 37]. Переплыв Выгонощанское озеро, путешественники вновь попали в канал Огинского, и через два километра – в Щару [6, s. 40]. Байдарка А. Шмыка всюду вызывала живой интерес детей, которые сбегались к пристани посмотреть на путешественников. Плыть по каналу Огинского байдарочникам было сложно, так как стоячая вода канала требовала беспрерывной гребли. Августовский канал больше понравился путешественникам внешне, так как проходил через красивые сосновые леса. От Немнова до Августова

они прошли через шлюзы 13 раз [6, s. 66]. Путешественников очаровали озёра, через которые проходил путь в Августов.

Таким образом, в межвоенный период Августовский канал и канал Огинского совмещали несколько функций: перевозка грузов, перевозка пассажиров и туристическое использование. Первая функция сводилась в основном к сплаву леса, перевозка пассажиров осуществлялась пароходами (на паровой тяге и с двигателями внутреннего сгорания) и имела локальное значение. На первый план, особенно во второй половине 1930-х гг., выходит туристистско-рекреационное использование каналов, в частности, активно развивался справ на байдарках, особенно на более выгодном в плане природных красот и более ухоженном Августовском канале. Сплавы из Пинска по каналу Огинского были более экстремальными ввиду сложных условий сплава по рекам, меньшей ухоженности самого канала.

## Список использованных источников и литературы


1 Цихорацки, П. Развитие туризма на территории Полесского воеводства в 30-х годах XX века / П. Цихорацки, А. Л. Ильин // Вестник Полесского государственного университета. Серия общественных и гуманитарных наук. – 2018. – № 1. – С. 47–54.

2 Гецэвіч, А. К. Транспарт і шляхі зносін у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. К. Гецэвіч // Веснік ГрДУ імя Янкі Купалы. Сер. 1, Гісторыя і археалогія. – 2015. – № 3(203). – С. 6–12.

3 Гецэвіч, А. Транспартна-лагістычны і турыстычна-рэкрэацыйны патэнцыял воднага басейна Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд / А. Гецэвіч, В. Тарасаў // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności : Матэрыялы XXIV Міжнар. навук. канф., Гродна, 26 кастр. 2018 г. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал. : Я. Панькоў [і інш.]. — Гродна : Гродзенск. друкарня, 2019. – С. 138–143.

4 Вашкевіч, А. На гродзенскім бруку / А. Вашкевіч, В. Саяпін. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2016. – 274 с.: іл.

5 Ганский, В. А. Туризм в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / В. А. Ганский. – Даугавпилс, 2017. – С. 125–130.

6 Schmuck, A. Z Pinska do Augustowa kajakiem / A. Schmuck – Lwow, 1937. – 87 s.

7 Przewodnik po Polsce : w 4 t. – Warszawa : Związek Polskich Towarzystw Turystycznych, 1935. – T. 1. – 362 s.

8 20-lecie komunikacji w Odrodzonej Polsce (1918–1939) ; red. S. Faecher, dr. S. Peters. – Krakow, 1939. – 543 s.

9 Ганскі, У. А. Турыстычныя маршруты ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гады) / У. А. Ганскі, І. І. Калачова // Вестник БарГУ. Серия : Исторические науки и археология. Экономические науки. Юридические науки. – 2017. – Выпуск 5. – С. 13–18.
10Ганский, В. А. Основные направления развития туризма в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / В. А. Ганский // Науковий вісник МНУ імені В. О. Сухомлинського. Історичні науки. – 2017. – № 2 (44). – С. 53–59.

**УДК 94:271.2-523.4(476.2-21Гомель)"198"**

**И. А. Грищенко**
(Гомель, УО «Гомельский государственный технический университет имени П. О. Сухого»)

## К ИСТОРИИ ВОЗВРАЩЕНИЯ ПЕТРОПАВЛОВСКОГО СОБОРА ГОМЕЛЯ ВЕРУЮЩИМ В КОНЦЕ 1980-Х ГОДОВ

Избрание в марте 1985 г. на должность Генерального секретаря ЦК КПСС М. С. Горбачева не сразу принесло изменения в церковно-государственные отношения. Принятая XXVII съездом «Программа КПСС» (1986 г.) сохраняла установку на искоренение религиозности из сознания советских людей. По-прежнему обязанностью члена партии была борьба с религиозными предрассудками и другими чуждыми социалистическому образу жизни взглядами и нравами. Решение ЮНЕСКО о широком праздновании тысячелетия Крещения Руси несколько осложнило работу партийным идеологам, поскольку они считали, что церковники используют юбилейные торжества для популяризации религии.

Качественный сдвиг во взаимоотношениях государства и церкви произошел после встречи 29 апреля 1988 г. М. С. Горбачева с Патриархом Московским и всея Руси Пименом. Патриарх и члены Синода ходатайствовали об установлении равных гражданских прав, без дискриминации верующих. Выступая на XIX Всесоюзной партийной конференции (июнь – июль 1988 г.) Генеральный секретарь ЦК КПСС заявил, что отношение КПСС к религиозному мировоззрению как ненаучному, нематериалистическому не дает оснований «для неуважительного отношения к духовному миру верующих людей и тем более применения какого бы то ни было административного давления для установления материалистических воззрений» [1, с. 317].

Происходившие перемены в социально-политической и духовной жизни страны находили живой отклик, как у православного духовенства, так и у мирян. Ветеран войны и труда, прихожанин Николаевской церкви г. Гомеля В. Е. Дроздов рассказывал: «Увидев по телевидению встречу М. С. Горбачева с патриархом Пименом и Священным Синодом, я не поверил глазам своим. Теперь я уверен, что перестройка в государственной, экономической и духовной жизни – это не очередная пропагандистская кампания, а реальность» [2, л. 57].

В этих условиях верующие стали более требовательны и настойчивы в том, что касалось их законных религиозных интересов. Их просьбы о строительстве, приобретении, ремонте культовых зданий, снабжении электричеством, водой, топливом властями теперь признавались вполне справедливыми, во всяком случае, как отмечал уполномоченный по Гомельской области Г. С. Затора, «просто так отпихнуться от этих требований или не замечать их, как многие должностные лица поступали в прошлом, сегодня уже невозможно» [3, л. 53].

Рубеж 1980–1990-х гг. стал временем массового открытия новых приходов. Это привело к воссозданию Гомельской епархии Белорусской Православной Церкви Московского Патриархата, что было утверждено Священным Синодом 19 февраля 1990 г. Устав епархии был зарегистрирован 18 октября 1991 г. [4, л. 1, 7]. К моменту приезда первого правящего архиерея епископа Гомельского и Мозырского Аристарха (Станкевича) (1938–2012), верующим Гомеля уже был передан Петропавловский собор. Это был результат упорной борьбы православного сообщества.

После закрытия собора в 1960 г. здание переоборудовали под планетарий, который просуществовал с 1962 г. по 1985 г. Затем собор стоял заброшенным. Когда верующие начали обращаться с просьбами о передачи им храма, городское руководство высказалось категорически против, отстаивая проект концертного зала с установкой в соборе органа.

Инициативную группу верующих, добивавшихся передачи Петропавловского собора, возглавила Мария Васильевна Богуш, впоследствии ставшая насельницей Тихвинского монастыря г. Гомеля. Она обратилась за поддержкой к митрополиту Минскому и Белорусскому Филарету (Вахромееву) во время его визита в Гомель 22 мая 1987 г. по случаю престольного праздника в Николаевской церкви. Владыка благословил на создание «двадцатки» и в ноябре 1988 г. в Гомеле был зарегистрирован второй православный приход. Прихожане Николаевской церкви неоднократно высказывались о необходимости открыть вторую церковь из-за переполненности храма. Новообразованное второе православное общество еще до своей

официальной регистрации начало активно собирать подписи за возвращение Петропавловского собора [5, л. 2–3].

Верующие свои ходатайства сначала направили руководству Гомеля: председателю Гомельского горисполкома А. Т. Козловскому, председателю областного Совета народных депутатов А. А. Гроховскому и первому секретарю Гомельского обкома КПБ А. С. Камаю. За шесть месяцев 1987–1988 гг. было направлено 16 заявлений в разные инстанции. На имя председателя Совета по делам религий при Совете Министров БССР под обращением стояло 4068 подписей. Широкую поддержку движению за возвращение собора оказала местная интеллигенция. Первоначальная реакция властей была предсказуемо негативной. Уполномоченный Г. С. Затора отмечал: «...учитывая, что в настоящее время в газетах и журналах публикуется немало статей, воспринимаемых верующими как новый курс в отношении религии и церкви, нам необходимо более активно вести наступательную атеистическую пропаганду, ускорить переоборудование пустующих культовых зданий под культурно-просветительские учреждения» [6, л. 22, 28]. Спустя год, когда сессия Гомельского горсовета в сентябре 1989 г. передала здание Петропавловского собора второму православному объединению для реставрации и дальнейшего использования в культовых целях, тот же уполномоченный оценивал передачу храма верующим как «трезвый и разумный подход к решению сложившейся конфликтной ситуации», который «укрепил авторитет партийно-советского актива города в глазах верующих» [5, л. 2–3].

Решающую роль в возвращении собора верующим сыграл широкий общественный резонанс. Инициативная группа обратилась за поддержкой в Фонд культуры, который тогда возглавлял академик Д. С. Лихачев, писали лично Р. М. Горбачевой. К решению вопроса были привлечены деятели культуры, науки, депутаты Верховного Совета СССР. Среди тех, кто поддержал верующих Гомеля были писатели В. Быков, И. Шамякин, С. Михалков, скульптор З. Азгур, художники М. Савицкий и И. Глазунов, режиссер С. Бондарчук, артисты И. Козловский, Л. Зыкина, Л. Касаткина, летчики-космонавты В. Севастьянов и П. Климук [7, л. 23–25]. Сочувственно высказался в отношении просьб верующих Председатель Совета по делам религий СССР К. М. Харчев. Большое значение имело участие в судьбе собора митрополита Филарета, грамотно проводившего переговоры с Гомельским облисполкомом, хотя его встреча с председателем облисполкома, состоявшаяся 20 февраля 1989 г. в присутствии Гомельского благочинного Ф. Д. Харика, была освещена в «Гомельской

правде» крайне скупо, а о проблеме собора и вовсе не было упоминания [5, л. 40; 2, л. 51, 54–55].

Гомельский горсовет в сентябре 1989 г. принял положительное для верующих Гомеля решение. Первым настоятелем восстановленного Петропавловского собора определением митрополита Филарета от 1 января 1990 г. был назначен протоиерей Федор Харик (1937–2008), до этого возглавлявший приход Николаевского храма г. Гомеля, а настоятелем Николаевской церкви стал протоиерей Стефан Гладыщук (1932–2020) [8, л. 178, 292].

После возвращения собора верующим предстояла сложная работа по его восстановлению. О состоянии храма вспоминал протоиерей Федор Харик: «Подрагивающими от волнения руками распахнул заваленную хламом дверь и едва не свалился в обморок от запаха затхлости. Шагнул вперед и споткнулся о ворох пустых пивных бутылок, дальше – битый кирпич, обвалившаяся штукатурка и разлагающиеся кошачьи трупы, полов нет, окна выбиты» [9, с. 137].

Первая Божественная литургия в Петропавловском соборе состоялась на Рождество 7 января 1990 г. Кафедральный собор г. Гомеля продолжает оставаться центром духовной жизни, а драматичные периоды в его истории являются источником веры и надежды для верующих.

## Список использованных источников и литературы


1 Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.]; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : ВП «Экаперспектыва», 1998. – 340 с.

2 Государственный архив Гомельской области (ГАГО). – Фонд 1354. – Оп. 5. – Д. 154. Информационные отчеты о деятельности религиозных объединений и состоянии контроля за соблюдением законодательства о религиозных культах в Гомельской области за 1987–1988 гг.

3 ГАГО.– Фонд 1354. – Оп. 5. – Д. 153. Материалы проверок работы по контролю за соблюдением законодательства о религиозных культах в Гомельской области БССР. 1986–1990 гг.

4 ГАГО. – Фонд 1354. – Оп. 5. – Д. 195. Документы Гомельской епархии РПЦ (переписка, устав, справки). 1990–1995 гг.

5 ГАГО. – Фонд 1354. – Оп. 5. – Д. 174. Информационные отчеты о деятельности религиозных объединений и состоянии контроля за соблюдением законодательства о религиозных культах в Гомельской области за 1989–1990 гг.

6 ГАГО. – Фонд 1354. – Оп. 5. – Д. 162. Информации, сведения о деятельности религиозных объединений в Гомельской области в 1988 г.

7 ГАГО. – Фонд 1354. – Оп. 5. – Д. 163. Документы о передаче здания Петропавловского собора в г. Гомеле РПЦ. 1988–1989.

8 ГАГО. – Фонд 1354. – Оп. 5. – Д. 5. Документы о регистрации религиозных обществ РПЦ в г. Гомеле Гомельской области БССР. 1945–1991.

9 Ерошенко, А. И. Исправи сердце свое: к двадцатилетию Гомельской епархии / А. И. Ерошенко. – Минск : Беларусь, 2010. – 342 с.

**УДК 94:929.55:393(=161.3)"19/20"**

**С. У. Грунтоў**
(Мінск, ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»)

## ЭПІТАФІЯ ЯК КРЫНІЦА ДА ВЫВУЧЭННЯ КУЛЬТУРЫ ПАМЯЦІ БЕЛАРУСАЎ У XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

Надмагільныя помнікі з’яўляюцца важнейшым аб’ектам для вывучэння культуры памяці беларусаў. Па сваёй колькасці, разнастайнасці і рэпрэзентатыўнасці яны не маюць аналагаў у гэтым сярод іншых аб'ектаў матэрыяльнай культуры. Важнейшым складнікам надмагільнага помніка з’яўляецца эпітафія, яго самая змястоўная частка, якая захоўвае інфармацыю пра памерлую асобу, а нярэдка і пра яе жывых сваякоў. Цягам XX – пачатку XXI ст. яна зазнае змены, кожная з якіх была следам перамен у стратэгіях захавання памяці аб памерлым, спробай удасканаліць выкананне гэтай задачы. У гэтым артыкуле будуць разгледжаны толькі эпітафіі прыватных помнікаў, пастаўленых сям’ёю па памерылым сваяку, у той час як тэксты грамадзянскіх эпітафій на вайсковых мемарыялах, помнікаў пастаўленых ад імя трудавых калектываў складаюць асобны тэматычны блок і, адпаведна, патрабуюць асобнага разгляду. Вывучэнне эпітафій у названай перспектыве магло б стаць тэмай асобнага вялікага даследавання. Цяперашняе даследаванне ставіць сваёй задачай толькі акрэсліць эпістэмалагічны патэнцыял эпітафій для вывучэння культуры памяці беларусаў, намеціць асноўныя акцэнты для іх інтэпрэтацыі і вывучэння ў названым накірунку.

Сёння нам складана сабе ўявіць надмагілле без імені памерлага і датаў нараджэння і смерці. Разам з тым, яшчэ сто год таму на вясковых

могілках адсутнасць імені памерлага на помніку была цалкам нармальнай з’явай, што вызначалася нізкім узроўнем пісьменнасці сярод сялян. Культура памяці ў традыцыйнай вясковай супольнасці ў асноўным мела вусны характар, абмяжоўвалась тым, што сёння называецца камунікатыўнай памяццю [1, с. 58–59]. Сям’я памятала магілы сваіх блізкіх і без інскрыпцый на іх, памяць гэта захоўвалсь некалькімі пакаленнямі, пасля чаго знікала – разам з драўлянымі помнікамі, якія паступова парахнелі. Вясковыя могілкі ў традыцыйнай культуры беларусаў былі не толькі ландшафтам памяці, але і забыцця, як мы добра ведаем з апісанняў і выяваў XIX – першай паловы XX ст [4, с. 29–30; 5, с. 67].

Пашырэнне пісьменнасці знаходзіла адбітак у росце папулярнасці надмагільных эпітафій сярод сялян – імкненне іх выкарыстання задавалася прэстыжным стандартам пахаванняў заможнейшых слаёў насельніцтва, якія часта суіснавалі побач на адных і тых жа могілках. Вывучэнне эпітафій дапамагае прасачыць і транзітныя формы пераходу ад вуснай да пісьмовай формы памяці. На шэрагу каменных надмагілляў канца XIX – пачатку XX ст. мы можам убачыць варыянты з пазначэннем імені, але не прозвішча памерлага. Такі варыянт пісьмовай памяці ўсё яшчэ ў істотнай меры абапіраўся на вусную памяць сям’і, якая адна і магла ведаць, што за асоба хаваецца за пазначаным іменем. Варта адзначыць, што ён быў сцісла павязаны не толькі з транзітнай формай памяці, але і з традыцыйным хрысціянскім спосабам памінання, калі ў малітве за памерлых узгадваюцца толькі іх імёны.

Эпітафіі прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў у большасці выпадкаў былі блізкімі да цяперашняга стандарту, хоць заўважна часцей узгадвалі пасады і званні, якія меў памерлы пры жыцці [6, с. 16–22]. Паралельна з гэтым асноўным масівам эпітафій існавалі і тыя, якія захоўвалі памяць не пра аднаго чалавека, а пра многіх прадстаўнікоў роду, у тым ліку тых, чые магілы не захаваліся. Такія помнікі атрымалі асаблівую папулярнасць пачынаючы з першай паловы XX ст. Акрамя таго, многія капліцы і склепы былі ў першую чаргу месцам памяці сям’і, роду, пра што сведчылі адпаведныя надпісы на фасадных частках, у той час як імёны паасобных пахаваных маглі быць схаваны ад вачэй, напрыклад, у выглядзе надпісаў на невялікіх шыльдах у склепе, якія замыкалі нішы з трунамі. У такім выпадку акцэнт падаў менавіта на захаванне памяці пра род, і ў такой перспектыве гэта мадэль, як не парадаксальна, не вельмі далёкая ад апісанай вышэй сялянскай. На вясковых могілках сям’я звычайна мела свой участак, і хоць старыя крыжы падалі і не панаўляліся, на іх месцы з часам з’яўляліся новыя

пахаванні і новыя крыжы. Такім чынам, памяць пра асобных прадстаўнікоў роду магла знікаць, што адпавядала і традыцыйным мемарыльным практыкам – пасля “гадавін” яны пераходзілі ў катэгорыю “дзядоў”, якія паміналіся менавіта як родавая супольнасць памерлых, а не паасобку [3, с. 64]. І ў выпадку сямейнага ўчастка сялянскіх пахаванняў, і ў выпадку з родавым склепам мы маем справу найперш з памяццю рода, у той час як паасобныя пахаванні маглі забывацца за гарызонтам камунікатыўнай памяці, які сёння прыянта адмяраць 80–100 гадамі і які, як можна меркаваць, у пачатку ХХ ст. быў карацейшым.

Многія эпітафіі прама ці ўскосна захоўваюць памяць не толькі пра асобу памерлага, але і пра яго сваякоў, узгадкі пра якіх уключаюцца ў эпітафію. У шляхецкіх эпітафіях пачатку ХХ ст. фундатар помніка мог прысутнічаць не толькі праз намінацыю сваяцтва (жонка, сын, брат etc.), але і ў варыянце поўнага імені і прозвішча, якія нярэдка адмыслова вылучаліся шрыфтам і візуальна прысутнічалі ў эпітафіі нароўні з іменем памерлага. Такім чынам, фундатар захоўваў памяць не толькі пра памерлага, але і пра самога сябе.

Сёння гэта традыцыя практычна цалкам знікла – у адрозненні ад практыкі пазначэння ў эпітафіі жывых сваякоў у надзвычай пашыранай формуле “ад жонкі, дзяцей, унукаў” з разнастайнымі варыяцыямі. Гэта традыцыя фарміруецца як дамінуючая мадэль у 30-50-я гг. ХХ ст. – у залежнасці ад рэгіёну і гарадскога ці вясковага тыпу супольнасці. Сама па сабе яна таксама сведчыць пра важныя змены, якія адбываліся ў культуры памяці беларусаў. Упершыню носбіты камунікатыўнай памяці так экспліцытна пазначаюцца ў эпітафіі. Раней гэта месца займалі фундатары – напрыклад, ці сын, ці жонка, але не ставілася мэта пералічыць блізкіх у некалькіх пакаленнях, якія выконваюць “доўг памяці” ў дачыненні памерлага.

Вытлумачэнняў у акрэсленых зменаў у кантэксце культуры памяці можа быць некалькі. Па-першае, цягам ХХ ст. у гарадах могілкі перастаюць быць месцам памяці роду з-за дысперснага прынцыпу правядзення пахаванняў, вызначанага часткова высокай мабільнасцю насельніцтва, часткова прынцыпам прадастаўлення новых участкаў для пахавання паводле заканадаўства. Распад вялікай сям’і знаходзіць сваё непасрэднае ўвасабленне ў мемарыяльным ландшафце, які імкліва атамізуецца. Род ці нават проста сям’я ў некалькіх пакаленнях болей не знаходзіць у ім свайго цэласнага ўвасаблення. Пералік жывых сваякоў у такой перспектыве можна разглядаць як кампенсаторны: ён сімвалічна збірае сям’ю там, дзе болей для яе не знаходзіцца месца.

Другім вытлумачэннем можа быць сувязь культуры памяці і секулярызацыі. Эпітафіі ў пачатку ХХ ст. амаль абавязкова ўтрымлівалі формулы звароту да Бога ці Дзевы Марыі. Канцэпцыя бяссмерця ў гэты час была павязана з верай у бяссмерце душы, а памяць пра яе ў першую чаргу павінна была ўвасабляцца ў малітве за памерлага. Прамаўляць яе мог і чужы чалавек, што добра бачна ў стандартных формулах эпітафій, якія звярталіся да мінака ці "таго, хто чытае гэтыя радкі". У ХХ ст., асабліва ў савецкі перыяд, малітва імкліва перастае быць месцам памяці пра памерлага. Яе замяняе сям'я, супольнасць жывых сваякоў, якая ў ідэале павінна працягвацца бясконца і ад пакалення да пакалення захоўваць памяць пра памерлага сваяка. Таму ў эпітафіях такой папулярнай становіцца ўзгадка ўнукаў, трэццяга палення носбітаў памяці. Можна сказаць, што іх з'яўленне ў эпітафіях – гэта менавіта вынаходкай ХХ ст., паколькі існуе толькі некалькі прыкладаў іх узгадкі ў эпітафіях ХІХ ст.

Разглядаючы эпітафіі ў кантэксце развіцця куультуры памяці беларусаў у ХХ ст. нельга абмінуць і такі цікавы феномен, як кенатафы. Як тып помніка яны былі вядомыя і ў ХІХ ст., але надзвычайную папулярнасць атрымалі менавіта ў ХХ ст., асабліва пасля Другой сусветнай вайны [2, с. 11]. Немагчымасць знайсці места пахавання блізкага ці незадаволенасць афіцыйнымі формамі мемарыялізацыі, такімі як пахаванні ў брацкіх магілах пад агульным помнікам, падштурхоўвалі сваякоў да сімвалічнага вяртання памерлага ў кола сям'і, уз'яднання з ім пасля смерці. У іншых выпадках кенатаф фарміраваў самастойны помнік, часам побач з аналагічнымі, каля якога блізкія маглі ўшанаваць загінулага з дапамогай традыцыйных памінальных практык. Кенатафы звычайна пазнаюцца па адпаведных формулах у эпітафіях, напрыклад, па наяўнасці ўказання месца смерці і пахавання. Гэтыя альтэрнатыўныя формы мемарыялізацыі ахвяр войнаў ХХ ст. аказваюцца асабліва цікавымі ў кантэксце развіцця культуры памяці беларусаў раскрываючы тыя яе аспекты, якія звычайна знаходзяцца ў ценю афіцыйных мемарыяльных практык.

9 Докладная записка НКЗ БССР и ЦК КП(б)Б о состоянии и динамики развития основных показателей сельского хозяйства БССР за последние 4 года и мероприятия по поднятию урожайности сельского хозяйства. – Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства в Белорусской ССР; редколл. : А.И. Азаров [и др.]. – Минск : Беларусь, 1973.– С. 355–363.

10 Процько, Т. С. Из истории репрессий против белорусского крестьянства 1929–1934 года / Т. С. Протько А. П. Врублевский ; под ред. М. П. Костюка. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 124 с.

11 Из отчета Белколхозцентра по выполнению постановлений президиума ЦК ВКП(б)Б о ликвидации ошибок при проведении коллективизации. – Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства в Белорусской ССР; редколл. : А. И. Азаров [и др.]. – Минск : Беларусь, 1973.– С. 96–105.

12 Справаздача Гомельскай акруговай кантрольнай камісіі КП(б)Б 4 акруговай партканферэнцыі снежань – май 1930 г. Гомель, КП(б)Б, 1930. – 60 с.

13 Костюк, М. П. Победа колхозного строя в Белорусской ССР / М. П. Костюк. – Минск : Наука и техника, 1981. – 448 с.

14 Государственный архив Гомельской области (ГАГО). – Ф. 802. Оп. 1. Д. 5.

**УДК 338.483.11:351.853.2(476.2)"20"**

**Н. В. Корникова**
(Гомель, УО «Гомельский государственный университет
имени Ф. Скорины»)

## ПОСЕЩЕНИЕ ПАМЯТНИКОВ ПРИРОДНОГО НАСЛЕДИЯ БЕЛАРУСИ ПРЕДСТАВИТЕЛЯМИ ИНТЕЛЛИГЕНЦИИ ГОМЕЛЬЩИНЫ В XXI ВЕКЕ

На территории Республики Беларусь расположены многочисленные памятники природы, среди которых можно выделить целый ряд уникальных объектов, представленных особо охраняемыми природными территориями нашей страны. Они обладают не только важнейшей экологической значимостью, но также имеют огромный рекреационный потенциал. Памятники природного наследия в XXI столетии выступают в качестве популярных достопримечательностей,

привлекающих большое внимание как туристические объекты. Значительный интерес к посещению подобных достопримечательных мест, обеспечивающих не только возможность реализации досуга, но также способствующих экологическому и культурному просвещению, проявляют представители интеллигенции. В структуре населения Гомельского региона эта социопрофессиональная группа составляет значительную часть. В данном контексте изучение аспектов, связанных с посещением и восприятием памятников природного наследия Беларуси интеллигенцией Гомельщины на современном этапе представляет исследовательский интерес.

Цель исследования – характеристика посещения памятников природного наследия Беларуси представителями интеллигенции Гомельщины в XXI в.

Некоторые аспекты, связанные с поездками интеллигенции Гомельщины по достопримечательным местам, их знакомством с объектами историко-культурного наследия и отдельными памятниками природы Беларуси в советский период и на современном этапе, получили освещение в ряде работ автора [1–2]. Вместе с тем, проблематика, сопряженная с посещением памятников природного наследия как самодостаточное направление досуговой и туристической активности представителей интеллигенции Гомельщины, пока не нашла полного раскрытия.

Оригинальными источниками для написания работы послужили материалы полевого исследования, проведенного автором. В его рамках были опрошены 112 человек, представляющих различные половозрастные и профессиональные группы интеллигенции Гомельщины.

Согласно законодательству Республики Беларусь к памятникам природы причисляются особо охраняемые природные территории, объявленные в целях сохранения ценных природных комплексов или отдельных объектов. Статус особо охраняемой природной территория имеют территориальные ареалы с ценными природными комплексами и объектами, в отношении которых установлен особый режим охраны и использования [3]. Среди подобных объектов на территории Республики Беларусь необходимо отметить Национальные парки «Припятский», «Беловежская Пуща», «Браславские озера», «Нарочанский», Березинский биосферный заповедник, а также 282 заказника. Численность памятников природы составляет 903 объекта, среди которых 326 имеют республиканское значение [4, с. 16, 70].

Знакомство с памятниками природного наследия Беларуси, как показали материалы исследования, осуществляется, как правило, в рамках туристических культурно-познавательных или досугово-оздоровительных поездок в организованных группах либо спланированных самостоятельно, которые мотивируются прежде всего рекреационными целями. Зачастую подобное времяпрепровождение тесно сопряжено с посещением национальных парков, заповедников, заказников, а также с пребыванием в курортных зонах, организованных в рамках природоохранных территорий.

Среди посещенных с культурно-познавательными и рекреационными целями объектов природного наследия Беларуси опрошенными представителями интеллигенции Гомельщины были названы природные памятники Национальных парков «Беловежская Пуща», «Браславские озера», «Нарочанский», «Припятский», Березинского биосферного заповедника, заказников «Ольманские болота», «Налибокская Пуща», «Ельня», «Выдрица», Центральный ботанический сад Национальной академии наук Республики Беларусь и Музей валунов в Минске, «Родники Святые криницы» в Минской области, парки Замкового комплекса «Мир», «Гомельского дворцово-паркового ансамбля», усадьбы Гатовского и Козел-Поклевских в Красном береге, парк «Поречье» в г. Пинске, парк «Несвиж» и лесопарк «Альба» в Несвиже, Борисов-камень в Полоцке и пр.

Опрошенные отмечали, что посещение природоохранных территорий и памятников природы с их точки зрения имеет очень высокий рекреационный потенциал, т.к. предполагает возможность пребывания на туристических базах, в туристско-оздоровительных комплексах, кемпингах, агроусадьбах, расположенных на территориях национальных парков и заказников либо поблизости от посещаемых природных объектов, а также дает возможность приобщения к активному отдыху (длительные пешие прогулки и походы, занятия рыбной ловлей, игры на свежем воздухе и пр.). Около четверти респондентов отметили, что имеют опыт подобного туристического времяпрепровождения.

Некоторые опрошенные упомянули, что сочетали осмотр памятников природы во время посещения национальных парков с активным времяпрепровождением спортивного характера (к примеру, совершали поездки на велосипедах по туристическим маршрутам Национальных парков «Беловежская Пуща» и «Браславские озера»).

Более чем в половине случаев опрошенные отмечали, что совмещали знакомство с объектами природного наследия с осмотром

историко-культурных достопримечательностей, расположенных поблизости от посещаемых памятников природы. Среди подобных культурно-исторических объектов и достопримечательных мест были названы Музеи природы, расположенные в Национальных парках «Припятский», «Беловежская Пуща», а также Березинском биосферном заповеднике; Каменецкая башня, «Поместье белорусского Деда Мороза»; Костел рождества Девы Марии и Церковь Успения Пресвятой Богородицы в Браславе; Церковь Святого Ильи и Костел Святого Апостола Андрея в деревне Нарочь; исторический комплекс «Древний Туров», Храм Всех Святых, памятник Кириллу Туровскому, краеведческий музей и «растущие кресты» в Турове; Замковый комплекс «Мир»; Костел Божьего Тела и Несвижский дворцовый ансамбль; Дворец Румянцевых и Паскевичей и Часовня-усыпальница князей Паскевичей в Гомеле; мемориальный комплекс «Красный берег», усадьба Гатовского и Козел-Поклевских; Собор Вознесения Пресвятой Девы Марии и иезуитский коллегиум в Пинске, достопримечательности исторического центра Минска и пр.

Например, инженер РУП «Гомельэнерго» из г. Гомеля, 1957 г. р. рассказала: «Посещение Национального парка Припятский и знакомство с его растительным и животным миром – это один из моих интереснейших туристических опытов путешествий по Беларуси. Прогулка по экологической тропе и двухчасовое сафари по парку, стали для меня настоящим открытием. Оказалось, посмотреть на «краснокнижные» виды растений и увидеть живых кабанов, оленей, лосей, косуль необычайно познавательно! Знакомство с уникальными природными красотами мне удалось совместить с четырьмя довольно интересными экскурсиями по Туровщине, во время которых я увидела «растущие кресты», раскопки на замковой горе в Турове, Церковь Всех Святых и Музей природы, а также с поездкой в деревни Лясковичи и Дорошевичи и речной прогулкой на теплоходе».

Респонденты отмечали, что посещение памятников природного наследия имеет большой просветительский потенциал, а также способствует распространению знаний о природных богатствах Республики Беларусь, многие из которых являются узнаваемыми достопримечательностями и символами всей Беларуси или отдельных регионов страны. К примеру, экономист ПУ «Нефтебурсервис» из г. Речица 1977 г. р. отметила: «Считаю, что Беловежская Пуща – поистине уникальное место, где можно не только полюбоваться редчайшими природными красотами, но также узнать множество интересных фактов про эти заповедные места нашей

страны. Меня очень впечатлили исполинские деревья, которые я увидела во время экскурсии по экотропам – дуб Отшельник, 300-летняя сосна Царица, вековые липы и ели. Но больше всего мне запомнился необъятный 600-летний дуб Патриарх высотой в 30 метров, мощь и величие которого просто невозможно описать словами!».

Таким образом, результаты проведенного исследования свидетельствуют, что посещение природоохранных территорий и памятников природы выступает в качестве самодостаточного направления интереса в рамках культурно-познавательного досуга респондентов, а также имеет выраженную рекреационную составляющую. Их знакомство с отечественным природным наследием связано в первую очередь с посещением крупных природоохранных территорий Беларуси, а также природных ареалов, являющихся известными достопримечательными местами Беларуси.

**Список использованных источников и литературы**


1 Корникова, Н. В. Культурно-познавательный туристический досуг интеллигенции Гомельщины в 1960 – 1980-е годы / Н.В. Корникова / Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 26 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2019. – С. 256–261.

2 Корникова, Н. В. Летний досуг интеллигенции Гомельщины в начале 21 века годы / Н. В. Корникова / Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XX стагоддзяў : этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы: матэрыялы Рэсп. канф., рэдкал. : А. Р. Яшчанка [і інш.]. – Гомель, 3 кастр. 2019 г. / Гомельскі дзярж. ун-т ім. Ф. Скарыны; – Гомель, 2019. – С. 137– 141.

3 Государственная инспекция охраны животного и растительного мира при Президенте Республики Беларусь. [Электронный ресурс] / Закон Республики Беларусь «Об особо охраняемых природных территориях». – URL: https://gosinspekciya.gov.by/actual/rybolovstvo-i-rybolovnoe-khozyaystvo/354. – Дата обращения : 24.09.2021.

4 Туризм и туристические ресурсы в Республике Беларусь. Статист. сб. / Нац. статист. комитет РБ ; редкол. : И. В. Медведева [и др.] – Минск, 2019. – 76 с.

УДК 94:327.5((47+57):30)"1941-1945":94:356.15(476.2)"1942-1943"

**А. А. Крыварот**
(Мінск, ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі»)

# УДАРЫ ПАРТЫЗАН БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ ПА НЯМЕЦКА-ПАЛІЦЭЙСКІХ ГАРНІЗОНАХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ (ЛІСТАПАД 1942–1943 ГАДОЎ)

Падчас нарады ў Маскве ў канцы жніўня – пачатку верасня 1942 г. з удзелам вялікай групы камандзіраў партызанскіх атрадаў і брыгад, камісараў і работнікаў партыйнага падполля, савецкім кіраўніцтвам было прынята рашэнне аб выхадзе ўкраінскіх партызанскіх фарміраванняў С. А. Каўпака і А. М. Сабурава рэйдамі на тэрыторыю Правабярэжнай Украіны. У новым раёне злучэнні павінны былі разгарнуць дыверсіі на камунікацыях праціўніка, пашыраць партызанскі рух і падпольную барацьбу. Перад выхадам у рэйды ўкраінскія партызаны ў месцах сваёй дыслакацыі на тэрыторыі Браншчыны атрымалі самалётамі з савецкага тылу аўтаматычную зброю, вялікі запас узрыўчаткі, гарматы, мінамёты, медыкаменты, радыёстанцыі, абмундзіраванне [1, с. 130; 2, с. 128–129].

З самага пачатку знаходжання ўкраінскіх злучэнняў на поўдні Беларусі стала разгортвацца баявое ўзаемадзеянне з мясцовымі партызанамі. Дзякуючы гэтаму рэйдавыя фарміраванні змаглі замацавацца ў новым баявым раёне і паспяхова выконваць пастаўленыя перад імі задачы. Першая сумесная аперацыя адбылася ў ноч на 7 лістапада 1942 г., калі была захоплена пераправа ў раёне Лоева, вызвалены пасёлак і разгромлены гарнізон, які налічваў 200 салдат і афіцэраў. Партызаны вызвалілі з мясцовай турмы 25 смертнікаў, раздалі насельніцтву з захопленых складоў хлеб, соль і іншыя прадукты, а таксама жывёлу, знішчылі тыпаграфію, лесазавод, электрастанцыю, млын, вузел сувязі. Унушальнымі былі захопленыя трафеі: 15 кулямётаў, 57 вінтовак і аўтаматаў, 13 пісталетаў, 21 500 патронаў [1, с. 144–148; 2, с. 140; 3, с. 305–306; 4, с. 198].

Дзясяткі жыхароў Лоева папоўнілі падраздзяленні рэйдавых злучэнняў і надалей у іх складзе ўдзельнічалі ў баявых аперацыях супраць тылавых аб’ектаў акупантаў. Злучэнні С. А. Каўпака, А. М. Сабурава пасля выхаду з Лоева і пры перамяшчэнні ў паўднёва-заходнім напрамку разграмілі некалькі невялікіх апорных пунктаў

гітлераўцаў. У далейшым аперацыі супраць акупацыйных гарнізонаў сталі асноўным відам баявой дзейнасці ўкраінскіх рэйдавых злучэнняў на тэрыторыі Беларускага Палесся. Практычна ва ўсіх нападах на тылавыя аб'екты ворага ўдзельнічалі атрады беларускіх партызан, а ў некаторых аперацыях і падпольныя структуры [2, с. 141; 5, с. 632; 6, с. 135–136; 7, с. 54].

Пасля фарсіравання Дняпра ў штабе С. А. Каўпака ў вёсцы Міхалёўка Лоеўскага раёна 10 лістапада 1942 г. адбылася сустрэча з удзелам сакратароў Гомельскага падпольнага гаркама КП(б)Б Е. І. Барыкіна і С. Ф. Антонава, сакратара Гомельскага падпольнага абкама ЛКСМБ А. Д. Рудака, камандзіра атрада «Бальшавік» І. С. Федасеенкі. Беларускія партызаны азнаёміліся з апошняй інфармацыяй аб сітуацыі на савецка-германскім фронце, атрымалі магчымасць устанавіць сувязь з ЦК КП(б)Б і БШПР. Мясцовым атрадам у якасці дапамогі была перададзена зброя і боепрыпасы, радыёстанцыя [2, с. 141; 5, с. 632; 6, с. 135–136].

Па выніках наступнай нарады ў штабе С. А. Каўпака ў пасёлку Лясное 13 лістапада 1943 г., на якую прыбылі камандзіры беларускіх атрадаў А. М. Бяленчык, М. Ф. Турчынскі, В. П. Палавінка, І. С. Федасеенка, была абмеркавана падрыхтоўка сумеснага ўдара па чыгуначнай станцыі Дземяхі Рэчыцкага раёна на лініі Гомель – Калінкавічы. Аперацыя з удзелам роты Рэчыцкага атрада (камандзір М. Ф. Турчынскі) і аднаго з батальёнаў злучэння С. А. Каўпака адбылася ў ноч на 16 лістапада 1942 г. Партызаны захапілі чыгуначную станцыю Дземяхі, узарвалі завод, вывелі з эксплуатацыі сувязь і станцыйнае абсталяванне [7, с. 53; 6, с. 237].

Падчас прывалу злучэння А. М. Сабурава ў вёсцы Амелькаўшчына Хойніцкага раёна адбылася сустрэча камандавання ўкраінскіх і гомельскіх атрадаў з мэтай абмену разведінфармацыяй і абмеркавання планаў сумесных баявых аперацый. Для падвышэння баяздольнасці беларускіх падраздзяленняў ім была аказана дапамога аўтаматамі, мінамётамі і патронамі. На сустрэчы было прынята рашэнне аб нападзе на буйны акупацыйны гарнізон у райцэнтры Хойнікі, які налічваў да 350 акупантаў. У баявым нападзе разам з дзвюма ротамі злучэння А. М. Сабурава прымалі ўдзел атрады Лоеўскі «За Радзіму» (камандзір Р. І. Сінякоў) і Гомельскі «Бальшавік» (камандзір І. С. Федасеенка). Аперацыя пачалася ў ноч з 14 на 15 лістапада 1942 г. і працягвалася амаль 14 гадзін. Партызаны ўзарвалі вадакачку, два чыгуначныя масты, знішчылі ўсе стрэлачныя пераводы, ачысцілі і падпалілі пакгаўзы. Падчас нападу было ліквідавана 218 акупантаў і 20 узята ў палон.

Адначасова 15 лістапада 1942 г. партызаны занялі Юравічы, а затым і станцыю Аўраменская, дзе спалілі ўсю чыгуначную гаспадарку і склады [1, с. 147; 5, с. 632; 6, с. 135–136].

Сумесны разгром гарнізонаў у Хойніках і на станцыі Дземяхі садзейнічаў уздыму баявога духу беларускіх партызан, якія на той час яшчэ не мелі дастатковых сіл для правядзення такіх аперацый. Акрамя таго ў апорных пунктах акупанты мелі склады з харчамі і іх захоп дазволіў істотна папоўніць свае запасы прадуктамі мясцовым падраздзяленням і ўкраінскім злучэнням, якія рыхтаваліся да выхаду на камунікацыі праціўніка ў Кіеўскай, Жытомірскай і Ровенскай абласцях.

Узаемадзеянне беларускіх і ўкраінскіх рэйдавых злучэнняў мела свае асаблівасці. Так, атрады Лоеўскі «За Радзіму», Гомельскі «Бальшавік, Рэчыцкі імя К.Я. Варашылава прымалі ўдзел толькі ў адзінкавых аперацыях супраць акупацыйных гарнізонаў, але надалей яны пераходзілі ў свае раёны адказнасці і дзейнічалі самастойна. Некаторыя беларускія падраздзяленні разам з украінскімі партызанскімі злучэннямі рэйдзіравалі працяглы час. Напрыклад, Ельскі атрад (камандзір А. С. Мішчанка) з 23 лістапада 1942 г. і да лютага 1943 г. дзейнічаў разам са злучэннем С. А. Каўпака. Ужо першая аперацыя ўкраінскіх партызан і Ельскага атрада прыпала на разгром буйнога гарнізона ў райцэнтры Лельчыцы. Тут размяшчаліся гебіткамісарыят і да двух батальёнаў асабовага складу. Падчас бою з 25 на 26 лістапада 1942 г. партызаны вызвалілі з турмы больш за 100 савецкіх грамадзян, знішчылі сотні акупантаў, дзве бронемашыны, электрастанцыю, тры нямецкія прадпрыемствы, два масты праз раку Убарць. У выніку разгрому гарнізона ў Лельчыцах быў створаны зручны плацдарм, з якога ў пачатку снежня 1942 г. злучэнне С. А. Каўпака зрабіла налёт на чыгуначны вузел Сарны [9, л. 6; 10, л. 10аб–11; 11, л. 50аб].

У складзе злучэння А. М. Сабурава працяглы час дзейнічалі атрады Лельчыцкі (камандзір І. А. Колас) і група партызан Хойніцкага раёна (камандзір Н. А. Бельскі). У другой палове лістапада 1942 г. яны разам фарсіравалі Прыпяць і авалодалі райцэнтрам Нароўля, дзе знішчылі 38 салдат і афіцэраў, усе ваенна-гаспадарчыя аб’екты, і вышлі на поўнач Жытомірскай вобласці ў раён вёскі Селязоўка Славечненскага раёна. Падчас рэйдзіравання на поўначы Украіны партызаны за кароткі тэрмін правялі паспяховыя аперацыі на немецкіх камунікацыях, занялі пяць населеных пунктаў, у тым ліку раённы цэнтр Славечна Жытомірскай вобласці, гарнізон якога налічваў 200 акупантаў [1, с. 223–228].

У выніку першага пранікнення на тэрыторыю Правабярэжнай Украіны злучэнням С. А. Каўпака і А. М. Сабурава, нягледзячы на

шэраг паспяхова праведзеных аперацый, не ўдалося вялікімі сіламі замацавацца ў новым рэгіёне з прычыны разгортвання акупантамі карнай экспедыцыі. Падраздзяленні С. А. Каўпака і Ельскі атрад пасля выхаду з тэрыторыі Украіны прарваліся праз акупацыйныя гарнізоны Букча і Тонеж, фарсіравалі Прыпяць і ў пачатку студзеня 1943 г. размясціліся каля возера Чырвонае ў Жыткавіцкім раёне. На працягу амаль месяца злучэнне рыхтавалася да новага рэйду. З удзелам беларускіх партызан і мясцовага насельніцтва на лёдзе возера быў абсталяваны аэрадром для прыёму грузаў з Вялікай зямлі [7, с. 57; 9, л. 5аб; 10, л. 10аб–11, 21, 35; 12, с. 352].

Злучэнне А. М. Сабурава пад націскам карнікаў да сярэдзіны студзеня 1943 г. прайшло па балотах каля 40 кіламетраў і выйшла да Марлінскіх хутароў Давыд-Гарадоцкага раёна. У новым раёне ўкраінскія і мясцовыя партызаны ў ноч на 18 студзеня 1943 г. напалі на гарнізон у Століне, дзе была рэзідэнцыя гебіткамісарыята. У выніку бою народныя мсціўцы забілі, паранілі і ўзялі ў палон звыш 100 акупантаў, падпалілі спіртзавод, узарвалі склад з боепрыпасамі, знішчылі 20 аўтамашын, захапілі шмат трафеяў. У гэтым налёце таксама прымалі ўдзел столінскія падпольшчыкі. Пасля баявых дзеянняў у Столінскім раёне атрады злучэння А. М. Сабурава асноўным напрамкам баявой дзейнасці выбралі гарнізоны ў Ровенскай вобласці. Злучэнне С.А. Каўпака ў пачатку лютага 1943 г. скрытна пакінула месца дыслакацыі каля возера Чырвонае і выйшла ў рэйд на тэрыторыю Ровенскай, Жытомірскай і Кіеўскай абласцей Украіны [1, с. 229–236, 238–239; 5, с. 633; 7, с. 55; 12, 354].

Новы этап барацьбы беларускіх і ўкраінскіх партызан супраць акупацыйных гарнізонаў на поўдні Беларусі разгарнуўся ў пачатку вясны 1943 г., што было звязана з наступнымі падзеямі. Па-першае, у паўднёвыя раёны Беларусі вярнуліся з рэйдаў злучэнні С. А. Каўпака і А. М. Сабурава. Па-другое, на вялікай тэрыторыі Палесся сумеснымі намаганнямі беларускіх і ўкраінскіх партызан быў утвораны партызанскі край у чатырохвугольніку Алеўск – Оўруч – Мазыр – Тураў. Па-трэцяе, беларуская частка краю стала базай для больш чым 10 украінскіх рэйдавых фарміраванняў, якія ў красавіку 1943 г. сталі прыбываць для выканання заданняў Цэнтра на тэрыторыі Правабярэжнай Украіны і разам з мясцовымі атрадамі разгарнулі ўдары па гарнізонах. Па-чацвёртае, у Лельчыцкім раёне каля Дубніцкіх хутароў з сакавіка 1943 г. стаў функцыянаваць партызанскі аэрадром, пабудаваны беларускімі і ўкраінскімі партызанамі з шырокім удзелам мясцовых жыхароў. Перакінутыя на аэрадром з савецкага тылу зброя, боепрыпасы, узрыўчатка садзейнічалі падвышэнню баяздольнасці атрадаў і дазвалялі

рыхтаваць і праводіць буйныя баявыя аперацыі [10, л. 28; 13, л. 103; 14, л. 72].

У красавіку – маі 1943 г. былі праведены сумесныя напады больш як на 10 гарнізонаў праціўніка ў Палескай вобласці. Самай маштабнай сумеснай аперацыяй вясны 1943 г. быў напад на гарнізон у Брагіне, які налічваў да 500 акупантаў. Ініцыятарамі аперацыі выступіла камандаванне беларускага атрада імя Р. І. Катоўскага (камандзір А. Е. Міхневіч). У райцэнтры знаходзіліся ўстановы гебіткамісарыята, розныя службы паліцыі бяспекі і СД, а таксама шэраг акупацыйных арганізацый, пераведзеных з Гомеля. У ноч на 11 красавка 1943 г. партызаны агульнай колькасцю да 600 чалавек са злучэнняў С. А. Каўпака, Я. І. Мельніка, А. Ф. Фёдарава, атрада імя Р. І. Катоўскага нанеслі ўдар па гарнізону пры падтрымцы некалькіх мінамётаў розных калібраў, а таксама шасці гармат для знішчэння дзотаў. Аб маштабнасці аперацыі сведчыць той факт, што гітлераўскае камандаванне для ратавання гарнізона спрабавала нанесці па партызанах авіяцыйны ўдар, які не прывёў да поспеху. Гітлераўцы страцілі толькі забітымі некалькі сотняў салдат і афіцэраў. Былі разбіты 25 дзотаў і 3 доты з кулямётамі. Партызаны захапілі шмат зброі і боепрыпасаў, а таксама вялікія запасы прадуктаў. Аб'ектамі сумесных удараў беларускіх і ўкраінскіх партызан вясной 1943 г. станавіліся таксама гарнізоны ў Юравічах, Пірках, Скрыгалаве і інш. [4, с. 318; 7, с. 65–67; 11, л. 52–52аб, 59, 88; 12, с. 356; 13, л. 32–34; 15, л. 90; 16, л. 29].

Канцэнтрацыя значных партызанскіх сіл у Цэнтральным Палессі, іх баявая актыўнасць на камунікацыях і супраць гарнізонаў гітлераўцаў сур’ёзным чынам падрывалі пастаўкі рэсурсаў на фронт для нямецкіх часцей і істотна звужалі ўплыў захопніцкага рэжыму на акупаванай тэрыторыі. У сярэдзіне чэрвеня 1943 г. гітлераўскае камандаванне сабрала ў Мазыры, Оўручы, Ельску, Петрыкаве, Алеўску і іншых населеных пунктах буйныя сілы карнікаў, каб акружыць партызанскі край, знішчыць партызан і разбурыць аэрадром. Пад націскам больш як 30-тысячнай групіроўкі акупантаў украінскія злучэнні А. М. Сабурава і С. Ф. Малікава, а таксама мясцовыя атрады, якія заставаліся на беларускай частцы краю, былі вымушаны адысці з цяжкімі баямі ў напрамку пінскіх балот і іншых цяжкадаступных для ворага месцаў [1, с. 290; 7, с. 66–67; 12, с. 357; 17, л. 8].

У новым раёне дыслакацыі ў Пінскай вобласці злучэнне А. М. Сабурава ўстанавіла цесныя кантакты з беларускімі партызанамі і правяло разам з імі некалькі паспяховых аперацый. У ліпені 1943 г. па прапанове камандзіра атрада «Савецкая Беларусь» П. П. Тамілава быў разгромлены гарнізон у Давыд-Гарадку. У нападзе на акупацыйны аб’ект

таксама ўдзельнічаў украінскі батальён на чале з Л. Я. Івановым і група мазырскіх партызан. Ліквідацыя гарнізона адкрывала атрадам доступ да чыгункі Сарны – Лунінец – Калінкавічы [1, с. 290; 7, с. 66–67; 12, с. 357].

У жніўні 1943 г. злучэнне А. М. Сабурава вярнулася ў Лельчыцкі раён, адкуль яго батальёны адправіліся ў баявыя рэйды на суседнія тэрыторыі, дзе ўзаемадзейнічалі з мясцовымі атрадамі. Сумесна з Мазырскім атрадам, які выдзеліў для аперацыі 220 байцоў, 27 жніўня 1943 г. быў разгромлены гарнізон у Шчакатова. У выніку бою партызаны забілі да 100 салдат і афіцэраў, захапілі зброю і боепрыпасы, 120 коней, шмат прадуктаў. Праз некалькі дзён беларускі атрад імя С. М. Кірава і ўкраінскія падраздзяленні М. А. Рудзіча, Я. І. Міркоўскага, Г. Ф. Пакроўскага разбілі гітлераўцаў у райцэнтры Нароўля. Аперацыяй па разгроме буйнога гарнізона, які кантраляваў тэрыторыю паміж Прыпяццю і чыгункай Мазар – Оўруч, кіраваў камандзір беларускага атрада В. П. Яромаў. Захопленыя трафеі – харчы і ваенная маёмасць былі вывезены на 70 падводах [1, с. 290; 7, с. 66–67; 12, с. 357; 14, л. 12, 24–25; 17, л. 17–20].

На тэрыторыі беларускай часткі партызанскага краю пэўны час базіраваліся атрады Ровенскага злучэння (камандзір В. А. Бегма). 23 кастрычніка 1943 г. беларускія атрады Лельчыцкай і 50-й Жыткавіцкай брыгад, Тураўскі «За Радзіму» пры дапамозе ўкраінскага артылерыйскага падраздзялення, які меў на ўзбраенні гарматы, разграмілі гарнізон у Тураве [7, с. 66–67; 12, с. с. 357].

Восенню 1943 г. войскі 1-га Украінскага фронту ў выніку паспяховых баёў падышлі з паўночных раёнаў Житомірскай вобласці да партызанскага краю. У сувязі з гэтым беларускія і ўкраінскія партызаны сталі праводзіць баявыя дзеянні з мэтай аказання ўсебаковай дапамогі савецкім войскам. У некаторых выпадках аперацыі праводзіліся сумесна з франтавымі часцямі. Напрыклад, 27–28 лістапада 1943 г. 37-я Ельская брыгада разам з партызанамі злучэння А. М. Сабурава і пры ўдзеле 12-га гв. стралковага палка 4-й гв. стралковай дывізіі ў жорсткім баі выбілі гітлераўцаў з райцэнтра Ельск і разграмілі гарнізон, які налічваў да 500 салдат і афіцэраў. Нападаўшыя забілі каля 225 акупантаў, спалілі некалькі танкаў і бронемашын, шмат грузавікоў, аднак горад утрымаць не змаглі [3, с. 206; 12, с. 358]. Гэтым боем завяршылася ўзаемадзеянне беларускіх партызан і ўкраінскіх рэйдавых злучэнняў на тэрыторыі Гомельшчыны, якое працягвалася больш за год.

Сумесныя ўдары беларускіх і ўкраінскіх партызан па тылавых аб’ектах ворага зрывалі планы гітлераўскага камандавання па назапашванні матэрыяльных запасаў на тэрыторыі Беларускага Палесся

і па своечасовым падвозе рэсурсаў для франтавых часцей. Разгром акупацыйных гарнізонаў спрыяў колькаснаму росту партызанскіх сіл, актывізацыі супраціўлення акупантам, дапамагаў ратаваць захопленых нацыстамі савецкіх патрыётаў, даваў магчымасць партызанам забяспечыць сябе зброяй, боепрыпасамі і харчамі, а таксама вяртаць насельніцтву частку нарабаванай немцамі маёмасці.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1 Богатырь, З. А. Борьба в тылу врага / З. А. Богатырь. – М. : Мысль, 1969. – 470 с.

2 Гладков, Т. К. Л.Е. Ковпак / Т. К. Гладков, Л. Е. Кизя. – Изд. 2-е, испр. – М. : Мол. гвардия, 1973. – 288 с.

3 Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя. – Мінск : БелСЭ, 1990. – 680 с.

4 Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941–1944 гг.) : сборник воспоминаний / редкол. : чл.-кор. АН БССР И. С. Кравченко [и др.]. – Минск : Госиздат БССР, 1961. – 506 с.

5 Литвин, А.М. Взаимодействие партизан Беларуси с Красной армией, российскими и украинскими партизанами / А. М. Литвин, А. А. Криворот // Страна в огне: В 3 т. Т. 2. Коренной перелом. 1942–1943 : В 2 кн. Кн. 1. Очерки. – М. : «Абрис», 2017. – С. 583–642.

6 Партизанская криничка. Документальная повесть. Изд. 2-е, доп. и перераб. – Минск : Беларусь, 1972. – 272 с.

7 Филимонов, А. А. В едином боевом строю: о совместных действиях русских, белорусских, украинских, литовских, латышских, молдавских партизан / А. А. Филимонов, А. Д. Титов, Н. И. Эполетов. – Минск : Нац. акад. наук, 2005. – 126 с.

8 Памяць : Гісторыка-дакументальная хроніка Рэчыцкага р-на ў 2 кн. Кн. 1. – Мінск : Беларусь, 1988. – 502 с.

9 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 269.

10 НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 278

11 НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 283.

12 Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1983–1985. – Т. 3. – 1985. – 531 с.

13 НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 271.

14 НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 288.

15 НАРБ. – Ф. 1408. Воп. 1. Спр. 90.

16 НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 270.
17 НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 289.

**УДК 398.332.3(476.2)**

**Т. І. Кухаронак**
(г. Мінск, ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»)

## УЗВІЖАННЕ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ: ЗВЫЧАЁВАСЦЬ І ФАЛЬКЛОРНА-НАРАТЫЎНАЯ ТРАДЫЦЫЯ (ПАВОДЛЕ СУЧАСНЫХ ЭКСПЕДЫЦЫЙНЫХ ЗАПІСАЎ)

Рэгіянальныя даследаванні традыцыйнай культуры з'яўляюцца прыярытэтным накірункам сучасных этналагічнай і фалькларыстычнай навук Беларусі. Спецыфіка каляндарна-святочных традыцый кожнага рэгіёна Беларусі мае непаўторную своеасаблівасць, якая праяўляецца ў разнастайнасці форм бытавання рытуальна-абрадавай практыкі, шляхоў і спосабаў яе ажыццяўлення, багацці варыянтаў.

Двунадзесятае свята Уздзвіжання Пачэснага і Жыватворнага Крыжа Гасподняга адзначаецца ў адпаведнасці з праваслаўным календаром 27 верасня, з каталіцкім – Узвышэнне Святога Крыжа – 14 верасня. Гэта хрысціянскае свята звязана са знаходжаннем Крыжа, на якім распялі Ісуса Хрыста. Узвіжанне, паводле мясцовай тэрміналогіі, *"Дзьвіжаньне", "Здзьвігі", "Здзьвіжаньне", "Зьвіжаньне", "Здзьвюджаньне", "Уздзьвіжа(-о)ньне"*, на Гомельшчыне мела агульнабеларускі характар і разам з тым утрымлівала шэраг адметных рысаў. Свята знаходзілася найбліжэй да трэцяй кропкі сонцастаянняў – восеньскага раўнадзення і таму ў народнай традыцыі поўнілася зместам, адпаведным часу сонцавароту. Паводле вераванняў мясцовых жыхароў, у гэты святочны дзень, у пераломнай фазе свайго шляху па небасхіле "йграе" сонца, *"здзвігаецца"*, г. зн. мяняецца ў колерах (становіцца сінім, чырвоным, зялёным) або тры разы здрыгваецца, як бы падскоквае: *"Зьдзьвіжаньне – сонца дзьвігаецца:і захаваецца, і прама разныя цьвяты. Эта раніцай, зарана" (Антаніна Бяляўская, 1925 г.н., в. Сцяпы, Жлобінскі раён)* [*тут і далей палявыя запісы належаць аўтару і Т. В. Валодзінай – аўт.*]. *"Сонца гуляя на Уздьвіжаньне, празьнік етакі, двацацць сёмага сенцябра, тады сонейка гуляя. Мы, дзеці, уставалі раненька, і яно праўда вот так зьдзьвігаецца" (Анастасія Раманавец, 1932 г.н., в. Новы Пуць,*

*Брагінскі раён). “Калі-сьці пакойны дзядзька Ладымер прыходзіць к нам, да: “Алена, ты бачыла, як сонца ўздзвігая, усходзіць на Уздьзвіжанне? Хадзіця, сёння будзя пагода, пабачыця”. Вот інцярэсна, вот красіва. Толька адзін раз і бачыла, як сонца дзвігаецца, а цяпер ня бачу” (Валянціна Лазовік, 1941 г.н., в. Рыжкаў, Брагінскі раён).*

Ушанаванне гэтага святочнага дня, як і іншых, выяўлялася ў першую чаргу ў строгай забароне працаваць, бо ўжо с поля павінна быць, у адпаведнасці з мясцовымі звычаямі, да гэтага часу ўсё прыбрана *“здзвінута”: “На эта Зьдзьвіжаньне няльзя землю капаць, няльзя варушыць, бо зьдзьвігаецца зямля” (Валянціна Шаўцова, 1936 г.н., Антаніна Бяляўская, 1925 г.н., в. Сцяпы. Жлобінскі раён). “Да Дзьвіжаньня нада, штоб усё с поля зьдзьвінулася, нада ўсё прыбраць” (Ефрасіння Баранава, 1928 г.н., в. Акцябр, Жлобінскі раён). “І стараюцца, каб на гародзе ўсе зьдзьвінуць. Душнікі закрывалі, каб гады туда ня лезьлі” (Наталля Сапажэнка, 1941 г.н., в. Акцяброва, Кармянскі раён). “Зьдзьвігі – свята, нічога ня дзелалі. Нязьзя ў лес хадзіць, нязьзя капцы зарываць. А то і мышы, усякая ерунда будзе заводзіцца” (Соф’я Паграбенка, 1937 г.н., в. Каменка, Кармянскі раён)* [1, с. 376]. У некаторых вёсках, паводле мясцовых звычаяў, забаранялася займацца пчалярствам: *“Кажуць, на Узьвіжанне і пасля Узвіжання нельга мёд сабіраць, бо можа все загнісціся, увесь мёд” (Алена Лісіцкая, 1944 г.н., в. Мілашэвічы, Лельчыцкі раён).*

Разам з тым, варушэнне *“здзвіганне”* у гэты дзень спрыяла захаванню прадуктаў харчавання: *“Мы ж колысь у дэжкі солылы гуркі, капусту, то на Здзьвіжанне вытагалі із того росолу, да перамывалы. А тоды той росол вылывалы, а налывалы чыстаю водою і стояло чыстэнько, свэтлэнко. А тэпэр жа мы ў банкі закрываем, дак на Здзьвіжанне із банок саллеш тую воду і чыстай наллеш -- тады стоят светлыя” (Вольга Каваленка, 1939 г.н., в. Ніжнія Жары, Брагінскі раён).*

Лічылася, што раніцай у дзень свята зямля пачынае рухацца і расступацца ў пэўных месцах, і ў гэтыя правалы на зіму ўваходзяць вужы, гадзюкі, яшчаркі, пасля чаго зямля зноў сыходзіцца і замыкаецца да вясны. *“На Узвіжанне нельзя ў лес ходзіць, кажуць, вужэ і годзюкі ховаюцца под землю” (Алена Лісіцкая, 1944 г.н., в. Мілашэвічы, Лельчыцкі раён). “Зьдзьвіжаньне было, ужы сабіраліся, яны сабіраліся на сонцы, кагалам, на сонцы пагрэюцца да ўжо і хаваліся ў норы” (Улляна Прыходзька, 1936 г.н., в. Смалегаў, Нараўлянскі раён). “На Зьвіжаньне ўсе гады зьдзігаюцца ўместа, яны ўжо зьбіраюцца на зіму, хаваюцца. У лес не хадзілі, бо ета страшна-прастрашна” (Ева Баран, 1946 г.н., в. Перароўскі Млынок, Жыткавіцкі раён).*

Фальклорныя наратывы, запісаныя ад мясцовых інфарматараў усіх узростаў, распавядаюць аб забароне хадзіць у лес у гэты святочны дзень: *“Зьдзьвігі – бальшы празьнік. Усё зьдзьвігаецца, у лес няльзя хадзіць. Хто ў лес пойдзе, абязацельна наткнецца на гадзюку. Гадзюкі паўзуць усе ў купу. Жужмай такой спаўзьлісь” (Марыя Сяргеенка, 1945 г.н., в. Хізаў, Кармянскі раён).* У шматлікіх мемаратах апісваюцца выпадкі страху і жудасці, якія прыйшлося перажыць парушальнікам гэтай забароны: *“У лес не хадзілі, патаму што яны як акружаць цябе, то не знаеш куда ўйці. Шчэ я была маладзейшая, дак і з маткаю пакойнаю насыпалі картоплю ў прыцэп на полі. А маладзіца, яна з маткаю равесніца, прышла туда і кажа: “Пайду ў лес, назьбіраю грушок”. Да пашла і назад лапоча, так быстра йдзе. Матка кажа: “Што там, Надзя?” – Ой, Машка, каб ты пабачыла! Пад ігрушаю столькі іх <гадзюк, вужоў> сплялося клумком, што страх і сум! А, каб я пайшла ў лес, яны б мяне акружылі, я б не вышла адтуль”. Эта на Уздзьвіжанне ў нас так было” (Лідзія Пацук, 1946 г.н., в. Асарэвічы, Брагінскі раён). “У лес нельзя ходзіць, усе звяры спаўзаюцца ўместа. Одна ў нас была, яе сын Юра ўсё ходзіў на охоту. Як пошоў на Узьвіжанне на Калахоўскае балота, прышоў дамоў, кажа: “Мама, я еле ўцёк, такіх вужоў бачыў, і с залатымі каронамі…” Настрахаўся, што пака і жыць буду, на Зьвіжанне ў лес, – кажа, – не пойду. Яна расказвала так, што Юра казаў, столькі вужоў, нагой ступіць недзе, прышоў ні жывы, ні мёртвы Это ўжо цяпер было, после радзіяцыі” (Аляксандра Чугай, 1935 г.н., в. Завайць, Нараўлянскі раён). “Я яшчэ дзеўкай у лес пашла на Здзьвіжанне с падругаю. І там мост, дак вужы на тых палках ляжаць к сонцу, а мы босыя, а нідзе нікога няма. Дак мы раўлі, раўлі, да за тыя свае клуначкі, кошыкі да бягом так і беглі па іх [па вужах – Т.К.]. Дак больш ніколі!” (Алена, Гурыновіч, 1930 г.н., в. Церабаў, Петрыкаўскі раён). “Дак як пойдзеш у лес у эты дзень па ягады, ці па грыбы, дак як улезеш у этыя вужы, дак ня знаеш куда ўцякаць. Іх жа там тысячы!” (Улляна Прыходзька, 1936 г.н., в. Смалегаў, Нараўлянскі раён).*

Лічылася нават, што вужы маглі знаходзіцца ў гэты дзень у грыбах: *“На Зьвіжанне ў нас адна пашла па грыбэ: як разне – так і кроў, як разне – так і кроў і з грыба. Дак яна як спужалася, да прыбегла, кінула тыя й грыбэ, і кошоля, прыбегла додому і с тых пор не стала ходзіць у лес у празьнік. Богато такого яўлялась людзям” (Ніна Глушэц, 1939 г.н., в. Антонаў, Нараўлянскі раён).*

Некаторыя ўяўленні, звязаныя з гэтым святочным днём, насілі міфалагічны характар. Так, лічылася, што ў гадзюк ёсць свой цар, пад

кіраўніцтвам якога яны ідуць на зімовую спячку: *“На Зьдзьвіжанне вужы збіраюцца – ета точна. Хто ня зная, да пойдзе, то пабачыць як табун іх ідзе. Казалі, што е ў іх цар, старыя бачылі, ён большыі на галаве жоўтыя пятна, начальнік ужо ўродзе” (Кацярына Ганюк, 1925 г.н., в. Радзін, Хойніцкі раён). “Баба казала, што ў іх ёсць глаўны змей, ён выбірая стаянку, дзе яны будуць зімаваць. Ён большы за ўсіх, глаўны і вядзе іх туда” (Эма Паўлава, 1938 г.н., в. Старая Рудня, Жлобінскі раён). “Казалі, што ў іх есць цар, з рожкамі. Як дасьць каманду, дак чалавека разарвуць на кускі” (Улляна Прыходзька, 1936 г.н., в. Смалегаў, Нараўлянскі раён).*

Аднак сустрэча з вужыным царом, па-свойму небяспечная, як і спроба адарваць папараць-кветку, ва ўяўленнях мясцовых жыхароў, магла прынесці чалавеку такі ж чароўны дар – незвычайныя вужыныя рожкі. *“Сільно велікі вуж і он з рогамі. Он факцічэскі не кусаецца. Яго не тронь і он не троне. Голова як ведро, тоўшчэнны і дліннюшчы. Голову подняў да сьвішча. І можэ скінуть рожкі. Есьлі его побачыш, то надо штоб было хлеб і белэ шо-небудь, скатерть чы хустка, застілають, ложать хлеб і вон іде. Прыде, на тэ рогі скіне і пошоў. А это ўжо волшэбные рогі. Шо захочыш, этые рогі” (Вольга Фіцнер, 1929 г.н., в. Грабяні, Лельчыцкі раён). “Як пабачыш цара (вужоў), трэба што-та белае палажыць туды, дак ён скіне тыя рогі, і вам будзе сільна вясьці ва ўсём, вы будзеце знаць, што там і пцічка шчабеча” (Алена Савянок, 1924 г.н., в. Дудзічы, Калінкавіцкі раён)* [1, с. 377].

Паводле традыцыйных уяўленняў жыхароў Гомельшчыны, тая гадзюка, якая кагосьці ўкусіла летам, не будзе прынята зямлёю на Узвіжанне, яе зямля карае за грэх: *“На Уздзьвіжанне, кажуць, паўзучыя этыя хаваюцца ў землю. А каторы ўкусіў каго – то выпаўзае на дарогу, каб машына задавіла” (Лідзія Пацук, 1946 г.н., в. Асарэвічы, Брагінскі раён).*

На вёсках ладзіліся кірмашы: *“Зьдзьвіжаньне – вялікі празьнік. Тут у Пагосце на Зьдзьвіжаньне быў ярмолок, прыязджалі з усюль на ярмолок, і дажа з Давід-Городка, з Петрыкова, хто – подводамі, хто – лодкамі, прыязджалі торговаць. Ето было і после войны, і до войны. І цяпер вот прыязджалі бацюшкі ў нашу цэркву” (Зося Кузьміч, 1929 г.н., в. Пагост, Жыткавіцкі раён).*

Свята практычна не мае рытуальнага напаўнення, не суправаджаецца спецыяльна прымеркаванымі песнямі ці абрадамі. У сучасны перыяд сярод мясцовых жыхароў захоўваюцца традыцыйныя павер’і пра свята Узвіжанне як небяспечны час, калі патрэбна прытрымлівацца пэўных правіл паводзін, абмежаванняў і забаронаў. Жыццястойкасць вераванняў пра Узвіжанне, шырокае распаўсюджанне фальклорных наратываў, былічак, звязаных з ім, падтрымліваюцца традыцыйнымі

светапоглянымі ўяўленнямі беларусаў аб свяце наогул, як незвычайным “сакральным” часе, які проціпастаўляецца будням, а таксама нагляднасцю прыкладаў, уласным вопытам.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры

1 Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн.1 / Т. В. Валодзіна [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай – Мінск : Выш. шк., 2012. – 910 с.

**УДК 94:329.14(476)"1917":94:356/.358(476)"1917"**

**А. І. Лізуноў**
(Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт)

# СУПРАЦЬСТАЯННЕ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАМІТЭТУ І БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ Ў ПЫТАННІ ФАРМАВАННЯ БЕЛАРУСКАГА ВОЙСКА

Перыяд 1917–1918 гг. быў лёсавызначальным для беларускага нацыянальнага руху. У гэты перыяд, у крывавым віры Першай Сусветнай Вайны, двух рэвалюцый і замежнай інтэрвенцыі, у межах беларускага нацыянальнага руху разгарнуліся ўнутраныя канфлікты. Як прыклад, канфлікт, які разгарнуўся паміж Беларускім нацыянальным камітэтам і Беларускай сацыялістычнай грамадой.

БНК паўстаў 27 сакавіка 1917 г. першапачаткова як грамадска-палітычная арганізацыя з правым ухілам. Мела фінансаванне з боку прадстаўнікоў буйных беларускіх зямельных уладароў, такіх, як Э. Вайніловіч, князь С. Радзівіл, князь Г. Э. Друцкі-Любецкі і іншыя. У хуткім часе БНК пачало разрастацца за кошт афіляцыі ў склад БНК мясцовых арганізацый. Гэта выклікала рэарганізацыю БНК у палітычную сілу з усімі неабходнымі рэгаліямі. БНК падтрымалі разнастайныя палітычныя (рэлігійнага і інш. характару), культурна-асветніцкія арганізацыі [1, с. 4].

Як процівага БНК дзейнічала БСГ, якая аб’ядноўвала ў сваіх шэрагах прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху, пераважна сацыялістычнага кірунку. Але варта заўважыць, што БСГ, пасля аднаўлення сваёй дзейнасці 24 сакавіка 1917 г., паступова распадалася

на шэраг іншых партый і рухаў з процілеглымі палітычнымі поглядамі. Але нават у такіх умовах БСГ прадстаўляла з сябе асноўную канкуруючую сілу для БНК з шэрагу пытанняў і адным з галоўных пытанняў было пытанне аб стварэнні беларускага войска.

Кожны з бакоў меў свае канцэпцыі фармавання беларускага войска. БНК прадугледжвала беларусізацыю вайсковых фармаванняў, якія пераважна складаліся з беларускіх жаўнераў. Пры гэтым, варта заўважыць, што на фоне тых нацыянальных зменаў, якія адбываліся ў былой Рускай імператарскай арміі (украінізацыя), беларусізацыя пэўных частак праходзіла стыхійна. Аб гэтым сведчыць узнікненне 15 мая 1917 г. Беларускай вайсковай арганізацыі, афіляванай з БНК, Часовы выканаўчы камітэт беларусаў-вайскоўцаў пры 12-й арміі. Сам праект беларускага войска распрацоўвала, паралельна з БВА, Арганізацыя беларусаў-аўтанамістаў. Гэты праект прадугледжваў стварэнне беларускіх частак у складзе Расійскай арміі [3, с. 38]

БСГ займала процілеглую пазіцыю. На думку яе прадстаўнікоў, у перыяд вясны-лета 1917 г. адмаўлялі ідэі стварэння беларускага войска. Іх аргументацыяй было тое, што стварэнне беларускіх вайсковых частак ўнясе разлад у адносіны паміж беларускім рухам і Часовым урадам, а таксама справакаваць Часовы урад на рэпрэсіўныя дзеянні. Як выйсце з усіх спрэчных пытанняў, БСГ бачыла у цеснай супрацы з Часовым урадам і агульнарасійскімі партыямі. А адносна БНК, БСГ лічыла, што БНК павінна было займацца толькі культрана-асветніцкай дзейнасцю і не лезці ў іншыя сферы [1, с. 10]

Сутыкненне адбылося на З’ездзе беларускіх арганізацый 8 ліпеня 1917 г. Пад шквалам крытыкі, якая ўключала ў сябе ігнараванне і дэманстратыўны зыход са з’езду (Беларускі народны саюз) БНК было распушчана. Але таксама крытыку зведала і БСГ. Як вынік з’езду створана Цэнтральная рада беларускіх арганізацый і партый (ЦРБАІП), якая была павінна аб’яднаць беларускі нацыянальны рух і нівеляваць спрэчныя пытанні. Але ў складзе Выканаўчага Камітэту ЦРБАІП дамінуючую ролю адыгрывалі сябры БСГ [2, с. 67].

У першым складзе выканкама ЦРБАІП толькі два сябры былі прадстаўнікамі правага кірунку (А. І. Лявіцкі і А. А. Смоліч), якія падзялялі канцэпцыю БНК, астатнія тры сябры былі прадстаўнікамі БСГ. Ужо на Першым з’ездзе ЦРБАІП у выканкам былі ўведзены новыя сябры, якія пераважна былі прадстаўнікамі левых сіл (эсэраў, БСГ), у выніку чаго, па сутнасці, ЦРБАІП апынулася пад кантролем БСГ. Такім чынам, на пэўны час дамінуючай стала канцэпцыя БСГ.

Увогуле, на жнівеньскім з’ездзе ЦРБАІП было вырашана, што любыя спробы стварэння беларускіх вайсковых фармацый з’яўляюцца шкоднымі і непатрэбнымі. Тыя арганізацыі, якія ўжо існуюць і спрабуюць праводзіць дзейнасць падобнага кшталту, павінны яе спыніць і абмежавацца выключна культурна-асветніцкай дзейнасцю ў асяроддзі беларусаў-вайскоўцаў [4, с. 138].

Але гэта не спыніла стыхійнай дзейнасці беларускіх вайскоўцаў, якія арыентаваліся да гэтага на БНК. Так, ужо пасля роспуску БНК, 20 ліпеня 1917 г. паўстаў Часовы выканаўчы камітэт беларусаў-вайскоўцаў 12-й Арміі, а на Балтыйскім флоце – арганізацыя беларусаў-матросаў Балтыйскага флоту на чале з В. Л. Мухай, неўзабаве да гэтай арганізацыі далучыўся генерал-маёр К. А. Аляксееўскі. На Заходнім і Паўднёва-Заходніх франтах дзейнічалі шэраг беларускіх вайсковых арганізацый. Пры гэтым, некаторыя з іх дзейнічалі ў паўлегальных умовах, бо ўлетку 1917 г. Часовы урад забараніў праводзіць з’езды вайскоўцаў і стварэнне новых арганізацый [5, с. 50].

Такім чынам, намінальна ў змагані за беларускае войска ў нацыянальным руху, у перыяд ад Лютага да Кастрычніка, перамогу атрымала БСГ, падпарадкаваўшы сабе ЦРБАІП. Але гэта не магло спыніць стыхійнай працы беларускіх афіцэраў у расійскім войску па згуртаванню беларускіх вайскоўцаў, якія маглі стаць падмуркам да стварэння беларускага войску. Але і пазіцыя ЦРБАІП не была статычнай, сваю дынаміку яна набыла ўвосень 1917 г.

Па-першае, на гэта спрыяла змена стаўлення да нацыянальных фармацый з боку Часовага ўраду. Згодна з канцэпцыяй генерала М. М. Духоніна да канца лістапада 1917 г. Расійская армія павінна была быць перафармавана па нацыянальна-тэрытарыяльнаму прынцыпу. Гэта павінна было спыніць заняпад маральнага становішча ў войску, дзеля чаго Духонін дазволіў правесці З’езд беларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронту [5, с. 58].

На з’ездзе, які адбыўся 18–21 кастрычніка 1917 г., была створана Беларуская цэнтральная вайсковая рада на чале з С. А. Рак-Міхайлоўскім, якога потым замяніў генерал-лейтэнант К. А. Кандратовіч. У “Грамаце да беларускага народу” прадстаўнікі ЦБВР заклікалі да стварэння і ўступлення ў беларускія вайсковыя фармацыі. Духонін цалкам падтрымаў дзейнасць Кандратовіча [3, с. 44].

Па-другое, ЦРБАІП таксама выдала заклік да стварэння беларускіх фармацый. Аналізуючы папярэднія дзеянні БСГ, можна зрабіць некалькі высноў. Гэта была спазніўшаяся спроба ўзяць верх над стыхійным вайсковым рухам, які ўжо на момант закліку, атрымаў сваю

інстытуалізацыю. Па-другое, менавіта момант дазволу, паказаў БСГ тое, што напэўна іх тактыка была правільнай, нягледзячы на тое, што суседнія народы ўжо стварылі свае вайсковыя фармацыі, якія ў будучыні стануць падмуркам для вайсковых фармаванняў новых дзяржаў (напрыклад, украінізаваныя часткі, якія пераўтварыліся ў Армію УНР, корпус Доўбар-Мусьніцкага) [3, с. 42].

Праца па стварэнню беларускіх фармацый распачалася ў рэзервовых дружынах (якія фармаваліся па тэрытарыяльнай прыкмеце), стварэнне І Беларускага пяхотнага палка. Але праца ў гэтым кірунку правалілася з-за Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пасля таго, як пасаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага заняў Н. В. Крыленка, адбыўся З'езд беларусаў вайскоўцаў у Віцебску, які выказаў шэраг патрабаванняў да Н. В. Крыленкі, адно з якіх было працяг працы ў накірунку стварэння беларускага войска, з якім той згадзіўся, а 24 лістапада быў атрыманы афіцыйны бальшавіцкі дазвол [5, с. 59].

Нацыяналізаваць частку можна было толькі праз агульную згоду ўсіх вайскоўцаў часткі. Гэта сарвала беларусізацыю рэзервовых дружын, а неўзабаве, пад ціскам партыі, Н. В. Крыленка скасаваў пагадненне з беларускімі вайскоўцамі. Як вынік, І Беларускі полк быў падначалены 289 палку і перакінуты на змаганне з Белым рухам на ўсход [3, с. 48].

Але, нягледзячы на забарону, працягвалася стыхійнае стварэнне беларускіх фармацый: Беларускі Уланскі полк у Пскове, Адэскі батальён, І Смаленскі полк, Беларускі эскадрон пад кіраўніцтвам Р. Якубені. Таксама выношвалася ідэя стварэння Беларускай Чырвонай гвардыі. Неўзабаве, да лютага 1918 г., бальшавікамі былі ліквідаваны ўсе беларускія вайсковыя фармацыі, якія існавалі на іх тэрыторыі [5, с. 65–67].

У цяперашні час абсалютная большасць цыганоў Беларусі пражывае ў гарадах і інтэгравана ў сучасную гарадскую культуру, пры гэтым захоўваючы некаторыя элементы традыцыйнага ладу жыцця. З пераходам да аселасці зменам падвергліся ў першую чаргу асноўныя кампаненты матэрыяльнай культуры. Сямейныя традыцыі аказаліся больш устойлівыя да змен, як і некаторыя элементы духоўнай культуры. У месцах кампактнага пражывання цыганоў да нашых дзён захаваў сваю ролю цыганскі суд. Падчас палявых даследаванняў цыганскай этнічнай групы Беларусі было асабліва прыкметна, што нават прадстаўнікі маладога пакалення цыганоў не толькі добра ведаюць традыцыі сваіх продкаў, але і імкнуцца іх захаваць і папулярызаваць.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1 Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Полымя, 1992. – 251 с.

2 Аникиевич, К.Т. Сенненский уезд Могилевской губернии : опыт описания в географическом, историческом, этнографическом, бытовом, промышленном и статистическом отношениях, с картою уезда, схемою двух озер и рисунками в тексте / К. Т. Аникиевич. – Могилев : Могилевский губ. стат. ком., 1907. – [6], 148, [1] с.

3 Дембовецкий, А. С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях : в 3 кн. / А. С. Дембовецкий. – Могилев-на-Днепре, 1882–1884. – Кн. 1. – [4], 25, 782, [2] с.

4 Сементовский, А. М. Этнографический обзор Витебской губернии / А. М. Сементовский. – СПб. : Тип. М. Хана, 1872. – 69 с.

5 Бартош, О.Э. Традиционная социальная культура цыган Беларуси в конце XX - начале XXI века : автореф. дис. ... канд. исторических наук : 07.00.07 / О. Э. Бартош ; ГНУ "Институт искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы НАН Беларуси". – Минск, 2010. – 22 с.

6 Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 7. Воп. 1. Спр. 1001.

7 Кто живет в Беларуси / А. В. Гурко [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 799 с.

8 Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – Минск : Полымя, 1992. – 251 с.

9 Чаквин, И. В. Цыгане / И. В. Чаквин, О. Э. Бартош // Кто живет в Беларуси / А. В. Гурко [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2012. – С. 658 – 685.

**УДК 930:94:323.26:325.2:326(430)"1941-1944":929*П.И.Беленков**

**Ю. В. Панков**
(Гомель, ГИКУ «Гомельский дворцово-парковый ансамбль»)

## ВОСПОМИНАНИЯ П. И. БЕЛЕНКОВА КАК ИСТОЧНИК ПО ИЗУЧЕНИЮ ПОДПОЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОСТАРБАЙТЕРОВ

Деятельность подпольщиков на территории оккупированной Беларуси в 1941–1944 гг. долгие годы притягивает внимание исследователей. Однако участие белорусов в антифашистском подполье на территории Германии из-за нехватки информации недостаточно отражено в историографии. К данной проблематике в различное время обращались историки Р. Р. Крючок и В. П. Павлов [1]. Исследователями были введены в научный оборот сведения о ряде белорусских патриотов из числа военнопленных, действовавших на территории нацистской Германии.

В фонде № 3100 Государственного архива Гомельской области сохранились воспоминания жителя г. Добруш Петра Ивановича Беленкова, 1922 г. р., в которых он описывает, в т. ч., участие в подпольной группе на германском предприятии «Шпиннштоффверке Глаухау АГ» [2]. Материал был записан в начале 1990-х гг. и первоначально предназначался для Международного Бухенвальдского комитета (в архивном документе адресат зачеркнут и заменен на Советский Комитет Ветеранов войны). Хотя между событиями и прошло много времени, автор смог дать фактологические сведения, дающие представление о составе и деятельности группы. В белорусской историографии не обнаружено информации об этой организации.

Воспоминания представляют собой машинописные ответы на 11 вопросов, среди которых первые четыре носят личностный характер, пятый – общего плана, с шестого по восьмой (развёрнутый ответ только на вопрос № 6) – повествование об угоне в Германию и деятельности подпольной группы, с девятого по одиннадцатый – повествование о концентрационном лагере «Бухенвальд» и восстании в нём.

Из источника следует, что П. И. Беленков застал войну в Добрушском районе и был признан местным Районным военным комиссариатом негодным к воинской службе по причине продолжительной глазной болезни. Оставаясь на оккупированной территории, он собирал и хранил у себя оружие, за что в мае 1942 г. был арестован полицией, после чего направлен на биржу труда в г. Добруш, а затем – в г. Гомель. В итоге Беленков был угнан оккупантами в Германию на принудительные работы. Железнодорожным эшелоном под конвоем его привезли в г. Хемниц, откуда, вместе с другими советскими гражданами, направили работать на текстильное предприятие «Шпинныштоффверке Глаухау АГ», расположенное в г. Глаухау. В воспоминаниях указано, что на нём вырабатывали из целлюлозы искусственное волокно и вату для военных целей. Стоит отметить, что на «Шпинныштоффверке» уже с августа – сентября 1941 г. были организованы трудовые команды из советских военнопленных [3, с. 57].

Далее обратимся непосредственно к источнику.

«…Во время пребывания в лагере для “Остарбайтеров” на “Шпинстофверке” после тщательного изучения и проверки друг друга в принадлежности к антифашизму, мы, рискуя жизнями, сформировали подпольную подрывную группу из девяти человек. Цель нашей группы заключалась в нанесении даже самого малейшего вреда, как самой фашистской политике, так и поломке и выводу из действий любого оборудования на “Шпинстофверке”. Даже каждый сломанный болт или же сорванная резьба на гайке временно останавливала гитлеровский механизм порабощений и уничтожений человечества мира.

В группу девяти входили нижеследующие товарищи: 1. Кабешов Артём. 2. Бебчик Иван. 3. Рыжаков Кузьма. 4. Клюс Иван. 5. Козлов Павел. 6. Карнарук Ефим. 7. Беленков Пётр. 8. Коробко Василий. 9. Иванов Василий.

В связи с тем, что моя глазная болезнь повторилась, т. к. предприятие “Шпинстофверке” работало на химикалиях, я был переведён

на работу в сельское хозяйство в деревню Гезау к бауэр-нацисту Герберту Рейхенбаху (деревня Гезау находилась на расстоянии от города Глаухау в 2–2,5 км). Работая и проживая у Герберта Рейхенбаха я продолжал нелегальные встречи со своими товарищами из мной переименованной группы. В деревне Гезау находилось 20 югославских военнопленных, работавших у крестьян, а также 5 польских граждан. По заданию моих товарищей из подпольной группы (группой руководили тт. Карнарук Ефим Захарович и Кабешов Артём Сергеевич) я проводил политическую работу среди югославских и польских граждан, т. е. разъяснял о нашей социалистической стране, а также о событиях и победах на фронтах войны, которые получались товарищами Карнаруком и Кабешовым от немецких антифашистов, работавших на "Шпинстофверке".

Таким образом наша подпольная и подрывная группа существовала и действовала по декабрь месяц 1943 г. 2 декабря 1943 г. (день был пятница) вечером все мы, 9 человек, были арестованы комиссарами Хемнитского гестапо. Я был арестован в частной парикмахерской на очередной явке с югославами и польскими гражданами в той же деревне Гезау, и каждый из нас в металлических наручниках перевезены тюремным "Чёрным вороном" в Хемнитскую тюрьму…» [2, л. 8–9].

Из этого следует, что подпольная антифашистская группа, вероятно, просуществовала более года. После перевода П. И. Беленкова на другую работу в деревню Гезау, она разделилась на две ячейки, в которую, с одной стороны, были вовлечены сочувствовавшие немецкие рабочие, с другой – югославские пленные и польские цивильарбайтеры. Основными задачами подпольщиков были агитация и пропаганда, а также саботаж и порча имущества.

Заключённые пробыли в тюрьме г. Хемниц до середины 1944 г., пока восемь из девяти членов не были переведены транзитом через тюрьмы в гг. Гале и Лейпциг в концентрационный лагерь Бухенвальд. Василию Иванову (уроженец г. Ленинград) в результате пыток парализовало обе ноги, после чего он попал в тюремную больницу [2, л. 10].

Пётр Иванович Беленков содержался в лагере вплоть до его освобождения 13 апреля 1945 г. американскими войсками. Был непосредственным участником вооружённого восстания 11 апреля. После войны через фильтрационные лагеря вернулся на Родину. Его воспоминания являются важным историческим источником по

изучению подпольного антифашистского движения в Западной Европе, в котором участвовали советские граждане, в т. ч. и белорусы.

Воспоминания, написанные почти полвека спустя – субъективны и требуют верификации. В связи с этим важно выявить и проанализировать дополнительную источниковую базу. В Государственном архиве Гомельской области хранится анкета из советского фильтрационного лагеря, в которой указано, что П. И. Беленков, уроженец д. Крупец Добрушского района, в оккупацию занимался сельским хозяйством. В мае 1942 г. был мобилизован и отправлен на работы в Германию. Далее информация совпадает с воспоминаниями: место работы, тюрьма, концлагерь, освобождение американскими войсками [2, л. 1–2].

Результат поиска в электронной базе данных Архивов Арользена также косвенно подтверждает информацию [4]. В ней имеется несколько карточек на имя «Belenkow Petr», согласно которым П. И. Беленков действительно был в концентрационном лагере Бухенвальд. Попал он туда 15 июня 1944 г. через гестапо в г. Хемниц. В анкете американского фильтрационного лагеря указано, что он был арестован за пропаганду 2 декабря 1943 г. гестапо г. Глаухау. Таким образом, информация из базы данных не противоречит воспоминаниям. Единственное несовпадение – это дата рождения Беленкова. В немецких карточках указан 1924 год вместо 1922, что не сильно влияет на фактологию.

В Архивах Арользена нашлись данные на упоминаемого Беленковым руководителя группы Ефима Карнарука. Среди его карточек были обнаружены важные подтверждающие сведения. В одном документе от 3 декабря 1943 г. указано: «[пер. с нем.] Остарбайтеры: № 403 Каробкин Василий …, № 404 Кабишев Артём …, № 411 Козлов Павел …, № 418 Карнарук Ефим …, № 447 Рыжаков Кузьма …, № 448 Клюс Иван …, № 490 Иванов Василий …, № 541 Бебчик Иван … содержатся под стражей в секретной государственной полиции в Хемнице с 3 декабря 1943 года» [4].

Если учесть тот факт, что П. И. Беленков был арестован в д. Гезау отдельно от всей группы, то в совокупности сведения о составе подпольщиков верифицируются с незначительными правками в фамилиях. Отталкиваясь от этого документа, а именно – от написания латиницей фамилий, была найдена информация обо всех её членах. В связи с этим, выявлено, что, кроме Беленкова, ещё три участника были уроженцами БССР – Кабишев, Козлов, Бебчик, остальные – выходцы из РСФСР и УССР.

Таблица – 1 Члены подпольной антифашистской группы на предприятии «Шпинништоффверке Глаухау АГ» (по материалам Архивов Арользена)

| № п/п | Фамилия, имя | Дата рождения | Место жительства до войны |
|---|---|---|---|
| 1 | Карнарук Ефим | 14.04.1913 | г. Киев, УССР |
| 2 | Кабишев Артём | 20.10.1905 | д. Науховичи Чечерского р-на Гомельской обл., БССР |
| 3 | Беленков Пётр | 1922 | д. Крупец Добрушского р-на Гомельской обл., БССР |
| 4 | Каробкин Василий | 25.10.1917 | Орловская обл., РСФСР |
| 5 | Козлов Павел | 01.01.1918 | д. Науховичи Чечерского р-на Гомельской обл., БССР |
| 6 | Рыжаков Кузьма | 29.10.1897 | Орловская обл., РСФСР |
| 7 | Клюс Иван | 01.09.1896 | Каменец-Подольская обл., УССР |
| 8 | Иванов Василий | 10.10.1919 | г. Ленинград, РСФСР |
| 9 | Бебчик Иван | 01.01.1923 | д. Осово Бобруйского р-на Могилёвской обл., БССР |

Таким образом, подпольная деятельность советских граждан не ограничивалась территорией Советского Союза. Патриоты среди военнопленных и остарбайтеров создавали подрывные ячейки глубоко в тылу Германии, оттуда нанося урон врагу. Введение в научный оборот воспоминаний П. И. Беленкова и их верификация открыли исследователям сведения о ранее неизвестной антифашистской группе, действовавшей на предприятии «Шпинништоффверке Глаухау АГ», в которую были вовлечены четыре белоруса.

## Список использованных источников и литературы

1 Павлов, В. П. Участие белорусов в подпольной организации «Братское сотрудничество военнопленных» / В. П. Павлов // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – Мінск, 2015. – № 2. – С. 45–53.

2 Государственный архив Гомельской области. – Ф. 3100. Оп. 1. Д. 33.

3 Цайтхайн – Книга Памяти советских военнопленных / под ред. Н. Хаазе [и др.]. – Минск–Дрезден : Объединение Саксонские мемориалы в память жертвам политического террора, 2006. – 187 с.

4 Arolsen Archives [Электронный ресурс] – Режим доступа : https://arolsen-archives.org/ru/. – Дата доступа : 09.09.2021.

УДК 94:323.11:658(476)"199"

**І. А. Пушкін**
(Магілёў, УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых
і хімічных тэхналогій»)

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ СКЛАД КІРУЮЧЫХ КАДРАЎ У ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ АБВЯШЧЭННЯ ДЗЯРЖАЎНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ

У СССР існавала высокая этнасацыяльная мабільнасць. Істотны ўплыў на нацыянальны склад кадравага патэнцыялу Савецкай Беларусі аказвалі: арганізаваныя наборы працоўнай сілы на буйныя будоўлі СССР, перасяленне беларускага насельніцтва ў раёны Далёкага Усходу, Сібіры, Карэліі. Тысячы высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў з Беларусі пасля заканчэння вучобы ў ВНУ па размеркаванні трапілі на прадпрыемствы, будоўлі, у арганізацыі і ўстановы за межы рэспублікі. Сярод іх большасць складалі менавіта беларусы [3]. Адначасова ў БССР на кіруючыя пасады накіроўваліся спецыялісты з розных рэгіёнаў СССР (пераважна з РСФСР). У выніку нацыянальныя меншасці сярод гаспадарчага кіраўніцтва складалі большы працэнт, чым іх удзельная вага ў жыхарстве Беларусі. Аб чым сведчыць нацыянальны склад пасадавых асобаў у эканоміцы Савецкай Беларусі. Так, сярод кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і яб’яднанняў рэспублікі беларусаў было: 1984 г. – 48,2%, 1985 г. – 51,2%, 1986 г. – 54,5%, 1987 г. – 56,4% [2].

На фарміраванне кадравага патэнцыялу БССР, асабліва кіруючага апарата, ўплывалі змяненні ў нацыянальным складзе гарадскога насельніцтва, павышэнне адукацыйнага ўзроўню беларусаў, правядзенне ў справе фарміравання партыйна-дзяржаўнага і гаспадарчага кіраўніцтва палітыкі адміністратыўнага рэгулявання долі тытульнай нацыі і інш. Вялікую ролю адыгрывалі анкетныя дадзеныя. Пры прызначэнні на пасаду значэнне мела сацыяльнае паходжанне і членства ў КПСС. Улічваючы высокі ўзровень адукацыі сярод яўрэйскага насельніцтва, можна казаць аб адміністратыўных перашкодах пры прызначэнні іх на адказныя і кіруючыя пасады. Існавала насцярожанасць і пэўныя абмежаванні ў адносінах да палякаў. У той жа час, трэба мець на ўвазе, што ў апошняе дзесяцігоддзе існавання БССР нацыянальнасць

улічвалася ў анкетах і пры назначэнні на пасаду, але большасць грамадзян не надавала ёй вялікага значэння, усведамляючы сябе савецкімі людзьмі. Палітычны недавер, павышаная падазронасць да тых, хто патэнцыяльна маглі займаць кіруючыя пасады, асабліва да выхадцаў з Цэнтральнай і Заходняй Беларусі, захоўваліся аж да 1991 г. [6, с. 353; 5, с. 321]

На 1 ліпеня 984 г. з агульнай колькасці дырэктараў (у тым ліку і генеральных) прадпрыемстваў і аб'яднанняў, кіраўнікоў будаўнічых трэстаў, начальнікаў домабудаўнічых і вясковых будаўнічых камбінатаў БССР былі прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей Беларусі: генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання Міністэрства будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання БССР (рускі), два (з трох, што складала 66%) генеральныя дырэктары вытворчых аб'яднанняў Міністэрства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання (рускі і украінец), генеральны дырэктар Магілёўскага вытворчага аб'яднання шоўкавых тканін (рускі), два генеральных дырэктары (33% ад агульнай колькасці) вытворчых аб'яднанняў малочнай прамысловасці БССР (рускія), трынаццаць (59,1%) дырэктараў мясакамбінатаў БССР (11 рускія і 2 украінцы), восем (72,7%) дырэктараў прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці БССР (рускія), шэсць (што складае 66% ад агульнай колькасці кіраўнікоў прадпрыемстваў у гэтай галіне вытворчасці) дырэктараў прадпрыемстваў тэкстыльнай прамысловасці БССР (рускія), дырэктар Гродзенскага вытворчага абутковага аб'яднання "Нёман" (рускі), чацвёра (57,1%) дырэктараў прадпрыемстваў мікрабіялагічнай прамысловасці БССР (2 рускія, 1 эстонец, 1 татарын), чатыры (80%) дырэктары абутковых фабрык (рускі, яўрэй, 2 украінцы), чатыры (50%) начальнікі домабудаўнічых камбінатаў БССР (рускія), сямнаццаць (39,5%) упраўляючых будаўнічымі трэстамі ў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай вобласцях (8 рускія, 2 палякі, 6 украінцаў, 1 яўрэй), два (25%) дырэктары прадпрыемстваў трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання (рускі і украінец), дырэктар Магілёўскага завода "Строммашына" (рускі), дырэктар Ваўкавыскага завода кровельных і будаўніча–аздабленчых машын Гродзенскай вобласці (яўрэй), пяць (71,4%) дырэктараў прадпрыемстваў будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання (усе рускія), дырэктар вытворчага аб'яднання "Магілёўліфтмаш" (рускі), пяць (71,4%) начальнікаў геафізічных, геолагавыведачных і пашукова-здымачных экспедыцый БССР (рускі і 4 украінцы), два (66%) начальнікі буравых работ

(рускія), два (100%) начальнікі нафтагаздабываючых упраўленняў БССР (украінцы) і інш. [4, с. 207]

У 1988 г. у Магілёўскай вобласці рускімі па нацыянальнасці былі: загадчыкі аддзелаў прамыслова-транспартнага, гандлю і бытавога абслугоўвання, сельскагаспадарчага і харчовай прамысловасці абкама КПБ [8, арк. 14–15], генеральны дырэктар Магілёўскага навукова-вытворчага аб’яднання па сельскай гаспадарцы, дырэктар Бабруйскага маслабойнага завода, генеральны дырэктар Магілёўскага вытворчага аб’яднання хлебапрадуктаў, дырэктар Магілёўскага металургічнага завода імя А. Мяснікова, генеральны дырэктар Магілёўскага вытворчага аб’яднання “Стромаўталінія”, генеральны дырэктар Магілёўскага вытворчага аб’яднання “Хімвалакно”, упраўляючы раённым упраўленнем энэргетыкі і электрыфікацыі “Магілёўэнэрга”, дырэктары двух прадпрыемстваў нафтаперапрацоўваючай прамысловасці, дырэктар Шклоўскай папяровай фабрыкі “Спартак”, генеральны дырэктар Магілёўскага вытворчага аб’яднання шаўковых тканін, упраўляючы будаўнічым трэстам; украінцамі – старшыня Магілёўскага абласнога вытворчага аб’яднання па аграхімічнаму абслугоўванню сельскай гаспадаркі [8, арк. 97–107адв.], дырэктары Бабруйскага машынабудаўнічага завода і абутковай фабрыкі, дырэктар аднаго з прадпрыемстваў нафтаперапрацоўчай прамысловасці, начальнік домабудаўнічага камбіната. Упраўляючым аднаго з будаўнічых трэстаў быў яўрэй, з татар паходзіў дырэктар гідролізнага завода [8, арк. 144адв.–178адв.].

У 1989 г. сярод: загадчыкаў аддзелаў Савета Міністраў БССР (усяго 20) беларусы складалі 85%, рускія – 15%; міністраў, старшынь дзяржкамітэтаў, кіраўнікоў рэспубліканскіх устаноў (усяго 64) было беларусаў – 82,8%, рускіх – 15,6%, украінцаў – 1,6%; намеснікаў міністраў, старшынь дзяржкамітэтаў, кіраўнікоў рэспубліканскіх устаноў (усяго 169) беларуаў – 69,2%, рускіх – 22,5%, украінцаў – 5,9%, палякаў – 1,2%, яўрэяў – 1,2% [7, арк. 13–14]. Прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у органах дзяржаўнага кіравання было 22,6%, у кіраўніцтве прадпрыемстваў і арганізацый – 28,4%. Сярод інжынерна-тэхнічных спецыялістаў яны складалі 35,4%; аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынарных работнікаў і ляснічых – 15,8%; медыцынскіх работнікаў – 30%; навуковых работнікаў, выкладчыкаў і выхавальнікаў – 30,9%; работнікаў літаратуры і друку – 33,3%; культурна–асветніцкіх работнікаў – 29,3%; работнікаў мастацтва – 44%; юрыдычнага персаналу – 30,1% [1, с. 303]. У наменклатуру кадраў абкамаў КПБ на 01.01.1989 г. былі ўключаны 981 кіраўнік

прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сувязі, будаўнічых арганізацый. Сярод іх было 241 чал. (24,6%) рускай нацыянальнасці, 53 (5,5%) украінцы, 14 (1,4%) яўрэяў, 12 (1,2%) палякаў, 2 (0,2%) татарыны, па 1 (0,1%) немцу, бурату, адыгейцу, 3 (0,2%) – іншых нацыянальнасцей. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 33,4 % [7, арк. 12,14].

У структурах рэспубліканскай улады і мясцовых выканкамаў у БССР існавалі ўпраўленні і аддзелы, якія займаліся кантролем і каардынацыяй выканання эканамічных праграм і дырэктыў партыйных і вышэйстаячых органаў улады. Варта адзначыць, што іх уплыў на дзейнасць прамысловых прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання быў зусім ня значным, так як гэтыя прадпрыемствы ім не падпарадкоўваліся. Таму рэспубліканскія і мясцовыя органы ўлады практычна не мелі ніякага ўплыву на фарміраванне кіруючага складу работнікаў дадзеных прадпрыемстваў. Гэта пры тым, што менавіта гэтыя прадпрыемствы з’яўляліся градаўтваральнымі і адыгрывалі галоўную ролю ў гаспадарчым развіцці БССР.

Аналіз прыведзенай статыстыкі і прыкладаў займаемых пасадаў дазваляе зрабіць выснову аб высокім сацыяльным статусе нацыянальных меншасцей у гаспадарчым жыцці Савецкай Беларусі. Яны ўнеслі істотны ўклад у развіццё эканомікі і кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР ва ўмовах адзінага народна-гаспадарчага комплексу (1944–1991 гг.).

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1 Беларусы. Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык, В. М. Белявіна, Г. І. Каспяровіч [і інш.]; рэдкал. : В. К. Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 433 с.

2 Даведкі аб складзе кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і аб’яднанняў БССР. 1984–1987 гг. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 982. Арк. 1–2 (1984–1985); Спр. 406. Арк. 4–5 (1986–1987).

3 Пушкин, И. А. Сельскохозяйственное и промышленное переселение белорусов в Карелию (опыт Могилевской области) / И. А. Пушкин // Белорусы в Карелии (середина XX – начало XXI в.): сб. науч. ст. / И. И. Калачёва [и др.]; под ред. И. И. Калачёвой. – Минск : БГУ, 2016. – С. 42–63.

4 Пушкін, І. А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.) : манаграфія / І. А. Пушкін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 319 с.

5 Пушкін, І. А. Грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Беларускай ССР (1919–1991) : манаграфія / І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2018. – 423 с.

6 Саракавік, І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. – Мінск : "Современная школа", 2006. – 456 с.

7 Справаздачы. Нацыянальны склад кіруючых кадраў БССР // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 966.

8 Статыстычныя справаздачы // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). – Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60.

**УДК 94:323.11(476.5-21Віцебск)"1939-1989"**

**Н. А. Пятрэнка**
(Віцебск, УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»)

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ СКЛАД ЖЫХАРОЎ ГОРАДА ВІЦЕБСКА (1939–1989)

Тэматыка вывучэння сацыяльнага жыцця пасляваеннага перыяду Савецкай Беларусі ўсё больш прыцягвае ўвагу даследчыкаў сваёй актуальнасцю. Гэта абумоўлена тым, што дадзены перыяд застаецца слабавывучаным і перад навукоўцамі адчыняецца вялікі даследніцкі патэнцыял. Важнай часткай даследаванняў з'яўляецца аналіз сацыяльна-дэмаграфічнага развіцця, у які ўваходзіць і характарыстыка нацыянальнага складу жыхароў.

Мэта артыкула – выявіць асаблівасці транфармацыйных працэсаў нацыянальнага складу жыхароў г. Віцебска ў 1939–1989 гг.

Аўтарам былі прааналізаваны дакументальныя матэрыялы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Расійскага дзяржаўнага архіва эканомікі. Даследаванне грунтуецца на прынцыпах аб'ектыўнасці і гістарызму, у аснову пакладзены гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-праблемны метады.

Табліца 1 – “Нацыянальны склад жыхароў г. Віцебска 1939–1989 гг.” [1 –10].

| Нацыянальнасць | Колькасць жыхароў горада | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1939 г. | | 1959 г. | | 1970 г. | | 1979 г. | | 1989 г. | |
| | тыс. | % | тыс. | % | тыс. | % | тыс. | % | тыс. | % |
| **Усяго жыхароў** | **167.3** | **100** | **148.3** | **100** | **230.8** | **100** | **300.8** | **100** | **350** | **100** |
| Беларусы | **92.5** | 55.3 | **100.6** | 67.8 | **157** | 68 | **200.9** | 66.9 | **242.1** | 69.2 |
| Украінцы | **3.1** | 1.9 | **3.3** | 2.2 | **6** | 2.6 | **9.7** | 3.2 | **10** | 2.9 |
| Рускія | **28.8** | 17.2 | **31.9** | 21.5 | **54** | 23.4 | **71.8** | 23.9 | **82.1** | 23.5 |
| Габрэі | **37.1** | 22.2 | **10.4** | 7.1 | **10.3** | 4.5 | **9.3** | 3.1 | **8.1** | 2.3 |
| Палякі | **2.6** | 1.6 | **0.8** | 0.5 | **1.2** | 0.5 | **1.4** | 0.4 | **1.6** | 0,4 |
| Іншыя нацыянальнасці | **3.2** | 1.8 | **1.3** | 0.9 | **2.3** | 1 | **7.7** | 2.5 | **6.1** | 1.7 |

У канцы 1930-х гг. у г. Віцебску назіралася станоўчая тэндэнцыя павелічэння колькасці насельніцтва. Садзейнічала гэтаму актыўнае прамысловае развіццё, якое з’яўлялася асноўным дэмаўтваральным фактарам савецкага часу. Згодна дадзеным перапісу насельніцтва 1939 г. колькасць жыхароў г. Віцебска складала 167299 чалавек [1, арк. 8]. Гэта была даволі вялікая колькасць насельніцтва для таго часу, што рабіла даваенны г. Віцебск адным з буйнанаселеных гарадоў Савецкай Беларусі. На 1939 г. у этнічным складзе жыхароў горада назіралася перавага трох нацыянальнасцяў: 55,3 % (92,5 тыс.) беларусаў, 22,2 % (37,1 тыс.) габрэяў і 17,2 % (28,8 тыс.) рускіх. Акрамя гэтага пражывала 1.9% (3,1 тыс.) украінцаў, 1.6 % (2,6 тыс.) палякаў і 1,8 % (3,2 тыс.) складалі прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў [2, арк. 162].

За ваенны перыяд і першыя гады пасляваеннага часу назіралася адмоўная тэндэнцыя дэмаграфічнага развіцця г. Віцебска. На 1 студзеня 1945 г. насельніцтва горада складала толькі 33710 чалавек, што паказвае значныя страты на 133589 чалавек ад колькасці жыхароў 1939 г. [3, арк. 57]. Трэба падкрэсліць, што нават на 1950 г. колькасць жыхароў горада вырасце толькі да 80950 чалавек [4, арк. 2]. Праводзіць перапісы насельніцтва ў першы пасляваенны час было

дастаткова складана, бо існавалі больш важкія аднаўленчыя мерапрыемствы. Менавіта таму, першы перапіс насельніцтва адбудзецца толькі ў 1959 г., згодна дадзеным якога ў г. Віцебску пражывалі 148300 чалавек [5, арк. 23]. За перыяд 1939–1959 гг. колькасць беларусаў у нацыянальным складзе насельніцтва горада вырасла на 12,5 % ад агульнай. Калі ў 1939 г. адсотак беларусаў складаў 55,3 % (92,5 тыс.), то ў 1959 г. дасягнуў 67,8 % (100,6 тыс.). Колькасць габрэяў за акрэслены перыяд значна паменшылася на 15 %, калі на 1939 г. прадстаўнікоў дадзенага этнасу ў агульным складзе жыхароў горада было 22,2 % (37,1 тыс.), то на 1959 г. толькі 7,1 % (10,4 тыс.), што тлумачылася масавымі знішчэннямі фашыстамі менавіта прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасці. Нязначныя змены адбываліся ў адсоткавых паказчыках іншых нацыянальнасцяў: павялічваецца колькасць рускіх на 4,3 % з 17,2 % (28,8 тыс.) да 21,5 % (31,9 тыс.) і ўкраінцаў на 0,3 % з 1,9 % (3,1 тыс.) да 2,2 % (3,3 тыс.) і памяншэнне колькасці палякаў на 1,1 % з 1,6% (2,6 тыс.) да 0,5 % (0,8 тыс.). Крыху меней за 1 % (1,3 тыс.) складалі прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў [6, арк. 4 ]. Дадзеныя тэндэнцыі былі характэрны амаль усім беларускім гарадам: назіралася павелічэнне колькасці карэннага насельніцтва і зніжэнне колькасці прадстаўнікоў габрэйскага паходжання.

Наступны перапіс насельніцтва быў праведены ў 1970 г., згодна дадзеным якога ў г. Віцебску пражывала 230804 чалавек [7, арк. 60]. На гэты момант у горадзе быў павялічаны даваенны ўзровень колькасці жыхароў. У этнічным плане перавага заставалася ў беларусаў, якіх у горадзе ад агульнай колькасці насельніцтва налічвалася 68 % (157 тыс.). Другое месца займалі прадстаўнікі рускага этнасу, колькасць якіх павялічылася да 23,4 % (54 тыс.). На трэцім месцы былі прадстаўнікі габрэйскай нацыянальнасці, якіх налічвалася 4,5 %. (10,3 тыс.). Невялікі колькасны прыбытак адносна мінулаага перапісу назіраўся ў украінскага (на 2,7 тыс.) і польскага (на 0,4 тыс.) этнасаў. Аднак, нягледзячы на тое, што сярод жыхароў горада колькасць палякаў павялічылася, у адсотках паменшылася на 0,1 %. Колькасць украінцаў наадварот павялічылася на 0,4 %. Прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў складалі 1 % (2,3 тыс.) ад агульнай колькасці жыхароў горада [8, арк. 53]. Трэба вызначыць, што з сярэдзіны 1960-х гг. пачаўся масавы прыток у горад вясковых жыхароў з усёй вобласці, што дазволіла павялічыць колькасць прадстаўнікоў карэннай нацыянальнасці, а таксама прадстаўнікоў памежнага рускага этнасу.

Згодна перапісу 1979 г. у горадзе налічвалася 300786 жыхароў [9, арк. 1]. Нацыянальны склад у адсоткавых паказчыках змяніўся

нязначна адносна папярэдняга перапісу. У 1979 г. у горадзе налічвалася 66,9 % беларусаў (200,9 тыс.), рускіх – 23,9 % (71,8 тыс.), палякаў – 0,4% (1,4 тыс.), украінцаў – 3,2 % (9,7 тыс.). Працягвалася тэндэнцыя памяншэння колькасці прадстаўнікоў габрэйскага этнасу адносна перапіса 1970 г., было 4,5 % (10,3 тыс.), а ў 1979 г. складала 3,1 % (9,3 тыс.). Колькасць жыхароў іншых нацыянальнасцяў складала 2,5 % (7,7 тыс.) [8, арк. 54]. Назіралася паступовае памяншэння колькасці жыхароў габрэйскай нацыянальнасці, што адбывалася па прычыне пачатку масавай эміграцыі з СССР. Цікавым момантам стала невялікае паніжэнне адсоткавх паказчыкаў беларусаў з 68 % ў 1970 г. да 66,9 % ў 1979 г., аднак у колькасных паказчыках беларусаў стала больш амаль на 50 тысяч чалавек.

За наступнае дзесяцігоддзе колькасць насельніцтва г. Віцебска вырасла да 350004 жыхароў [10, арк. 4]. Згодна перапісу 1989 г. сярод жыхароў горада большасць складалі прадстаўнікі беларускай нацыянальнасці, якіх налічвалася 69,2 %. (242,1 тыс.). Амаль чацвёртую частку жыхароў складалі рускія – 23,5 % (82,1 тыс.), украінцы – 2,9 % (10 тыс.), палякі – 0,4 % (1,6 тыс.) і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў 1,7 % (6,1 тыс.). Назіралася далейшая эміграцыя і колькаснае памяншэнне сярод жыхароў горада габрэйскага насельніцтва, прадстаўнікоў дадзенай нацыянальнасці засталося ў горадзе толькі 2,3 % (8,1 тыс.) [8, арк. 55]. Такім чынам, значных зменаў у нацыянальным складзе не адбывалася: як і раней перавага была ў беларускага і рускага этнасаў, а таксама працягнулася эміграцыя габрэяў у Ізраіль і ЗША.

Такім чынам, за перыяд 1939–1989 гг. у дэмаграфічна-нацыянальным складзе жыхароў г. Віцебска адбыліся значныя змены. Агульная колькасць жыхароў горада вырасла больш чым удвая: з 167299 да 350004 жыхароў. За гэты перыяд адсотак беларусаў у нацыянальным складзе насельніцтва горада павялічыўся ад 55,3 % (92,5 тыс.) да 69,2 % (242,1 тыс.), дзякуючы ўрбанізацыйным працэсам. Чацвёртую частку насельніцтва горада складалі прадстаўнікі рускага этнасу, што тлумачылася памежным з РСФСР палажэннем горада. Колькасць украінцаў і палякаў мела ўстойлівую пазіцыю нязначанага павелічэння. Самыя значныя змены адбыліся з колькасцю жыхароў габрэйскай нацыянальнасці. У адсоткавым вымярэнні на 1939 г. прадстаўнікі гэтай нацыянальнасці складалі 22,2 % ад агульнай колькасці жыхароў, а ў 1989 г. іх колькасць паменшылася да 2,3 %. Гэта было выклікана масавымі фашысцкімі знішчэннямі ў перыяд вайны, а таксама эміграцыйнымі працэсамі пасляваеннага часу.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1 Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 2207. Воп. 2. Спр. 1.
2 Расійскі дзяржаўны архіў эканомікі. – Ф. 1562. Воп. 336. Спр. 256.
3 ДАВВ. – Ф. 1974. Воп. 2. Спр. 1580.
4 ДАВВ. – Ф. 2895. Воп. 2. Спр. 5.
5 ДАВВ. – Ф. 2895. Воп. 2. Спр. 31.
6 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 30. Воп. 5.
7 ДАВВ. – Ф. 2895. Воп. 2. Спр. 153.
8 ДАВВ. – Ф. 2895. Воп. 3. Спр. 51.
9 ДАВВ. – Ф. 2895. Воп. 2. Спр. 373.
10 ДАВВ. – Ф. 2895. Воп. 3. Спр. 38.

**УДК 94:323.1(476):706.034.2"192/193"**

**О. И. Сенькевич**
(Минск, УО «Белорусский государственный университет
физической культуры»)

## ВЛИЯНИЕ НАЦИОНАЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ БССР НА МАССОВЫЕ СПОРТИВНЫЕ МЕРОПРИЯТИЯ В 1920 – 1930-Е ГОДЫ

После октябрьской революции 1917 г. физическая культура перестает быть частным делом и становится предметом государственной заботы. «Физическая культура» советского гражданина имела важное идеологическое значение. Формы и методы ее развития определялись государством. Массовое распространение занятий физической культурой и спортом, по мнению советских руководителей, укрепляло здоровье населения и повышало готовность граждан совершать трудовые и военные подвиги во славу своей страны, бороться с внешними и внутренними врагами. Кроме того, массовая физическая культура провозглашалась средством классовой борьбы.

Спортивные соревнования предусматривали состязание и определение сильнейшего. Советское государство, пропагандировавшее физическую культуру как форму общественной активности предложило и другое направление демонстрации физических качеств и навыков. Спартакиады, парады физкультурников, спортивные праздники для разных возрастных и профессиональных групп не

предполагали выбор сильнейших. В них все были равны и одинаково значимы. Такие мероприятия тщательно продумывались заранее. Репетировались отдельные выступления коллективов физической культуры разных предприятий и учреждений. Визуальное восприятие спортивных праздников должно было способствовать распространению и закреплению идеологии и основных принципов молодого советского государства. Декларативно было заявлено право всех народов на национальное самоопределение. Также утверждался тезис о преобладании классовых интересов над национальными и предопределенности социалистических революций во всех странах мира. Спорт – мог бы стать одной из объединяющих интернациональных форм взаимодействия рабочего класса.

23 июля 1921 г. была создана организация Красный спортивный интернационал (КСИ), как альтернатива Международному олимпийскому комитету, считавшемуся координатором буржуазного спорта. Высший совет физической культуры БССР призывал все кружки физкультуры обязательно подписаться на журнал «Пролетарский спорт», издаваемый Спортивным интернационалом [2, с. 3], а также отчислять взносы в пользу этой организации [5, с. 3].

Самое масштабное мероприятие проводимое под эгидой КСИ стала Первая Всесоюзная спартакиада, которая прошла в Москве с 12 по 24 августа 1928 г. Она стала грандиозным, но единственным в своем роде спортивным мероприятием, прошедшим в СССР до Второй Мировой войны. В ней участвовало 4040 советских физкультурников (из них 850 женщин) и более 600 иностранцев [1, с. 3]. В том же году с 17 мая по 12 августа проходила IX Олимпиада в Амстердаме, на которую впервые после Первой Мировой войны были приглашены спортсмены из Германии. Всего в ней участвовало 2883 человек, из них 277 женщин.

В программах обоих спортивных мероприятий были включены соревнования по искусству. На Олимпиаде в Амстердаме в данной категории было разыграно 11 комплектов наград (за лирику, драматургию, скульптуру, архитектурный дизайн, рисование и т.д.). На Всесоюзной спартакиаде в номинации «Искусства» подразумевались «Пляски и танцы», которые могли быть «гимнастическими или этнографическими» [3, с. 7].

Проведение международных Спартакиад должно было продолжится и стать традиционным. КСИ начал готовиться к следующей Спартакиаде в Берлине, приурочив ее к своему десятилетнему юбилею в 1931 г. Но, когда в столицу Германии съехались участники, германские

власти, предположили, что спортивные состязания могут перейти в политические демонстрации, и запретили ее проведение. До войны соревнования масштабов Спартакиады 1928 г. в СССР больше не проводились, организовывались лишь спортивные состязания на региональном или ведомственном уровне. А в 1937 г. был распущен и сам Спортивный интернационал.

II Всебелорусский съезд физкультурников, проходивший в ноябре 1925 г., принял постановление о необходимости изучения традиционных для белорусов подвижных игр и разработки спортивной терминологии на национальном языке [4, с. 3–4]. Считалось, что появление спортивного инструктора, свободно говорившего с подопечными на родном для них языке, будет способствовать приобщению сельской молодежи к занятиям в кружках физкультурников. Научное изучение национальных традиционных игр и танцев, должно было привести к созданию методик обучения и широкому распространению традиционной физической культуры в повседневной жизни граждан БССР. Такой подход был созвучен политике белорусизации, проводимой в республике в 1920-е гг.

«Бюллетень Высшего совета физической культуры БССР» выходил на русском языке. Журнал «Физкультурник», издавался с 1925–1926 г. как приложение к белорусскоязычной газете «Чырвоная змена», при этом в нем не было ни одной заметки на белорусском языке.

В 1930-е гг. интерес к национальной культуре в целом снижается и вопрос о реконструкции национальных подвижных игр или танцев официально не озвучивается. В 1937 г. произошла реорганизация Минского техникума физической культуры в Институт Физической культуры БССР. Учебные планы и программы, для нового учебного заведения были присланы из институтов физической культуры в Москве и Ленинграде. Научно-методические разработки, имевшиеся у педагогического коллектива Минского техникума физической культуры, остались не востребованными.

К Всесоюзным парадам физкультурников, проводимым с 1937 г., от каждой республики готовились танцевально-гимнастические выступления. Для подобных зрелищных мероприятий часто применялись костюмы, стилизованные под национальные, использовалась авторская музыка, созвучная национальной и элементы традиционных танцевальных движений. Общий парад народов СССР должен был иллюстрировать отсутствие межнациональных споров, равенство всех народов и их свободу в национальном культурном проявлении.

Физическая культура и спорт должна была органично влиться в быт и досуг советского человека, не зависимо от его социального положения и национальности. Причем участие в соревновательной деятельности должно было стать вторичным для массового спорта. Спортивные массовые зрелищные мероприятия должны были утверждать новую эстетику телесности советского человека, официальную политику интернационализма и демонстрировать объединение трудящихся всех национальностей для построения социализма.

## Список использованных источников и литературы

1 Асеев, Н. Спартакиада (Международный марш рабочих физкультурников) / Н. Асеев // Спартакиада. Бюллетень Организационного Комитета Спартакиады при ЦИК СССР. – 1928. – № 3. – С. 3–5.

2 Ближе к красному спортинтерну! // Чырвоная змена. – 1925. – 9 кастр. – С. 3.

3 Жаворонков. Пляска и танец на Спартакиаде / Жаворонков // Спартакиада. Бюллетень Организационного Комитета Спартакиады при ЦИК СССР. – 1928. – № 3. – С. 7–8.

4 Приспособимся к бытовым условиям. Занятия надо проводить на родном языке (о национальных моментах в физкультуре Белоруссии) // Чырвоная змена. – 1925. – 5 снеж. – С. 3–4.

5 Резолюция по докладу спортинтерна //Чырвоная змена. – 1925. – 22 ліст. – С. 3.

**УДК 21/.29(476.2)"20"**

**В. У. Старасценка**
(Магілёў, УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»)

## КАНФЕСІЙНАЯ СПЕЦЫФІКА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў КАНТЭКСЦЕ РЭЛІГІЙНАЙ ПРАСТОРЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

Як і ў Беларусі ў цэлым, у канфесійнай прасторы Гомельскай вобласці ў пачатку 1990-х гг. сфармаваўся феномен «рэлігійна-царкоўнага рэнесансу» [5, с. 37–65]. Яго найбольш значнай праявай, пры

супярэчлівым характары рэальнай рэлігійнасці грамадства [1; 4], стала істотнае павелічэнне колькасці рэлігійных арганізацый. Калі на пачатак 1991 г. на Гомельшчыне налічваліся 94 зарэгістраваныя рэлігійныя абшчыны [2, с. 236], то да 2020 г. іх колькасць узрасла ў 4,5 разы, да 422 [3, с. 63]. Станоўчая дынаміка росту, але пры яе істотным зніжэнні, захоўвалася і ў 2000-х гг. Калі на пачатак 2000 г. у рэгіёне дзейнічала 288 абшчын, то да 2020 г. іх колькасць павялічылася ў 1,5 разы [3, с. 63].

Разнастайнае рэлігійнае жыццё сучаснай Беларусі прадстаўлена ў Гомельскай вобласці 422 суполкамі 17 канфесій – большай часткі рэлігійных аб'яднанняў краіны (25 канфесій). На пачатак 2020 г. у рэгіёне дзейнічалі 305 культавых будынкаў і 31 будаваўся (у 2010 г. – 252 і 25), у рэлігійных структурах усіх канфесій быў заняты 441 святар (у 2010 г. – 420), функцыянавалі 5 абласных рэлігійных аб'яднанняў (Гомельская і Тураўская епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, Пінская дыяцэзія Рымска-каталіцкай царквы, Аб'яднанне Хрысціян веры евангельскай і Аб'яднанне Евангельскіх хрысціян-баптыстаў).

Рэлігійная структура сучаснай Гомельскай вобласці носіць ярка выражаны поліканфесійны характар з дамінаваннем арганізацый хрысціянскага тыпу. Пры гэтым, як і ў іншых рэгіёнах і ў рэспубліцы ў цэлым, адсутнічае абсалютная дамінаванне якой-небудзь адной канфесіі. Найбольш трывалыя пазіцыі па колькасці рэлігійных суполак займаюць чатыры канфесіі: Беларуская праваслаўная царква (БПЦ) (каля 57,11%), Хрысціяне веры евангельскай (ХВЕ) (каля 17,77%), Евангельскія хрысціяне-баптысты (ЕХБ) (каля 6,16%) і Рымска-каталіцкая царква (РКЦ) (4,74%). На астатнія 13 канфесій даводзіцца толькі каля 14% ад агульнай колькасці рэлігійных суполак у вобласці. Да хрысціянству ставяцца 12 напрамкаў з 17, абшчыны якіх маюць афіцыйную рэгістрацыю. Хрысціянскія канфесіі аб'ядноўваюць каля 97,38% зарэгістраваных у вобласці рэлігійных абшчын.

Адначасова захоўваецца высокая ступень стабільнасці канфесійнай структуры рэгіёну. За апошнія 20 гадоў афарміліся і прайшлі працэдуру дзяржаўнай рэгістрацыі толькі арганізацыі двух канфесій – месіянскіх абшчын (2002 г.) і мусульманскай рэлігіі (2004 г.). Найбольш заўважным з 2000 г. па 2020 г. быў рост суполак БПЦ (на 92 абшчыны), ХВЕ (на 22), ЕХБ (на 5), адвентыстаў (на 5), лютэранства (на 2), іудзейскай рэлігіі (на 3), месіянскіх абшчын (на 2). Скарацілася колькасць абшчын грэка-католікоў (з 2 да 1).

У 2000-х гг. захоўваюцца традыцыйныя рэгіянальныя асаблівасці рэлігійнай геаграфіі Беларусі. У параўнанні з большасцю іншых рэгіёнаў краіны Гомельшчына адрозніваецца менш выяўленай канфесійнай актыўнасцю. У прыватнасці, прадстаўленыя тут на пачатак 2020 г. рэлігійныя абшчыны складалі каля 12,45% ад іх агульнай колькасці ў Беларусі [3, с. 113]. Пры гэтым на тэрыторыі вобласці пражывала каля 14,7% насельніцтва краіны. Для параўнання: рэлігійныя арганізацыі Брэстчыны, наадварот, складаюць 22,57%, а насельніцтва – каля 14,3% ад рэспубліканскіх значэнняў. Саступае Гомельшчыне па дадзеным індэксе канфесійнай актыўнасці насельніцтва толькі Магілёўшчына (8,68% і 10,9% адпаведна).

У параўнанні з іншымі абласцямі Беларусі, выключаючы толькі Магілёўскую, у Гомельскай вобласці дзейнічае меншая колькасць культавых будынкаў і служыць менш святароў. Акрамя таго, большасць найбольш значных з дзеючых у рэгіёне канфесій мае ў канфесійнай структуры рэспублікі ўдзельную вагу, які саступае асераднёнаму рэгіянальнаму паказчыку (каля 14,3%). Так, абласныя абшчыны БПЦ займаюць каля 14,1%, РКЦ – каля 4,02% ад іх агульнай колькасці ў Рэспубліцы Беларусь, абшчыны ЕХБ – каля 9,3%, але грамады ХВЕ – каля 14,3%.

Параўнальная ступень рэлігійна-царкоўнай самадзейнасці насельніцтва ў абласцях Беларусі можа, нароўні з іншымі паказчыкамі, быць праілюстравана індэксам канфесійнай актыўнасці рэгіёнаў – суадносінамі колькасці насельніцтва да колькасці рэлігійных суполак. Калі ў сярэднім у Беларусі на адну зарэгістраваную суполку прыходзіцца 2,78 тысяч чалавек (дадзеныя на 1 студзеня 2020 г.), то ў Гомельскай вобласці – 3,29 тысяч, што з'яўляецца адным з самых нізкіх паказчыкаў у рэспубліцы. Так, на адну суполку ў Гродзенскай вобласці прыпадае 2,12 тысяч чалавек, у Віцебскай – 2,02, у Мінскай – 2,08, а ў Брэсцкай - 1,76 тысяч чалавек (гэта найбольш высокі паказчык у рэспубліцы). Найменшы паказчык канфесійнай актыўнасці сярод абласцей краіны ў Магілёўскай вобласці – 3,48 [3, с. 78].

За гады суверэнітэту Беларусі рэлігійнае жыццё гомельскага рэгіёну, як і рэспублікі ў цэлым, стала значна больш разнастайным. Грамадства зацікаўлена ў мірным суіснаванні розных рэлігій і іх прадстаўнікоў, што магчыма толькі на аснове верацярпімасці. Паважлівыя міжканфесійныя ўзаемаадносіны з'яўляюцца важным гарантам грамадзянскага міру і грамадскай згоды.

Табліца 1 – Канфесійная структура Гомельскай вобласці (па стане на 1 студзеня 2020 г.)

| № п/п | Канфесіі | Усяго суполак у рэспубліцы | Гомельская вобласць | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Коль-касць суполак у рэгіёне | % суполак канфесіі ў рэгіёне ад агульнай колькасці абшчын канфесіі ў рэспубліцы | % суполак канфесіі ад агульнай колькасці абшчын у рэгіёне |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Праваслаўная царква (БПЦ) | *1709* | 241 | 14,10 | 57,11 |
| 2 | Стараверская царква | *34* | 2 | 5,88 | 0,47 |
| 3 | Рымска-каталіцкая царква (РКЦ) | *498* | 20 | 4,02 | 4,74 |
| 4 | Каталікі лацінскага абраду | *1* | 0 | 0,00 | 0,00 |
| 5 | Грэка-каталіцкая царква (уніяты) | *16* | 1 | 6,25 | 0,24 |
| 6 | Армянская апостальская царква | *4* | 0 | 0,00 | 0,00 |
| 7 | Рэфармацкая царква | *1* | 0 | 0,00 | 0,00 |
| 8 | Прэсвітэрыянскай царква | *1* | 0 | 0,00 | 0,00 |
| 9 | Лютэранская царква | *25* | 4 | 16,00 | 0,95 |
| 10 | Хрысціяне веры евангельскай (ХВЕ) | *524* | 75 | 14,31 | 17,77 |
| 11 | Хрысціяне поўнага евангелля (ХПЕ) | *62* | 16 | 25,81 | 3,79 |
| 12 | Хрысціяне веры апостальскай (ХВА) | *11* | 0 | 0,00 | 0,00 |
| 13 | Евангельскія хрысціяне-баптысты (ЕХБ) | *281* | 26 | 9,25 | 6,16 |
| 14 | Адвентысты сёмага дня (АСД) | *73* | 12 | 16,44 | 2,84 |
| 15 | Сведкі Іеговы | *27* | 7 | 25,93 | 1,66 |

Працяг табліцы 1

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| 16 | Новаапостальская царква | *21* | 5 | 23,81 | 1,18 |
| 17 | Царква Хрыстова | *5* | 0 | 0,00 | 0,00 |
| 18 | Месіянскія абшчыны | *3* | 2 | 66,67 | 0,47 |
| 19 | Мармоны | *4* | 0 | 0,00 | 0,00 |
| 20 | Іудзейская рэлігія (артадаксальны іудаізм) | *38* | 7 | 18,42 | 1,66 |
| 21 | Прагрэсіўны іудаізм (Рэфармаваны іудаізм) | *15* | 1 | 6,67 | 0,24 |
| 22 | Мусульманская рэлігія | *24* | 1 | 4,17 | 0,24 |
| 23 | Бахаі | *5* | 1 | 20,00 | 0,24 |
| 24 | Крышнаіты | *6* | 1 | 16,67 | 0,24 |
| 25 | Будызм | *1* | 0 | 0,00 | 0,00 |
| | **Усяго** | **3389** | **422** | **12,45** | **100** |

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры

1 Дьяченко, О. В. Религиозный традиционализм и модернизм: в поисках смысла / О. В. Дьяченко // Религия и общество – 6 : сб. науч. статей / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2011. – С. 174–177.

2 История белорусской государственности. В 5 т. Т. 5. Национальная государственность на переломе эпох (вторая половина XX – начало XXI в.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома Н. В. Смехович ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларус. навука, 2020. – 759 с.

3 Старостенко, В. В. Религии в Республике Беларусь в статистическом измерении : справочник / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2021. – 144 с. : ил.

4 Старостенко, В. В. Религиозность в современной Беларуси: мифы и действительность / В. В. Старостенко // Проблемы и персективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф., 20–21 мая 2010 г., Могилев / редкол. : Ю. М. Бубнов (отв. ред.) [и др.] : В 2 ч. – Могилев : МГУП, 2010. – Ч. 1. – С. 334–337.

5 Старостенко, В. В. Религия и свобода совести в Беларуси : очерки истории : монография / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2011. – 272 с. : ил.

**УДК 94:316.422:338.2:32(476.2)"192/193"**

**М. И. Старовойтов**
(Гомель, УО «Гомельский государственный университет
имени Ф. Скорины»)

## ЭКОНОМИЧЕСКАЯ И ПОЛИТИЧЕСКАЯ ТРАНСФОРМАЦИИ НА ГОМЕЛЬЩИНЕ (1920–1930-Е ГОДЫ)

После дискуссий на IV съезде Советов СССР (апрель 1927 г.), на XV съезде ВКП(б) и при разработке заданий первой пятилетки удалось прийти к общему мнению. Стратегической задачей стал курс на развитие передовых отраслей экономики: машиностроения, энергетики, химической промышленности, металлургии, чтобы модернизировать как промышленность, так и сельское хозяйство.

Советский метод индустриализации базировался на решающей роли государства в экономике, волевых решениях партийно-советского руководства. Взаимосвязанные и взаимообусловленные экономические и политические трансформации вызвали значительные изменения во всех сферах жизнедеятельности СССР, БССР и обозначенного региона.

В результате второго укрупнения в состав БССР вошли Гомельский и Речицкий округа. Экономические и политические преобразования на Гомельщине (рассматривается как территория Гомельской и Полесской областей) проводились в общереспубликанском формате. Вместе с тем, масштаб этих изменений, на наш взгляд, не следует преувеличивать, особенно касаясь уровня индустриального развития. С учетом возможного объема публикации, остановимся на конкретных примерах, используя документы, к которым был ограничен доступ или они имели гриф секретности. Таблицы составлены и подсчитаны автором.

В середине 1920-х годов белорусская промышленность сохраняла ремесленно-кустарный характер. По данным ЦСУ БССР в 1925 г. на 40 тыс. промышленных предприятиях местного значения работало 56 тыс. человек, приходилось 2,8 тыс. механических двигателей. Только на 53 предприятиях насчитывалось более 30 рабочих. Эти показатели

«ярко рисуют карликовый размер предприятий…», которые на 95 % находились в частных руках [1, с. 239].

Белорусский регион в СССР оставался аграрным. Индустриализация по многим причинам проводилась медленно. Не являлась исключением и Гомельщина. По данным 1932 г. в районах, существовавших на Гомельщине после целого ряда административно-территориальных преобразований, вытекавших из задач оперативного экономического и политического управления, промышленные предприятия [*в документе названы крупные предприятия – М. С.*] представлены в таблице 1 [7].

Таблица 1 – Крупные предприятия и среднегодовое количество рабочих

| Районы | Эл. станции | Заводы | Фабрики | Комбинаты | Артели |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Брагинский | 1 | 1 | - | - | 3 |
| Рабочих | - | 28 | - | - | 114 |
| Б.Кошелевский | - | 1 | - | - | 1 |
| Рабочих | - | 26 | - | - | 36 |
| Ветковский | 1 | 2 | - | - | 7 |
| Рабочих | - | 26 | - | - | 1 061 |
| Гомельский* | 2 | 4 | 4 | 2 | - |
| Рабочих | - | 4 176 | 3 822 | 1 146 | - |
| Ельский | - | 2 | - | - | 4 |
| Рабочих | - | 104 | - | - | 204 |
| Житковичский | 3 | 1 | - | 1 | 1 |
| Рабочих | - | 83 | - | 38 | 44 |
| Жлобинский | 2 | 2 | - | 1 | 4 |
| Рабочих | - | 47 | - | 88 | 291 |
| Комаринский | - | 1 | - | - | 1 |
| Рабочих | - | 98 | - | - | 30 |
| Кормянский | 2 | 4 | - | - | 2 |
| Рабочих | - | 162 | - | - | 140 |
| Лельчицкий | 1 | 3 | - | - | - |
| Рабочих | - | 91 | - | - | - |
| Лоевский | 1 | 2 | - | - | 3 |
| Рабочих | - | 92 | - | - | 148 |
| Мозырский** | 1 | 4 | 1 | - | 2 |
| Рабочих | - | 934 | 259 | - | 182 |
| Наровлянский | 1 | - | 1 | - | 3 |
| Рабочих | - | - | 155 | - | 137 |
| Паричский | 1 | 2 | - | - | 3 |
| Рабочих | - | 119 | - | - | 110 |

Продолжение таблицы 1

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Петриковский | 1 | 5 | - | - | 4 |
| Рабочих | - | 658 | - | - | 228 |
| Речицкий | 1 | 4 | 1 | - | 4 |
| Рабочих | - | 1 143 | 1 709 | - | 424 |
| Рогачевский | 1 | 5 | 1 | - | 4 |
| Рабочих | - | 415 | 124 | - | 191 |
| Тереховский | 1 | 2 | - | - | 5 |
| Рабочих | - | 69 | - | - | 365 |
| Туровский | 1 | - | - | - | 2 |
| Рабочих | - | - | - | - | 88 |
| Уваровичский | 2 | 3 | - | - | 3 |
| Рабочих | - | 517 | - | - | 250 |
| Хойникский | 1 | 4 | - | - | 1 |
| Рабочих | - | 297 | - | - | 70 |
| Чечерский | - | 1 | - | - | 2 |
| Рабочих | - | 46 | - | - | 103 |

Примечание: (-) – сведения отсутствуют; *) – включена Добрушская фабрика «Герой труда»; включен Калинковичский лесопильный завод.

Наиболее крупные предприятия в основном были размещены в Гомеле, Добруше, Мозыре, Речице, на которых работало по 100 и более рабочих. Исключением являлся торфзавод «Большевик» (468 рабочих) в Уваровичском районе. Второй по величине торфзавод в БССР после Осинторфа. Абсолютное большинство заводов в районах – это винодельческие, лесопильные, торфоперерабатывающие, крахмальные заводы и льнозаводы. На них работало от 15 до 60 человек. Как видим, на Гомельщине преобладала не фабрично-заводская промышленность, а артельно-заводская.

Основным сдерживающим фактором развития промышленности был очень низкий уровень выработки и использования электроэнергии. Указанные в таблице 1 «крупные» электростанции являлись станции с мощностью 4 – 40 квт. Например, в Уваровичском районе было 2 электростанции: льнозавода № 29 (5 квт.) и винзавода (4,5 квт.), на которых было занято соответственно 30 и 19 рабочих. Рабочие торфзавода «Большевик» были заняты тяжелым ручным трудом, как и на всех подобного типа предприятиях. Значительная механизация этого предприятия была осуществлена только в конце 1930-х годов. Самые мощные электростанции находились в Гомеле (5 000 квт.), Добруше (4 850 квт.), Жлобине (железнодорожная 85 квт., городская – 45 квт.), Мозыре (225 квт.), Речице (103 квт.),

Рогачеве (195 квт.) [7]. В этих городах и были размещены крупные предприятия, а в Жлобине находился железнодорожный узел. На наш взгляд, применяемое в научной и учебной литературе понятие «крупное предприятие» требует иной классификации. Это позволит дать адекватную оценку уровню индустриального развития в межвоенный период как БССР, так и регионов/областей.

В 1930-е гг. на Гомельщине продолжалось индустриальное развитие и была завершена коллективизация сельского хозяйства. Развитие промышленности сдерживалось медленным развитием электроэнергетики. Более низкий уровень развития промышленности, прежде всего, в Полесской области, объясняется не только природно-сырьевыми факторами, но и политическими соображениями. БССР входила в широкую пограничную полосу СССР и по «стратегическим соображениям» крупное промышленное производство здесь не развивалось, что особенно коснулось Мозырщины [подробнее 12]. В июне 1935 г. был восстановлен Мозырский округ (пограничный), который стал основой создания в январе 1938 г. Полесской области.

Коллективизация решала не только экономические проблемы, но и сформировала новый класс – колхозное крестьянство, что значительно укрепила политические основы Советской власти на селе.

Таблица 2 – Количество занятых в производственных отраслях в 1939 г. (абсолютное число и %)

| Отрасли народного хозяйства | БССР | | Гомельская область | | Полесская область | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Абс. | % | Абс. | % | Абс. | % |
| Промышленность | 313 353 | 100 | 63 259 | 20,2 | 16 882 | 5,4 |
| Сельское хозяйство | 1 678 077 | 100 | 255 652 | 15,2 | 251 800 | 15,0 |
| Лесное хозяйство | 40 440 | 100 | 4 071 | 10,1 | 9 382 | 23,2 |
| Строительство | 91 033 | 100 | 15 195 | 16,7 | 7 920 | 8,7 |
| Транспорт и связь | 87 281 | 100 | 20 108 | 23,0 | 6 645 | 7,6 |

Из таблицы 2 [подсчитано по: 2, л. 26; 3, л. 5; 4, л. 45; 5, л. 3; 8, л. 42; 9, л. 3] видно, что абсолютное большинство населения было занято в сельском хозяйстве. Например, рабочих в промышленности БССР насчитывалось 210 730 человек [3, л. 5]. Из них в Гомельской области – 44 625 человек или 21,2 % [5, л. 3], в Полесской области – 8 919 человек (4,2 %) [9, л. 3].

Трансформация в направлении крупного промышленного производства к концу 1930-х годов особых результатов на Гомельщине не дала. Из данных правительства БССР вытекает, что в межвоенный период промышленное развитие республики базировалось «главным образом, на использовании местных энергетических и сырьевых ресурсов (торф, лес, сельхозсырье и ископаемые). Вместе с тем, за этот период была создана значительная производственная база для машиностроительной и станкостроительной промышленности и отраслей по выработке изделий широкого потребления и продуктов питания» [13, с. 5]. В отраслевой структуре промышленности БССР удельный вес металлообрабатывающей составил в 1940 г. 16,8 %, лесозаготовки и переработка лесосырья – 25,8 %, пищевкусовой – 10,5 %, текстильной, швейной и кожобувной – 27,9% [13, с. 5], в Гомельской области соответственно – 20,2 %, 23,6 %, 30,0 % и 10,8 % [10, с. 4]. В Полесской области был самый низкий уровень индустриального развития в БССР. Валовая продукция металлообработки составила 8,7 %, на лесозаготовку, лесосплав и деревообработку приходилось 41,2 %, пищевкусовая дала 32,0 % и торфодобывающая – 5,4 %. Из крупных объектов следует выделить ввод в 1940 г. в Мозыре электростанции на 1,5 тыс. квт. [11, с. 4, 5].

В областях по-прежнему преобладали мелкие предприятия и артели промкооперации. Промышленность развивалась в основном на местных сырьевых ресурсах. В 1940 г. в Гомельской области промышленность насчитывалось 4 918 крупных и мелких предприятий с общей численностью рабочих 56 045 человек [10, с. 4]. В Полесской области было 5 299 предприятий и 23 641 рабочих [11, с. 3]. Из 10 217 предприятий Гомельщины только несколько десятков можно было отнести к крупным заводам, фабрикам и комбинатам (хрестоматийно известные), которые действовали в Гомеле, Добруше, Речице.

Экономическая трансформация привела к политической трансформации общества – росту численности рабочих и заложила основу индустриальному развитию Гомельщины, которое произошло в послевоенный период.

Не только экономические изменения, но и политическая трансформация наблюдалась в рассматриваемом регионе. Поиск оптимального уровня административно-территориального устройства, совершенствование партийно-государственной системы управления приводил к частым административно-территориальным преобразованиям, как в БССР, так и на Гомельщине. Эти и другие аспекты

подробнее рассмотрены в монографии С. А. Елизарова [6]. Политика белорусизации, хотя и носила лозунгово-пропагандистский характер в регионе, как и во всей республике, но сыграла положительную роль в самоидентификации белорусского населения, росте его уровня грамотности и образования, о чем автор уже писал.

Экономическая и политическая трансформации существенным образом повлияли на изменения социально-классового состава населения Гомельщины, количественная и качественная характеристика которого может стать предметом специального исследования.

## Список использованных источников и литературы

1 Белорусская Советская Социалистическая Республика. – Минск : СНК БССР, 1927. – 528 с.

2 Белорусская ССР // Российский государственный архив экономики (РГАЭ). – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 257.

3 Белорусская ССР // РГАЭ. – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 429.

4 Гомельская область // РГАЭ. – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 376.

5 Гомельская область // РГАЭ. – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 548.

6 Елизаров, С. А. Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919 – 1991 гг.) / С. А. Елизаров. – Гомель : ГГТУ им. П.О. Сухого, 2009. – 222 с.

7 Картатэка раёнаў БССР 1932 г. Не падлягае агалашэнню. – Мінск : Нар.-гас. учот БССР, 1933. – без стр.

8 Полесская область // РГАЭ. – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 380.

9 Полесская область // РГАЭ. – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 552.

10 Состояние народного хозяйства и культурного строительства Гомельской области Белорусской ССР к началу Отечественной войны. ДСП № 87. – Минск : СНК БССР, 1942. – 34 с.

11 Состояние народного хозяйства и культурного строительства Полесской области Белорусской ССР к началу Отечественной войны. ДСП № 199. – Минск : СНК БССР, 1942. – 30 с.

12 Старовойтов, М. И. Население пограничной полосы БССР в 1939 году / М. И. Старовойтов // Восень 1939 года ў гістарычным лесе Беларусі : матэр. міжнар. навук.-практ. канф. / рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2010. – С. 206–216.

13 Статистический справочник состояния народного хозяйства и культуры Белорусской ССР к началу Великой Отечественной войны. ДСП. – Минск : СНК БССР, 1943. – 230 с.

УДК 94:364.2:316.334.56(476)"194/195"

**А. В. Сумко**
(Полацк, УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»)

# КУЛЬТУРА ЖЫЦЦЕЗАБЕСПЯЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПАВАЕННАЙ ВЁСКІ: ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ

Пасляваенная рэчаіснасць – гэта складаны і драматычны час у этнічнай гісторыі беларусаў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны беларуская вёска знаходзілася ў цяжкім стане і перыяд аднаўлення расцягнуўся амаль на дзесяцігоддзе з моманту вызвалення рэспублікі ад нацыстаў. Нягледзячы на адносна невялікія храналагічныя межы, гэта быў шмат у чым вырашальны перыяд у гісторыі, звязаны са зменамі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага характару. Для ўсходніх раёнаў Беларусі – гэта перыяд пасляваеннага аднаўлення сельскай гаспадаркі і калгаснай сістэмы, для заходніх – паступовая ліквідацыя аднаасобных гаспадарак і пераход да прымусовай калектывізацыі ў канцы 1940-х гг., што суправаджалася разбурэннем традыцыйнага сялянскага ладу жыцця. У цэнтры гэтых падзей знаходзіўся чалавек, які спрабаваў адаптавацца да складаных, а іншы раз экстрэмальных абставінаў, рэалізаваць увесь свой патэнцыял дзеля выжывання і стварэння прымальных жыццёвых умоў для ўласнай сям'і. Пры гэтым, як паказвае аналіз крыніц, выкарыстоўваліся традыцыйныя практыкі жыццезабеспячэння, якія пастаянна рэалізуюцца этнасам, як толькі падыходзіць крызісны час. Напрыклад, палявыя матэрыялы пра пасляваеннае жабрацтва сведчаць пра пераемнасць мадэляў паводзін, прынятых у субкультуры дарэвалюцыйных жабракоў і ўзнаўленне традыцый этнічнага вопыту выжывання ў неспрыяльных умовах [1]. Суадносіны стратэгій і адаптыўных практык сярод вясковага насельніцтва ў паваенны час адрозніваліся ў залежнасці ад лакацыі населенага пункта: размяшчэнне ў “зоне бедства” (спустошаныя і спаленыя вёскі ў выніку карных экспедыцый) ці “зоне адноснай стабільнасці” (ступень разбурэння нязначнае ці ўвогуле адсутнічала); калектывізаваны раён ці адзінаасобны сектар; прыродна-кліматычныя ўмовы (спецыфіка ландшафту / глебы) і месцараспалажэнне (паблізу ці ўдалечыні ад горада, буйнога мястэчка, чыгуначных станцый).

Комплекснае вывучэнне складанай даследчай праблемы як жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі вымагае палідысцыплінарнага

падыходу (калі ўлічваюцца дасягненні, метадалогія і тэарэтычныя мадэлі этналогіі, этнадэмаграфіі, эканамічнай і сацыяльнай гісторыі і інш.) і выкарыстанне шырокага кола крыніц: архіўныя дакументы, фотаматэрыялы, этнаграфічныя крыніцы і, у першую чаргу, матэрыялы вуснай гісторыі. На сённяшні момант назапашаны значны аб'ём вуснагістарычных крыніц, якія захоўваюцца ў асабістых архівах ці архівах грамадскіх і навуковых устаноў, онлайн сховішчах. Успаміны ўдзельнікаў ці відавочцаў падзей шматпланавыя і разнастайныя, яны даюць магчымасць зразумець, як этнічны вопыт гаспадарчых практык быў рэалізаваны ў пасляваенны час, якія рэсурсы выкарыстоўвалі для аднаўлення сваёй гаспадаркі, як успрымалася сельскім насельніцтвам Заходняй Беларусі сацыяльна-эканамічныя трансфармацыі, як мяняліся ментальныя ўстаноўкі, каштоўнасныя арыенціры вясковага насельніцтва ў цэлым. У гэтым рэчышчы перспектыўным з'яўляецца антрапалагічны падыход да вывучэння гаспадарча-эканамічных аспектаў этнічнай культуры, які вельмі добра рэалізуецца праз даследаванне культуры жыццезабеспячэння, пад якой разумеецца не толькі вывучэнне такіх класічных кампанентаў, як жыллёва-пасяленчы комплекс, адзенне і сістэма харчавання, але і комплексны аналіз стратэгій і практык жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі. Пры гэтым гаворка ідзе не толькі аб стварэнні ці аднаўленні матэрыяльнай базы жыццезабеспячэння, промыслах, рамёствах, але і пэўнай сістэме анталагічных каштоўнасцяў, якія праецыраваліся на сферу народнай педагогікі, медыцыны і, нават, на абрадавыя практыкі і фальклор. Такім чынам, *культуру жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі можна вызначыць як сукупнасць гаспадарчых і сацыяльных практык, навыкаў і ведаў, якія дазволілі забяспечыць жыццяздольнасць калектыву, былі абумоўлены і знаходзіліся ў цеснай ўзаемасувязі з геакліматычнымі асаблівасцямі этнічнай тэрыторыі, сацыяльнай арганізацыяй і ўзроўнем гістарычнага развіцця народа і яе асобных частак.*

Культура жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі ў якасці прадмету даследавання не разглядалася. У айчыннай гістарыяграфіі вывучаліся толькі пэўныя аспекты жыццядзейнасці беларускай вёсцы ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Этнографы разглядалі пасляваенную вясковую рэчаіснасць як складовую частку пэўнага прадмета даследавання, пераважна ў кантэксце трансфармацыі сацыяльна-бытавых умоў жыцця, асвятлення традыцыйнай матэрыяльнай беларускай культуры [2], традыцый харчавання [3, 4], традыцыйных уяўленняў беларусаў аб раслінным свеце [5] і інш.

Пэўная колькасць прац, прысвечаных стану беларускай вёскі, выйшла ў савецкі час. Сярод іх трэба адзначыць манаграфію А. П. Белязо “Беларуская вёска ў пасляваеныя гады (1945 – 1950 г.)”, у якой аўтар адзначаў, што на фоне цяжкага матэрыяльна-бытавога становішча “ў жыццё беларускай вёскі вярнулася далёкае мінулае і сялянства зноў вымушана было карыстацца такімі прадметамі, як рагаціна і лучына” [6, с. 18]. Для рэканструкцыі вобраза пасляваеннай вёскі аўтар выкарыстоўваў архіўныя дакументы і даступныя на той час успаміны сведкаў падзей, якія дэманстравалі цяжкасці вясковай рэчаіснасці, але разам з тым у манаграфіі не раскрыты пытанні, звязаныя са стратэгіямі і практыкамі выжывання. Большасць гісторыкаў звярталіся да паваеннай вёскі ў межах даследавання савецкай аграрнай палітыкі. На сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі гэты накірунак зноў актуалізаваўся ў даследаваннях М. У. Смяховіча. Яго манаграфія “Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943 – 1991 гадах: этапы развіцця, дасягненні, вопыт” – праца пабудаваная на падставе пераважна архіўных матэрыялаў, у якой разглядаецца дзейнасць партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР па рэалізацыі асноўных мэт аграрнай палітыкі ў пэўны гістарычны перыяд, характарызуецца становішча ў галіне арганізацыі і аплаты працы калгаснага сялянства [7]. У апошнія гады ўвагу даследчыкаў прыцягваюць сюжэты, звязаныя з гісторыяй паўсядзённасці, у межах якой разглядаюцца пытанні, так ці інакш звязаныя са спецыфікай жыццядзейнасці беларускай пасляваеннай вёскі [8, 9, 10].

Вельмі актыўна сучасныя гісторыкі ўводзяць у навуковы зварот матэрыялы вуснай гісторыі. Адной з першых спроб паказаць гісторыю Беларусі скрозь прызму вусных успамінаў звычайных вясковых жыхароў з’яўляецца кніга Вольгі Івановай “Прамоўленая гісторыя: XX ст. у памяці жыхароў беларускай вёскі” [11].

Такім чынам, з аднаго боку мы маем пэўную колькасць навуковых прац, якія разглядаюць асобныя аспекты жыццядзейнасці беларускай вёскі і значнае кола крыніц, якія могуць дапаўняюць адзін аднаго, а з другога – акрэсленую даследчую праблему, якая патрабуе комплекснага вывучэння. Даследаванне праблематыкі жыццезабеспячэння вёскі з улікам гісторыка – культурных асаблівасцяў рэгіёнаў Беларусі і спецыфікі іх развіцця ў пасляваенны перыяд прадстаўляецца перспектыўным ракурсам этнічнай культуры ў цэлым і можа выступаць як асобны прадмет даследаванняў. Да цяперашняга часу па-за межамі ўвагі застаюцца пытанні прысвечаныя экстрымальнай гастраноміі і вясковай сістэме харчавання ў паваенны час; аднаўленню жыллёвага комплексу і суадносін традыцый даваеннага часу з магчымасцямі пасляваеннага

перыяду; стратэгіям і адаптыўным практыкам будзённага жыцця ў складаных эканамічных умовах; спадарожным кампанентам культуры жыццезабеспячэння – прадметы хатняга ўжытку, гігіена, пасляваенная медыцына. Гэта падкрэслівае актуальнасць і навуковую запатрабаванасць азначанай тэмы.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1 Сумко, А. В. Пасляваеннае жабрацтва ў дыскурсе вуснай гісторыі Віцебшчыны / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2020. – № 9. – С. 142–147.

2 Цітоў, В. С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

3 Новогродский, Т. А. Хлеб в традиционной культуре белорусов в XIX – нач. XX в. / Т. А. Новогродский // Хлеб в народной культуре : Этнографические очерки. – М. : Наука, 2004. – С. 173 – 177.

4 Навагродскі, Т. А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стагоддзях / Т. А. Навагродскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2015. – 243 с.

5 Шумскі, К. А. Традыцыйныя веды беларусаў аб раслінным, жывёльным свеце і надвор'і (XIX – пачатак XXI ст.) і іх экалагічная значнасць / К. А. Шумскі. – Мінск : Права і эканоміка, 2009. – 126 с.

6 Белязо, А. П. Беларуская вёска ў пасляваеныя гады (1945–1950 г.) / А. П. Белязо. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1974. – 176 с.

7 Смяховіч, М. У. Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943 – 1991 гадах: этапы развіцця, дасягненні, вопыт. / М. У. Смяховіч ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 439 с.

8 Тимонова, А. В. Крестьянство на освобожденной территории БССР (сентябрь 1943 – май 1945 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.01 / А. В. Тиманова; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 2011. – 25 с.

9 Шумскі, Ян. Саветызацыя Заходняй Беларусі (1944–1953 гг.) / Ян Шумскі. – Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2012. – 362 с.

10 Kashtalian, Iryna. The Repressive Factors of the USSR's Internal Policy and Everyday Life of the Belarusian Society (1944–1953) / Iryna Kashtalian. – Wiesbaden : Harrassowitz Verlag, 2016. – 345 s.

11 Іванова, В. Прамоўленая гісторыя: XX ст. у памяці жыхароў беларускай вёскі / В. Іванова. – Мінск : Зміцер Колас, 2018. – 448 с.

УДК 94:322:279.15:277.4(47+57)"192/193"

**В. В. Сушко**
(Брест, УО «Брестский государственный технический университет»)

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ РЕЛИГИОЗНЫХ ОБЪЕДИНЕНИЙ ХРИСТИАН ВЕРЫ ЕВАНГЕЛЬСКОЙ И ЕВАНГЕЛЬСКИХ ХРИСТИАН-БАПТИСТОВ В УСЛОВИЯХ СОВЕТСКОГО РЕЛИГИОЗНОГО ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВА В ПЕРИОД 1920-1930-Х ГОДОВ

Период 1920-1930-х гг. ознаменовался формированием и становлением общественных сфер советского государства, которые базировались на соответствующей коммунистической идеологической платформе. Преобразования, которые осуществлялись в советском обществе, были направлены и на построение новых, значительно отличавшихся до 1917 г., государственно-религиозных взаимоотношений. В первую очередь, это выразилось в противостоянии государственных властных структур со священнослужителями и верующими религиозных конфессий, причиной которой была атеистическая пропаганда. Такая политика была вызвана тем, что конфронтация с религией представляла один из путей классовой борьбы пролетариата с капитализмом.

Тем не менее, число верующих в СССР и в БССР, в частности, было достаточно велико, полностью исключить деятельность религиозных организаций было не возможно и существовал риск народных волнений. Таким образом, для контроля за религиозными организациями, проводимой ими работой, начала разрабатываться и применяться соответствующая нормативно-правовая база, регулирующая вопросы государственно-религиозных взаимоотношений. Были созданы общесоюзные, республиканские и местные комитеты по делам религиозных культов, в компетенцию которых входили административные контролирующие функции, направленные на всестороннее наблюдение за деятельностью религиозных объединений.

Первым документом, который регламентировал условия деятельности и взаимоотношения религиозных организаций с государственными структурами явился декрет от 23 января 1918 г. СНК РСФСР «Об отделении церкви от государства и школы от церкви». Позже, в 1922 г., соответствующий декрет был ратифицирован и СНК БССР. Данные законодательные акты очерчивали правовые нормы деятельность религиозных общин и групп, взаимоотношения государства

и церкви. Основные концептуальные положения декретов можно представить следующим образом:

1. Отделение в пределах государства церкви от государства;
2. Отделение школы от церкви;
3. Обучение основам религии могло осуществляться толь частным образом;
4. Все имущество церковных и религиозных обществ объявляется народным достоянием. Здание и предметы для богослужения сдаются в пользование религиозным общинам по договору, при этом количество верующих не должно быть менее 50-ти человек;
5. Церковные религиозные общества были лишены прав юридических лиц;
6. Никто из граждан не мог быть освобожден от обязанностей по причине религиозных убеждений;
7. Ведение актов гражданского состояния было закреплено исключительно за органами власти [2].

Как правило, на практике повсеместно существовало вмешательство в дела церкви со стороны государственных властных структур, так как целью богоборческой компании в советском государстве было построение атеистического общества, даже ценой разрушения сложившихся духовных традиций.

Тем не менее, первые годы после Октябрьской революции 1917 г. ознаменовались активизацией процесса создания на территории белорусских земель церквей поздних протестантских деноминаций. Религиозны общины и группы христиан веры евангельской (пятидесятники), евангельские христиане-баптисты, адвентисты седьмого дня, христиане в духе апостольском, христиане евангельской веры, субботствующие пятидесятники и др. основывались, преимущественно, на территории юго-западных, юго-восточных, центральных земель Беларуси.

На этапе становления советской власти пятидесятничество, баптизм и другие деноминации позднего протестантизма получили возможность свободного развития, так как представители власти считали возможным привлекать верующих для внешнеполитической работы (разведка, шпионаж).

Образованный в 1921 г. в США Всемирный союз ХВЕ (Пантекостал) и ряд других западноевропейских центров пятидесятников оказывали всевозможную поддержку своим единоверцам по всему миру, в том числе и в Советском государстве (ежемесячные суммы могли составлять от 100 до 400 долларов США).

Наиболее интенсивно распространялось пятидесятничество и в Западной Беларуси, преимущественно в Брестском регионе. Этому

способствовало то, что в годы Первой мировой войны территория была оккупирована немецкой армией, и население имело возможность познакомиться с «новой верой». Относительно быстрому распространению протестантских церквей содействовала миссионерская деятельность заграничных организаций, отдельных проповедников, которые поддерживали их материально и духовно. Но с 1924 г. их деятельность была запрещена. Тем не менее, большую поддержку продолжали оказывать американские миссионеры.

Местом распространения движения пятидесятников вначале 1920-х гг. становится г. Пружаны. Увеличивалось число пятидесятников на Полесье, где первые общины возникли в 1924 г. Через десять лет приверженцы этой церкви составляли там 3794 человек, в том числе в Пинском повете – 894, в Столинском – 409 [1, с. 213].

В Витебске в 1914 г. под руководством Г. Шенгарда была основана община евангельских христиан и баптистов. Проводимая им работа позволила популяризировать новое религиозное направление: был создан хор, регулярно проводились молитвенные собрания в частном доме организатора и т. п. В то же время в городе действовала религиозная организация «Синий крест», в которую входили православные, лютеране, католики. Однако под влиянием разногласий и высылки Г. Шенгарда в Архангельскую губернию, в 1920 г. группа распалась на две: ЕХБ и евангельские христиане. Таким образом, общину ЕХБ возглавил М. Евдокимов, присланный Московским союзом [1, с. 193]. На Витебщине 1920-е гг. были насыщены в плане развития евангелизации: в 1922 г. был образован губернский евангельский союз, в 1924 г. проведены курсы регентов. В 1918 г. официальный статус получила группа баптистов в г. Могилеве, а в течение 1922–1924 гг. в регионе было образовано около 8 общин.

Представители баптизма и пятидесятничества не ставили себе цель противостоять принципам организации и уклада советского общества, а наоборот стремились приспосабливаться к его новым к условиям. Большинство идеологов евангельских христиан-баптистов и христиан веры евангельской (П. В. Павлов, М. Д. Тимошенко, П. Винс) выступали за лояльное отношение к большевистской власти, хотя нередко призывали к открытому противостоянию. В этом и заключается основная причина относительно устойчивого дальнейшего существования данной деноминации в СССР и БССР в частности.

Первоначальное лояльное отношение со стороны советской власти объяснялось тем, что верующие баптисты, пятидесятники, как и все представители позднего протестантизма, рассматривались как потенциальные лица для разведывательной работы и шпионажа в пользу

СССР. Причиной этой позиции руководящих органов было то, что координирующие религиозные центры поздних протестантских деноминаций находились на территории США и Великобритании. Однако, значительное возрастание общин и групп церквей позднего протестантизма в течение первой половины 1920-х гг. вызывало обеспокоенность властных структур, так как увеличение численности религиозных верующих противоречило идеалам построения атеистического советского общества. Учитывая это обстоятельство, во второй половине 1920-х – 1930-х гг. советское правительство ставит задачу пресечения процесса быстрого распространения сектантства (к нему причислялись все деноминации позднего протестантизма), которое всё больше находило приверженцев в молодежной среде.

В целях совершенствования законодательных актов, регулирующих государственно-религиозные отношения, совершенствования контроля за деятельностью религиозных организаций и ответственности за нарушения законов священнослужителями и верующими, 8 апреля 1929 г. было принято постановление ЦИК РСФСР «О религиозных объединениях». Постановление запрещало любые виды религиозной деятельности за пределами церквей. Верующим и священнослужителям было запрещено создавать группы по изучению религии, а также специальные детские, юношеские и женские молитвенные и иные собрания. Постановление жёстко регламентировало религиозную практику священников, направленную на взаимодействие с верующими вне религиозных культовых зданий. Так, например, нельзя было навещать тяжело больных и умирающих прихожан, осуществлять крещения или отпевания на дому. На всё многообразие видов религиозной деятельности необходимо было получать официальное разрешение местных органов власти и представлять отчёт о деятельности в контролирующие структуры.

В течение 1930-х гг. основными центрами распространения и сосредоточения пятидесятников и баптистов на территории БССР стали Могилевщина и Минщина. Не смотря на ужесточение советского религиозного законодательства, часть групп и общин верующих продолжала официально осуществлять религиозную практику. Но большинство представителей христиан веры евангельской и евангельских христиан-баптистов выбрали путь нелегального существования, так как законодательство не позволяло в полной мере проводить миссионерскую, просветительскую, пасторскую, социальную работу священнослужителям с верующими [3, с. 27-28].

Таким образом, в период 1920–1930-х гг. советское правительство изначально, относительно лояльно, рассматривало религиозную деятельность христиан веры евангельской и евангельских христиан-баптистов, так как предполагало использование верующих в разведывательной работе, учитывая их связи с зарубежными религиозными центрами. Но в условиях атеистического общества все больше укоренялась борьба с религиозными вероучениями, пятидесятники и баптисты чаще использовали нелегитимные методы осуществления своей работы, что привело к ухудшению взаимоотношений государства и верующих. Законодательная система в СССР в области свободы совести не могла в полной мере обеспечить соблюдение прав верующих, так как многие статьи соответствующих документов противоречили осуществляемой религиозной практике представителей позднего протестантизма, что обусловило конфронтационные отношения между государством и последователями баптизма и пятидесятничества.

**Список использованных источников и литературы**

1 Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.] ; пад рэд. У. І. Навіцкага. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

2 О религии и церкви : сб. высказываний классиков марксизма-ленинизма, документов КПСС и Совет. государства / сост. : А. М. Залесский, Т. Г. Купченя. – Минск : Беларусь, 1983. – 128 с.

3 Сушко, В. В. Возникновение и основные формы деятельности церкви евангельских христиан-баптистов на белорусских землях / В. В. Сушко // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2. Гісторыя, Эканоміка. Права. А. М. Сендзер (гал. рэд.). – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2020. – С. 27–32.

**УДК 94:330.342.2(476)"192/193"**

**В. У. Цацарын**
(Гомель, УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ Ў БССР

Напрыканцы 1925 г. ў Маскве праходзіў XIV з'езд УКП(б). Сярод пытанняў, якія на ім абмяркоўваліся, важнае месца займала праблема развіцця савецкая прамысловасці. Таму традыцыйна дадзены з'езд лічыцца пачаткам індустрыялізацыі ў Савецкім Саюзе.

Сярод пунктаў рэзалюцыі і далейшых планаў развіцця краіны, што былі сфармуляваны на з'ездзе, можна вылучыць наступныя. Як стратэгічны план развіцця СССР разглядаўся пункт "в)" "Рэзалюцыі": "Весці эканамічнае будаўніцтва з такога пункта гледжання, каб СССР з краіны, якая ўвозіць машыны і абсталяванне, ператварыўся ў краіну, якая вырабляе машыны і абсталяванне, каб такім чынам СССР у абстаноўцы капіталістычнага наваколля зусім не мог ператварыцца ў эканамічны прыдатак капіталістычнай сусветнай гаспадаркі, а ўяўляў сабой самастойную эканамічную адзінку, якая ладзіцца па-сацыялістычнаму і здольная дзякуючы свайму эканамічнаму росту служыць магутным сродкам рэвалюцыязавання рабочых усіх краін і прыгнечаных народаў калоній і паўкалоній" [1, с. 427]. Такім чынам, ідэя сусветная пралетарскай рэвалюцыі зусім не была знята з павесткі. Наадварот, яна прапісвалась як адзін з галоўных момантаў планаваўшайся індустрыялізацыі эканомікі СССР. Развіццё Саюза павінна было праводзіцца не толькі для таго, каб палепшыць сітуацыю ўнутры краіны, дабрабыт простых савецкіх людзей, таго ж рабочага класу, ад імя якога выступала УКП(б), але і дзеля стварэння ўзору для пралетарыяў і прыгнечаных класаў іншых дзяржаў свету.

Агульным месцам гістарычных даследванняў, якія датычаць савецкай індустрыялізацыі, з'яўляецца сцверджанне, што асноўную ўвагу аддавалі развіццю цяжкай індустрыі. Адзначаецца гэта і ў прадмове да ўзгадваўшайся "Рэзалюцыі": "З'езд адобрыў курс ЦК на забеспячэнне пераважнага развіцця цяжкай індустрыі, хуткага росту вытворчасці сродкаў вытворцасці" [1, с. 424].

Аднак гэтаісцінна для агульнага курса індустрыялізацыі Савецкага Саюза ў цэлым. Асаблівасці рэгіёнаў ўлічваліся. І гэта таксама адзначаў з'езд. Па-першае, адзначалася паспяховасць праводзіўшагася ў папярэднія гады эканамічнага раяніравання, дзякуючы якому савецкая ўлада "пачала падводзіць матэрыяльна-гаспадарчы базіс пад вобласці, аўтаномныя і савецкія рэспублікі" [1, с. 426]. Менавіта таму, хутчэй за ўсё, а таксама ўлічваючы агульную не вельмі добрую эканамічную сітуацыю ў СССР, сярод задач на бягучую пяцігодку з'езд пазначыў, у прыватнасці, такія. "Разгортваць нашу сацыялістычную прамысловасць на аснове падвышанага тэхнічнага ўзроўню, аднак у строгай адпаведнасці як з ёмкасцю рынка, так і з фінансавымі магчымасцямі дзяржавы" [1, с. 429]. Такім чынам, прапаноўвалася ўлічваць эканамічны складальнік пры планаванні развіцця галін эканомікі. Магчыма, таму і ўласна планы на першую пяцігодку былі прыняты даволі сціплыя, калі параўноўваць з больш познімі перыядамі (пры гэтым, канешне, трэба

ўлічваць і слабасць развіцця індустрыі, якая дасталася ў спадчыну ад Расійскай імперыі – яе практычна не існавала). Па-другое, прапаноўвалася "ў поўнай меры садзейнічаць развіццю савецкай мясцовай прамысловасці (раён, акруга, губерня, вобласць, рэспубліка), усяляк стымулюючы мясцовыя ініцыятывы ў справе арганізацыі гэтай прамысловасці, разлічанай на задавальненне разнастайнейшых патрэб насельніцтва ўвогуле, сялянства асабліва" [1, с. 429].

Пільная ўвага да сялянства можа быць патлумачана двума момантамі. Па-першае, З'езд шмат увагі ўдзяляў пытанням развіцця вёскі, каапераціі і калектывізацыі, праводзіўшайся на той час. Прапісвалася, у прыватнасці, недапушчальнасць падыходаў, характэрных для часоў ваеннага камунізму; неабходнасць прыцягнення бядняцка-серадняцкага слою вёскі да ўсведамлення сацыялістычных ідэй і практыкі і г.д. Па-другое, адзначалася, што празмернае захапленне нэпам, прывяло да павелічэння ў абсалютных лічбах долі недзяржаўнай эканомікі, якая стала актыўна пранікаць у вёску, арыентуючыся на патрэбы кулакоў. Менавіта гэтай сітуацыі, напэўна, і супрацьпастаўлялася тэндэнцыя ўліку пры планаванні развіцця прамысловасці на месцах сялянскіх інтарэсаў, што асобна падкрэслівалася. І рэалізацыю гэтага пакідалі мясцовым кіраўнікам, лічачы, напэўна, што ім патрэбы і асаблівасці насельніцтва вядомы і бачны лепш.

На гэтыя рашэнні магло абаперціся кіраўніцтва БССР пры планаванні і рэалізацыі развіцця эканомікі. Даследчыкі адзначаюць стрыманую пазіцыю ў дачыненні перспектыў індустрыяльнага развіцця БССР. Галоўнымі фактарамі, якія перашкаджаюць бурнаму росту цяжкай прамысловасці называлі адсутнасць прыродных рэсурсаў (тых жа вугалю, металічных руд і інш.) і маларазвітасць падобных галін. Калі і былі фабрыкі і заводы, то іх патрэбна было пераабсталёўваць, на што сродкаў катастрафічна не хапала. Таму ўпор прапаноўвалася зрабіць на развіццё перапрацоўваючай вытворчасці, якая працавала б на мясцовай сыравіне, перш за ўсё, сельскагаспадарчай і лясной [2, с. 51]. У гэтым жа накірунку працавалі і навукоўцы накшталт А. Смоліча.

Вядома пазіцыя народнага камісара земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпава. Ён ездзіў у Данію ў 1927 г. і ўсяляк імкнуўся выкарыстаць досвед развіцця гэтай краіны. Галоўным чынам гэта датычыла сельскай гаспадаркі.

У другой палове XIX ст. Данія перастала рабіць спробы атрымаць "заморскія" калоніі, каб палепшыць уласны эканамічны стан, атрымаць рынкі сыравіны і г.д. Цукровыя няўдачы (на выкупленых астравах вырошчвалі траснік, які перапрацоўвалі ўнутры дзяржавы, а потым

прадавалі ў асноўным за мяжу) прымусілі зрабіць акцэнт на унутраныя рэсурсы. Стала заахвочваца развіццё сельскай гаспадаркі, прычым не толькі выраб, але і пераапрацоўка прадукцыі. У выніку ствараліся сельскагаспадарчыя і пераапрацоўваючыя малыя і сярэднія прадпрыемствы, развілася сельская кааперацыя. Урэшце, Данія стала буйным экспарцёрам ў такія еўрапейскія краіны, як Вялікабрытанія і Германія, не толькі мяса, але і малочных прадуктаў.

З дацкага досведу планавалася ўзяць, перш за ўсё, цесную сувязь сельсай гаспадаркі і прамысловасці. Таму шырокамаштабнага развіцця машынабудавання (што адбылося ў БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны) не планавалася. Упор быў зроблены на некалькі галінаў, якія маглі перааапрацоўваць сельскагаспадарчую прадукцыю мясцовых вытворцаў. Разам з калгасамі ў БССР актыўна прасоўвалі існаванне хутароў, жыхары якіх сваю прадукцыю маглі рэалізоўваць пасобку, ці праз стварэнне адпаведных кааператываў. Да гэтага далучаліся і дрэваапрацоўваючыя прадпрыемствы.

Такі падыход да развіцця БССР на той момант падаецца не толькі арганічна-эвалюцыйным, але і ледзь не адзіна магчымым. Названыя галіны прамысловасці былі для гэтых тэрыторый традыцыйнымі, гэта значыць, нейкая вытворчасць ужо існавала. Яе заставалася толькі пераабсталяваць, што выглядае больш фінансава магчымым. Першапачаткова можна было выкарыстоўваць меўшыяся магутнасці, а мадэрнізацыю іх праводзіць паступова. Вялікага напружання гэта не патрабавала. Не адбывалася і карэннай ломкі сацыяльнага ладу. Большасць насельніцтва БССР у той час пражывала ў сельскай мясцовасці і была занята ў сельскай гаспадарцы. Кадравае забеспячэнне шмат у чым таксама можна было забяспечыць унутрырэспубліканскімі намаганнямі. З 1919 г. ў Горках аднавіў сваю дзейнасць сельскагаспадарчы інстытут, які з 1925 года стаў Беларускай акадэміяй сельскай гаспадаркі [3]. Праводзіць жа буйнамаштабныя launched пераўтварэнні ў прамысловасці, накшталт тых, якімі знакаміты П. М. Машэраў, для БССР часоў даваенных было вельмі складана. Цяжкая індустрыя патрабуе ці наяўнасці на дадзенай тэрыторыі карысных выкапняў (руды, вугалю, нафты і інш.), развітай паліўна-энергетычнай сферы, ці завоз іх з іншых тэрыторый. Першага ў БССР не было, другое з-за недастатковай развітасці сродкаў камунікацыі (чыгункі перш за усё) і транспарту было немагчыма. Таму ўпор на развіццё пераапрацоўваючых галінаў для ўласнай сыравіны выглядае цалкам адэкватным часу і ўмовам. Як адзначае А. Л. Падгайскі, “нават ў 1927 г. (пасля прыняцця афіцыйнага курса на індустрыялізацыю СССР) большасць беларускіх эканамістаў ставіла пад

сумнеў мэтазгоднасць правядзення фарсіраванай індустрыялізацыі эканомікі БССР” [2, с. 52]. І аўтар прыводзіць да прыкладу ідэі А. Котава, П. Макрыцкага, а яшчэ раней – А. Бонч-Асмалоўскага і іншых.

Д. Прышчэпаў указваў, што ў галін, звязаных з пераапрацоўкай беларускай сельскагаспадарчай сыравіны яшчэ вельмі добрыя перспекттывы развіцця, бо на той момант, па яго падліках, пераапрацоўвалася толі 40 % таварнай прадукцыі аграрнага сектара БССР [4, с. 88].

Тым не менш, у 1928 г. перамог іншы пункт гледжання. У БССР аб’яўлялася паскораная індустрыялізацыя, стварэнне прадпрыемстваў цяжкай індустрыі. Гэтая пазіцыя была характэрна для старшыні Вышэйшага савета народнай гаспадаркі БССР С. Карпа і старшыні Дзяржплана БССР М. Каркаліна [2, с. 54]. А. Л. Падгайскі гэтае рашэнне апраўдвае тым, што разлікі паказалі “абмежаваныя магчымасці вытворчасці зерня, слабасць кармавой базы жывёлаводства, недахоп тэхнікі і ўгнаенняў, неразвітасць мясцовай транспартнай сеткі і адсутнасць рынкаў збыту (пры ўсёй умоўнасці гэтага паняцця ў савецкай эканоміцы)”. Таксама развіццё цяжкай індустрыі давала доступ да атрымання сродкаў з саюзнага бюджэту, падвышала прэстыж рэспублікі [2, с. 55–56]. Апошняе бясспрэчна, але першы пункт лёгка апravергнуць, бо транспартныя праблемы былі не толькі ўнутры БССР, але і ў зносінах яе з іншымі савецкімі тэрыторыямі. Кармавыя і палявыя магутнасці, сітуацыю з угнаеннямі і сельгастэхнікай можна было паляпшаць паступова, выкарыстоўваючы сродкі ад развіцця тых жа пераапрацоўваючай і лясной гаспадаркі.

Аднак выбар быў зроблены. Тым не менш, пакуль вялікага крэну на карысць цяжкай індустрыі ў БССР не адбылося. З вялікіх прамысловых новабудоўляў першай пяцігодкі ў БССР да машынабудаўнічай галіны можна аднесці толькі Гомсельмаш. “Сцяг індустрыялізацыі”, “КІМ”, фабрыка штучнага валакна, дрэваапрацоўчыя камбінаты – гэта больш адносіцца да адвергнутай канцэпцыі развіцця эканомікі БССР.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры

1 Четырнадцатый съезд ВКП(б) // КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. – Т. 3. (1922–1925). – М. : Издательство политич. литературы, 1984. – С. 424–474.

2 Подгайский, А. Л. Индустриализация в Беларуси: выбор ориентиров экономического развития / А. Л. Подгайский // Историко-экономические исследования. – 2008. Т. 9. – № 2. – С. 48–58.

3 100 год з гісторыі Беларуская дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі : дакументы і матэрыялы. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

4 Сацыяльна-эканамічныя праекты ў працах беларускіх эканамістаў другой паловы XIX – першай паловы XX ст. / Аўтар і ўклад. У. А. Акуліч. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 413 с.

**УДК 069.51(476.2):069.5:069(476.6-4):2-9**

**А. У. Ціхаміраў**

(Гродна, УК «Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі»)

## ПРАДМЕТЫ З ГОМЕЛЯ І ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ФОНДАХ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі з’яўляецца адзінай ў краіне спецыялізаванай музейнай установай, якая займаецца зборам, вывучэннем і экспанаваннем прадметаў сакральнай спадчыны розных рэлігій. Музей быў заснаваны ў 1973 г. у Полацку, у 1977 г. змяніў назву (Рэспубліканскі музей атэізму і гісторыі рэлігіі) і быў пераведзены ў Гродна. У 1989 г. ён быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, а ў 2005 г. атрымаў сучасную назву [4, с. 464].

З самога пачатку дзейнасці супрацоўнікі імкнуліся збіраць матэрыялы з усёй тэрыторыі Беларусі, каб найбольш поўна паказаць разнастайнасць рэлігійнай культуры. Гомель і Гомельская вобласць таксама не засталіся без увагі. У 1980-х гг. былі здзейснены адмысловыя экспедыцыі музея ў Гомельскую вобласць, якія папоўнілі фонды каштоўнымі прадметамі. Некаторыя прадметы трапілі ў музей з іншых мясцовасцей, але першапачаткова яны былі выраблены ў Гомельскім рэгіёне. Найбольшая колькасць прадметаў трапіла ў музей менавіта 1980-я – на пачатку 1990-х гг. У пазнейшы час назіралася выразная тэндэнцыя да змяншэння паступленняў з гэтага рэгіёна, але і ў першае дваццацігоддзе XXI ст. прадметы, звязаныя з Гомелем і Гомельскай вобласцю працягваюць трапляюць у музей.

Прадметы з рэгіёна знаходзяцца ў 21 калекцыі асноўнага і навукова-дапаможнага фондаў (стан на пачатак 2021 г.). Умоўна іх можна падзяліць на тры групы. Гэта прадметы, выраблены на тэрыторыі Гомеля і сучаснай Гомельскай вобласці; прадметы, якія працяглы час бытавалі на гэтай тэрыторыі; прадметы, якія тэматычна звязаныя

з рэгiёнам (напрыклад, на iх маюцца выявы будынкаў, населеных пунктаў вобласцi). Самыя старажытныя прадметы, знойдзеныя ў рэгiёне паходзяць з часоў ранняга жалезнага веку, а самыя сучасныя – з першага дзесяцiгоддзя XXI ст.

Абразы Гомельска-Магiлёўскай школы ўяўляюць значную цiкавасць для наведвальнiкаў музея i даследчыкаў. Iх у музейных зборах дзевяць, частка з iх экспануецца. Большасць гэтых прадметаў датуецца на другую палову XIX ст., адзiн абраз – на пачатак XX ст. Да перадачы ў музей абразы знаходзiлiся ў прыватных уладальнiкаў (напр. у Рэчыцы, Новай Белiцы (зараз раён Гомеля), у храмах i манастырах (Свята-Пакроўскi сабор ў Гродне, Жыровiцкi Свята-Успенскi манастыр). Значная частка абразоў – гэта розныя выявы Мацi Божай: два абразы Мацi Божай Траеручыцы, Пакроў Прасвятой Багародзiцы, Мацi Божая Адзiгiтрыя. Два абразы – выявы Хрыста Уседзяржыцеля (адзiн з iх знаходзiцца ў пастаяннай экспазiцыi), па адным – з выявамi святых Мiкалая Цудатворцы, Параскевы i Варвары. Характэрнымi мастацкiмi асаблiвасцямi iканапiсу Гомельска-Магiлёўскай школы з’яўляецца пранiкненне ў кананiчную версiю густаў i прыёмаў народнай творчасцi. Упадабаныя элементы, якiя можна заўважыць на кожным з гэтых абразоў – розныя кветкавыя букеты, ружачкi, раслiнны арнамент. Гэта тлумачыцца распаўсюджаным звычаем упрыгожваць абразы жывымi кветкамi. З цягам часу колькасць кветак на абразах толькi павялiчвалася. Наяўнасць азначаных раслiнных i кветкавых арнаментаў i надзвычайная дэмакратычнасць лiкаў, якiя вабяць прастатой, шчырасцю i даверлiвасцю – гэта вызначальныя рысы “народнага наiву” дадзенага рэгiёну [3].

Археалагiчная калекцыя налiчвае 348 прадметаў, звязаных з Гомельскай вобласцю. У пастаяннай экспазiцыi знаходзяцца найбольш старажытныя з iх: крыжападобная падвеска эпохi ранняга жалезнага веку з в. Прысна Веткаўскага раёна i глiнянае бiканiчнае праселка з в. Шарсцiн Веткаўскага раёна (даследванне А. Г. Калечыц ў 1987 г.) [1; 2]. Большасць ж прадметаў з гэтай калекцыi паходзiць з Мазыра. Там падчас раскопак у 1982, 1983, 1984 гг. былi знойдзены разнастайныя прылады працы i прадметы побыту XII–XIX стст.: сякеры, малаткi, разнастайныя керамiчныя вырабы i iх фрагменты, замкi, ключы, рыбалоўныя кручкi, тачыльныя брускi, форма для лiцця, шкло, курыльныя люлькi, манеты i iншае. Амаль усе яны паступiлi ў фонды на пачатку 1990-х гг. з гiсторыка-археалагiчнага аддзела Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага iнстытута i НДПД “Белрэстаўрацыя”. Некалькi прадметаў (гзымсавая кафля, керамiчныя вырабы i фрагменты посуду) было знойдзена падчас раскопак у Чачэрску ў 1982 г.

Калекцыя дакументаў налічвае 369 прадметаў. Для гісторыкаў, якія вывучаюць штодзённае жыццё ў другой палове XX ст. яны могуць ўяўляць цікавасць перадусім таму, што іх збіралі мэтанакіравана спецыялісты музея для паказа ўкаранення свецкіх грамадзянскіх абрадаў. Гэтыя дакументы самыя разнастайныя: запрашэнні на канцэрты, спектаклі, конкурсы, семінары, цыклы лекцый, канферэнцыі, урачыстыя пасвячэнні ў рабочыя, хлебаробы, уручэнні пашпарта, вясельныя ўрачыстасці, дні надання імя дзіцяці, провады на пенсію, а таксама праграмы гэтых мерапрыемстваў, пропускі, буклеты, пасведчанні ганаровай маці і ганаровага бацькі, членаў таварыства "Веды". Шмат такіх матэрыялаў паходзіць з Гомельскага планетарыя, Гомельскага Дома грамадзянскіх абрадаў, ЗАГСа г. Гомеля, гарадскога дома культуры Рэчыцы, Дома культуры завода штучнага валакна ў Светлагорску, Гомельскага Палаца піянераў і школьнікаў і іншых установаў. Цікавасць выклікаюць дакументы, звязаныя з дзейнасцю Усесаюзнага таварыства "Веды" (запрашэнні і праграмы навучання арганізатараў атэістычнай работы, рэспубліканскіх семінараў лектараў, семінараў па ўкараненні сацыялістычнай абраднасці, праграмы публічных лекцый). Асобную групу складаюць матэрыялы, звязаныя з гісторыяй тэатральнага жыцця, сярод якіх праграмы спектаклей народнага тэатра Рэчыцкага гарадскога дома культуры, Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. Дакументамі свайго часу з'яўляюцца таксама і комплесны план развіцця г. Гомеля на 1971–1975 г. (1971 г.) ці рэкамендацыі па ўкараненню безалкагольных сямейных абрадаў (1986 г.). Большасць дакументаў – 1970-х і 1980-х гг., але ёсць і значна старэйшыя, напрыклад пасведчанне супрацоўніка службы руху Ўпраўлення Заходняй чыгункі (1919 г.) і членскі білет Усесаюзнага таварыства па распаўсюджванні палітычных і навуковых ведаў (1949 г.).

З калекцыяй дакументаў непасрэдна звязаная калекцыя ліставых друкаваных выданняў. З Гомельскага рэгіёну паходзіць 350 прадметаў. У большасці выпадкаў яны паступілі з тых самых установаў, што і дакументы, і адлюстроўваюць штодзённае жыццё познесавецкага перыяду і свецкую сацыялістычную абраднасць. Цікавасць выклікаюць арыгінальныя афішы, плакаты, буклеты, якія запрашалі на наведванне святаў мікраараёнаў, конкурсаў малюнкаў і іншай самадзейнай творчасці, канцэртаў ці заклікалі пералічваць аднадзённы заробак у Савецкі фонд міру. Прадметы паходзяць з Гомеля, Турава, Светлагорска.

У фондах захоўваецца адзін старадрук і 15 кніг, якія былі выдадзеныя ў рэгіёне ці звязаныя з ім тэматычна. "Служэбнік" быў выдадзены ў XVII ст. у Ветцы. Кніжныя выданні – гэта ў большасці брашуры, якія ўбачылі свет ў 1980-я гг., але ёсць і гомельскае выданне працы Емельяна Яраслаўскага "Задачи антирелигиозной пропаганды в связи с предстоящими выборами в местные советы" (1939 г.) і выданне "Гомельский процесс" (СПб., 1907). У калекцыі перыядычных выданняў знаходзяцца 12 прадметаў: цэлыя нумары газет або выразкі з іх, якія выдаваліся ў Гомелі, Светлагорску, Мазыры і Петрыкаве (1985–2000 гг.). У калекцыі філатайміі – 4 кішэнныя календары з вывамі абразоў Веткаўскай школы і св. Іаанна Кармянскага, выдадзеныя ў 2000–2001 гг.

Прадметы калекцый фатаграфіі і філакартыі з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для даследвання візуальнай гісторыі. У фондах захоўваецца 86 фатаграфій з Гомеля, Рагачова, Жыткавічаў, Чачэрска, Светлагорска, Кармы, на якіх паказаны падзеі 1940-х – пачатку 2000-х гг. Тэматычна яны цесна звязаныя з калекцыямі дакументаў і ліставых друкаваных выданняў, на іх – выступленні творчых калектываў, правядзенне святаў, грамадзянскіх абрадаў, мітынгаў, шэсцяў і іншыя падзеі. У калекцыі філакартыі знаходзіцца 83 прадметы. Большасць з іх была выраблена на пачатку XX ст. На іх – віды вуліц, плошчаў і будынкаў Гомеля да 1918 г. Таксама ёсць некалькі паштовак з відамі Мазыра. У калекцыі філатэліі толькі 12 прадметаў. Гэта паштовыя канверты і маркі, выпушчаныя ў 1990–2003 гг.

У фондах знаходзяцца таксама 6 рукапісаў і машынапісаў (перадусім сцэнарыі правядзення розных урачыстасцей), 5 прадметаў побыту (канцэлярскія друкі), 2 пячаткі першай паловы XX ст. з Мазыра, 12 прадметаў у калекцыі фалерыстыкі (між іншым памятныя медалі "Рождённому на Гомельщине"). У калекцыі тканін – 12 прадметаў: ручнікі, абрусы, стужка, андарак з Гомеля, Добрушкага, Журавіцкага раёнаў і іншых месцаў (1920–30-я гг.).

У калекцыі керамікі – 4 прадметы: цацкі-свістулькі і дэкаратыўныя талеркі 1970-2013 гг. Таксама маецца драўляная скульптура майстра Б. М. Васількова (нар. 1929 г.) "Мядзьведзяня на пяньку" (1986 г.). Адным з самых вялікіх жывапісных палотнаў у калекцыі музея з'яўляецца праца народнага мастака Беларусі Г. Х. Вашчанкі "Грунвальдская бітва" (1985 г.), якая экспануецца ў пастаяннай экспазіцыі.

Прадметы з Гомеля і Гомельскай вобласці ў калекцыі Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі – гэта не толькі цікавыя экспанаты, якія прыцягваюць наведвальнікаў, але і каштоўныя крыніцы па

гісторыі Беларусі розных перыядаў. Яны адлюстроўваюць рэлігійнае жыццё, палітыку дзяржавы ў гэтай галіне, атэізацыю савецкіх часоў, укараненне свецкіх абрадаў, развіццё розных відаў мастацтва, штодзённасць гарадоў і сельскіх паселішчаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1 Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі (ГДМГР). – Навуковы пашпарт № 008184.

2 ГДМГР. – Навуковы пашпарт № 008185.

3 ГДМГР. – Навуковы пашпарт № 008727. Русецкая Л. Я. [складальнік].

4 Лещёнок, Н. И. Материалы по иудаике в фондах Гродненского государственного музея истории религии / Н. И. Лещёнок // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы міжнар. навук. канф. / пад рэд. І. А. Антоненкі, А. А. Кавалені, І. П. Крэня. – Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 464–468.



**УДК 94:327.5(44:470)"1812":94.355.4(474.5)"1812"**



**С. А. Чаропка**

(Гомель, УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)


## ЛІТОЎСКАЯ АРМІЯ Ў ФРАНЦУЗСКА-РАСІЙСКАЙ ВАЙНЕ 1812 ГОДА

Падзеі французска-расійскай вайны 1812 г., якая ў свядомасці значнай часткі беларускага грамадства нездарма лічыцца “айчыннай”, прынеслі на беларускую зямлю не толькі чарговыя разбурэнні і дэмаграфічныя страты, што не раз адбывалася ў нашым мінулым, яна, апрача гэтага, падзяліла жыхароў беларускіх зямель Расійскай імперыі па пытанню аб іх далейшым лёсе, аб лёсе іх будучай дзяржаўнасці. Частка насельніцтва выступіла за барацьбу супраць французаў і захаванне Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, іншая частка падтрымала акупацыйныя ўлады, марачы аб аднаўленні Рэчы Паспалітай. Значная частка беларускага насельніцтва выступіла са зброяй у руках супраць агрэсара, змагаючыся ў шэрагах расійскай арміі, прымаючы ўдзел у партызанскім руху. Прыхільнікі пра

французскай "партыі", у сваю чаргу таксама не засталіся назіральнікамі ў віры развіваўшыхся падзей і са зброяй у руках выступілі ў падтрымку "Вялікай арміі" Напалеона, стварыўшы ўласныя вайсковыя фарміраванні. Створанае літоўскае войска адыграла далёка не галоўную ролю вайне 1812 года, тым не менш многія яго падраздзяленні актыўна ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях як на тэрыторыі Беларусі, так і па-за яе межамі. Падзеі вайны 1812 г. на Беларусі не аднойчы прыцягвалі ўвагу даследчыкаў і на сённяшні дзень беларускімі, расійскімі, польскімі, літоўскімі аўтарамі сфарміраваны салідны наратыў, які дае магчымасць усебакова даследаваць падзею, аднак асобныя яе фрагменты дагэтуль маюць патэнцыял для даследавання [1-12].

24 чэрвеня французская армія пачала баявыя дзеянні. 1 ліпеня 1812 г. пачаўся працэс стварэння Камісіі часовага ўрада ВКЛ, што выглядала як першы крок да аднаўлення дзяржаўнасці ВКЛ. 10 ліпеня было вырашана стварыць літоўскую армію ў складзе 5 пяхотных і 4 кавалерыйскіх палкоў [10, с. 480]. Агулам яна павінна была налічваць 14 304 вайскоўца [10, с. 499]. Задачай войска стала ахова шляхоў камунікацый на тэрыторыі заходняй і цэнтральнай частак Беларусі ад рэйдаў расійскай арміі. У канцы жніўня былі сфарміраваны генеральная інспекцыя і штаб арміі ВКЛ [10, с. 501].

Першае буйное сутыкненне падраздзяленняў літоўскай і расійскай армій адбылося 20 кастрычніка 1812 г. пад Слонімам. Падчас боя значная частка асабістага складу 3-га легкаконнага палка арміі ВКЛ была знішчана, 247 чалавек, у тым ліку і сам камандзір палка трапілі ў палон. Цяжкія страты панёс літоўскі татарскі эскадрон, які, аднак, здолеў выйсці з акружэння і адысці да Вільні.

Поспехі расійскай Дунайскай арміі адмірала Чычагова прымусілі кіраўніцтва арміі ВКЛ зрабіць захады да яе канцэнтрацыі. Каля Вільні сканцэнтраваліся 17, 19, 20 уланскія палкі, у Мінску засяродзіліся 1 стралецкі, 22 і частка 23-га пяхотнага, а таксама 18 уланскі полк [11, с.61]. У сярэдзіне лістапада з мэтай абароны пераправаў праз Нёман сілы мінскай групоўкі на чале з генералам Ю. Касецкім былі накіраваны пад мястэчка Новы Свержань. Тут 18 лістапада літоўскія войскі былі атакаваны пераўзыходзячымі сіламі расійскай арміі. Падраздзяленні літоўскай арміі былі вымушаны пакінуць мястэчка, але ўжо наступным днём, перадавыя часткі расійскіх войск іх дагналі. У выніку боя атрад Касецкага пацярпеў паражэнне, каля 2 тысяч жаўнераў трапілі ў палон, астатнія адышлі да Мінска.

Няпростая сітуацыя склалася каля Барысава. Тут 21 лістапада ў бой уступіў 1 стралецкі полк, у выніку чаго значная частка яго асабістага складу была знішчана, быў паранены яго камандзір Ю. Касакоўскі. У перыяд з 26 па 28 лістапада для французскай арміі адбыліся найбольш трагічныя падзеі. Падчас бітвы каля Студзёнкі шэраг падраздзяленняў арміі ВКЛ, у прыватнасці 18, 19, 20 уланскія палкі, ахоўвалі пераправу праз Бярэзіну. Уланы 18-га палка былі аднымі з першых, хто пераправіўся на правы бераг ракі. Страты яго былі вельмі значнымі. Асабісты склад 20-га ўланскага палка пасля бітвы таксама зменшыўся напалову. У Бярэзінскай бітве ўдзельнічаў і 22 пяхотны полк С. Чапскага і мінскія жандары. 28 лістапада пад Студзёнкай у бой уступіў ужо раней "абстраляны" пад Барысавам 1 стралецкі полк Ю. Касакоўскага.

Разумеючы маштабы Бярэзінскай катастрофы 28 лістапада мінскі губернатар генерал Бранікоўскі вывеў з горада рэшткі літоўскага войска, сярод якіх былі часткі 1-га стралецкага палка, 22-га і 23-га пяхотных, 18-га і 20-га ўланскіх палкоў. 18 уланскі полк быў спешаны, частка коней перададзена імператарскай гвардыі, самі ўланы накіраваліся на абарону Вільні [10, с. 657].

Падчас вайны 1812 г. апошні раз у гісторыі ВКЛ было склікана паспалітае рушанне. Гэта адбылося адразу пасля Бярэзінскай катастрофы. Знаходзячыся ў Маладзечне Нападеон даў згоду на збор паспалітага рушання для шляхты ВКЛ ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў [10, с.654]. У першы прызыў планавалася сабраць каля 15 тысяч чалавек, а пазней яшчэ столькі ж. Кожны шляхціц павінен быў з'явіцца на уласным кані, а дзідамі і шаблямі іх абавязваліся ўзброіць французскія вайскоўцы [3]. Але разлік на патрыятычны настрой прафранцузскай шляхты ва ўмовах хаатычнага адступленння французскай арміі аказаўся чакана марным. Замест 30 тысяч чалавек сабралося менш за тысячу дрэнна ўзброеных шляхціцаў, многія з якіх затым вярнуліся дадому. Ініцыятыва была несваечасовая, бо пасля Бярэзінскай катастрофы, ва ўмовах, калі расійскія войскі кантралявалі большасць дыстрыктаў ВКЛ, збор рушання быў малаверагодным.

10 снежня у абароне Вільні ад расійскіх войск актыўны ўдзел прыняла пяхота, кавалерыя, жандармерыя А. Храптавіцкага, нацыянальная гвардыя Казельскага, 3 батальён стральцоў К. Плятэра. У выніку баёў за былую сталіцу ВКЛ амаль поўнасцю быў знішчаны татарскі эскадрон пад камандаваннем Ахматовіча, з якога засталася толькі адна рота ў складзе 3 афіцэраў і 15 шараговых.

Пасля выгнання “Вялікай арміі” з тэрыторыі Расійскай імперыі падраздзяленні арміі ВКЛ адступілі на тэрыторыю Герцагства Варшаўскага і Прусіі. У прыватнасці 18 пяхотны полк А. Хадкевіча, 20 А. Бішпінга, 21 А. Гелгуда, рэшткі 22 палка С. Чапскага сканцэнтраваліся ў Варшаве. Туды ж накіраваліся 18 уланскі полк К.Д. Пшэздзецкага, 20 К. Абуховіча, конна-артылерыйская рота, конна-стралецкі эскадрон І. Манюшкі, 4 стралецкі батальён Курчэўскага, падраздзяленні жандараў і нацыянальных гвардзейцаў.

У Прусію да Кёнігсбергу адышлі 17 і 19 уланскія палкі пад агульным камандаваннем К. Раецкага. Сюды ж падышлі 19 пяхотны полк К. Тызенгаўза, рэшткі стралецкага палка Ю. Касакоўскага, 3 стралецкі батальён К. Плятэра. Праз некаторы час пяхота была накіравана да Варшавы з мэтаю ўмацавання крэпасці Модлін. 20 уланскі полк, які быў уключаны ў склад 9 уланскага палка Варшаўскага герцагства замацаваліся ў Гданьску. Тут жа апынуўся эскадрон І. Манюшкі, які быў уключаны ў 5 польскі полк конных стральцоў [6, с. 117].

У наступным 17 і 19 уланскія палкі з Кёнігсберга адышлі далей на захад і ў наступным прымалі ўдзел у баях у Германіі. Уначы з 11 на 12 лютага 1813 г. 17 уланскі полк быў атакаваны расійскай арміяй у мястэчку Цырке на рацэ Варце. Уланы аказалі ўпартае супраціўленне, але самі пры гэтым панеслі сур’ёзныя страты. У палоне апынуўся сам генерал-інспектар арміі ВКЛ Р. Гедройц [12].

Тым часам у сярэдзіне студзеня 1813 г. 18 і 21 пяхотныя палкі былі далучаны да корпуса Юзафа Панятоўскага і ўключаны ў склад гарнізона крэпасці Модлін. 20 пяхотны полк фактычна быў расфарміраваны, а яго жаўнеры накіраваны на даўкамплектаванне падраздзяленняў Варшаўскага княства.

Рота літоўскіх татар у 1813 г. далучылася да 1 гвардзейскага ўланскага палка і ваявала на тэрыторыі Германіі ў баях пад Люцэнам, Баўтцэнам, Дрэздэнам, Альтэнбургам, Веймарам, Ханаў. Затым рота Ахматовіча ўвайшла ў склад 3 палка гвардзейскіх выведчыкаў і прыняла ўдзел у кампаніі 1814 г. у Францыі [8].

Многія ваяры літоўскага войска ў 1812–1813 гг. атрымалі вышэйшыя ваенныя ўзнагароды Рэчы Паспалітай і Францыі. Цікава, але іх лёс аказаўся не настолькі трагічным, як гэтага можна было чакаць, ведаючы вынікі французска-расійскай вайны. 24 сакавіка 1814 г. імператар Аляксандр I сустрэўся з групай магнатаў і шляхты былой Рэчы Паспалітай і дараваў ім падтрымку Напалеона. Шмат хто з афіцэраў літоўскага войска ў далейшым працягнуў службу ў арміі

Каралеўства Польскага як аўтаномнага дзяржаўнага ўтварэння ў складзе Расійскай імперыі.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1 Корнейчик, Е. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года / Е. Корнейчик. – Минск : Наука и техника, 1978. – 267 с.

2 Крывіцкая, К. В. Арганізацыя ўзброенных сіл вялікага Княства Літоўскага ў перыяд вайны 1812 года / К. В. Крывіцкая // Весці БДУ, №1(51), 2007. – С. 12–15.

3 Кудряшов, И. Ю. Вооруженные силы Литовского княжества 1812 года / И. Ю. Кудряшов. – М., 1991. – 19 с.

4 Таляронак, С. Апошняя армія ВКЛ (1812–1814) / С. Таляронак, А. Блінец // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. - № 2. – С. 22–34.

5 Тарле, Е. В. Нашествие Наполеона на Россию, 1812 год / Е. В. Тарле. – М. : Наука, 1992. – 304 с.

6 Адроджаная прагай да свабоды : армія Вялікага княства Літоўскага 1812 года / С. А. Чаропка // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2012. – № 4. – С. 113–119.

7 Швед, В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна, 2006. – 252 с.

8 Шереметьев, О. В. Литовские татары в составе Императорской гвардии Наполеона / О. В. Шереметьев // www.august-1914.ru/sheremetev.pdf

9 Gaidis, H. L. Napoleon's Lithuanian forces / H.L. Gaidis // Lithuanian quarterly journal of arts and sciences. Volume 30. – 1984. – №.1 // http://www.lituanus.org/1984_1/84_1_01.htm

10 Nawrot, D. Litwa i Napoleon w 1812 roku / D. Nawrot. – Katowice, wyd. Uniwersitetu Slanskiego, 2008. – 790 s.

11 Staszewski, J. Generał Dominik Dziewanowski / J. Staszewski– Poznan, członkami druk. wydaw. w Kaliszu, 1933. – 80 s.

12 Журнал военных действий с 6 (18) по 8 (20)февраля 1813 // [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http: //www. museum.ru/1812/ War/News_rus/izv167.html Дата доступа : 02.01.2021.

УДК 94:316.77(=581)(476)"20"

**Чжан Иньлин**
(Минск, ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси»)

# К ВОПРОСУ О СОЦИАЛЬНОЙ КОММУНИКАЦИИ КИТАЙЦЕВ В БЕЛАРУСИ В 2010-Е ГОДЫ

Социальное взаимодействие лежит на основе всей деятельности общества. Данное исследование позволяет нам рассмотреть роль социальной коммуникации для китайцев Беларуси в принимающем обществе.

Изучение основывается на использовании собранных нами полевых материалов путём опроса по теме «Духовная и социальная культура китайцев в Беларуси». В опросе участвовало 44 человека. Из участников опроса по полу: 27 мужчины, 17 женщины. По возрасту: 14 человек в возрасте 18–25 лет, 27 человек в возрасте 26–30 лет, 3 человека в возрасте 31–40 лет. По роду занятий: 37 учащихся, 7 работающих.

К межличностной коммуникации китайцев Беларуси относится прямая коммуникация. По полученным данным опроса, непосредственное общение китайцев в Беларуси с представителями других культур зависит от трёх основных факторов: язык (71 % респондентов), свой характер и психология (57 % респондентов) и менталитет собеседника (50 % респондентов) [1].

Что касается наиболее часто используемого языка китайцами Беларуси, то 61% респондентов предпочитают говорить на китайском языке, 25% респондентов выбирают общаться на русском языке, очень немногие респонденты больше говорят по-английски (2%) и остальные 11% редко общаются с людьми. Исходя из этого, мы можем увидеть, что хотя они находятся в благоприятных условиях Беларуси для повышения уровня русского языка, китайцы зачастую ограничивают круг общения своими земляками. Такой факт также имеет отражение в статистике белорусской государственной статистики. Согласно данным Белстата до 2019 г. 1788 китайцев были включены в национальный состав населения Республики Беларуси. Из них 1622 китайца указали, что дома они обычно разговаривают на китайском языке, 141 на русском и только 3 на белорусском [4, с. 37].

В процессе исследования многие респонденты признали, что языковой барьер серьёзно отрицательно влияет на их коммуникацию с местными жителями. Были выявлены следующие проблемы: слабая

подготовка по языку (недостаток лексического запаса слов, грамматических и фонетических знаний); отсутствие глубокого знакомства с белорусскими культурными нормами; нехватка языковой практики. Например, из-за недостатка запаса слов и плохой фонетики в бытовых условиях некоторые китайцы не могут правильно найти необходимые вещи [1]. Помимо этого, некоторые китайцы говорят на русском языке с акцентом и иногда подвергаются насмешкам носителей русского языка, что вызывает их неуверенность в самовыражении. Кроме этого, у китайцев в разных кругах деятельности присутствует проблема с использованием разных речевых стилей [1].

Этнический менталитет является другим фактором, влияющим на общение китайцев Беларуси с населением принимающего общества. С точки зрения этнопсихолога этнический менталитет важен для определения степени сплочённости, интеграции, этнической общности, группы, а также осознание места и роли личного «Я» в системе категорий «мы» – «они», «свои» – «чужие» [2, с. 135]. Если мы считаем, что язык передаёт основное содержание коммуникации, то этнический менталитет определяет образ и качество такого взаимодействия.

Согласно собранным данным, те, кто обычно первым начинает беседу, составляют только 9 % из опрошенных. 34 % респондентов пассивно общаются с белорусами при необходимости в учёбе, на работе или в других условиях. И остальные 57 % респондентов редко общаются с белорусскими жителями [1]. В этом случае нам можно рассмотреть специфику этнического менталитета китайцев.

Менталитет китайцев характеризуется закрытостью и сдержанностью. С давних времён Китай имел целостную географическую систему, которая состоит из гор, рек, плодородной земли и других благоприятных условий для выживания человека. Такая среда зарождала единое целое государство и самодовлеющее аграрное хозяйство. Культура земледелия создала трудолюбие и терпение в национальной душе китайцев [3, с. 167]. Кроме этого, у китайцев сформировалась ценностная ориентация на стабильное блаженство и согласие в единстве. В этой связи оказалось, что в межэтнической коммуникации с жителями белорусского общества китайцы зачастую стесняются и поступают осторожно. Об этом свидетельствуют слова одного респондента: «Я стеснительный человек. Когда общаюсь с белорусами, не знаю, что и как говорить» [1].

Этническая сдержанность также проявляется в образе выражения эмоций китайцев, который отличается от белорусской традиции. Американский миссионер и дипломат С. Холкомб отметил яркую

особенность общения китайцев, которая не характерна для западной культуры: «Китайскому этническому менталитету свойственна привычка подавлять настоящие чувства при общении с людьми» [6, с. 278]. По нашему мнению, это объясняется тем, что китайцы долгое время оставались и находились под действием догмы самоконтроля и принципиальности, требуемых в традиционной морально-нравственной этике.

В отличие от китайцев, белорусы зачастую искренно высказывают свои мнения и эмоции. По словам одного респондента, «белорусы предпочитает обращаться непосредственно к сути дела, так мы сразу понимаем его намерение. А китайцы зачастую поступают наоборот и любят высказывать свою идею окольными путями. Это мне очень не нравится. Устал угадывать» [1]. Об этом китайские исследователи проблем межкультурной коммуникации Хэ Гаода и У Лилинь дали своё объяснение. Не прямо выражая настоящее мнение, в социальной коммуникации китайцы обычно прощупывают пределы психологии собеседника эвфемистическими словами, чтобы избежать возможной неловкости для собеседника после раскрытия своего намерения и не нарушить дружественные отношения [5, с. 87].

Отношения китайцев к языковому барьеру и разнице менталитете в некоторой степени представляют их адаптационные стратегии к социальной культуре белорусского общества. По сравнению с материальной и духовной культурой, китайцы проявляют меньше потенциала в адаптации к социальной культуре Беларуси. Опрос уже показал, больше половины респондентов нацелены на замкнутость общения с белорусскими жителями, и только небольшая масса китайцев настроены на интеграцию.

Итак, мы можем выделить три важных фактора, влияющие на межэтническую коммуникацию китайцев с жителями принимающего общества: язык, свой характер и психология, менталитет собеседника. Менталитет китайцев отличается закрытостью, сдержанностью и привычкой непрямо выражать мысли, что в большой степени мешает их общению с членами белорусского общества. На основе данного исследования мы можем ознакомиться с особенностями китайцев Беларуси в процессе социальной коммуникации и избежать проблемы, вызванные культурными различиями.

## Список использованных источников и литературы

1 Архив Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси. – Фонд. 6. – Оп. 14. – Д. 258. – Материалы полевых исследований Чжан Иньлин по теме «Китайцы в Беларуси: этнологическое исследование».

2 Крысько, В. Г. Словарь-справочник по социальной психологии / В. Г. Крысько. – СПб. : Питер, 2003. – 416 с.

3 Рощинская, О. М. Этнокультурные особенности менталитета и поведения китайцев / О. М. Рощинская, М. Н. Трушко // Вестник МГЛУ. Сер. 3, История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – Минск : МГЛУ, 2018. – № 17. – С. 165–172.

4 Статистический бюллетень «общая численность населения, численность населения по возрасту и полу, состоянию в браке, уровню образования, национальностям, языку, источникам средств к существованию по Республике Беларусь» / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Национальный состав Республики Беларусь. – 2020. – 55 с.

5 Хэ, Гаода, У, Лилинь. К вопросу о барьере в межкультурной коммуникации / Гаода Хэ, Лилинь У // Вестник Сянтаньского пед. ун-та. – 1996. – № 1. – С. 85–90.

6 Holcombe, C. The Real Chinaman / C. Holcombe. – New York : Dodd, Mead & company, 1909. – 229 p.

**УДК 94:323.1(476)"19":821.161.3-1/.-9*Я.Колас**

**С. В. Чувак**

(Гродна, УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы»)

## РОЛЯ ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА Ў НАЦЫЯТВОРЧЫХ ПРАЦЭСАХ XX СТАГОДДЗЯ

Спецыфіка развіцця беларусазнаўчай навукі ў тым, што багаты матэрыял аб этнічных асаблівасцях мы знаходзім не толькі ў фальклarыстаў, этнографаў, гісторыкаў, але і ў мастацкай літаратуры. Гэта можна патлумачыць асаблівасцямі фармавання і развіцця новай беларускай літаратуры. Нават у 1905–1917 гг., дасягнуўшы значных мастацкіх вышыняў, яна не была “чыстым“ мастацтвам, якое б мела на першым плане задачу – задаволіць спецыфічныя эстэтычныя патрэбы. Яна была перш за ўсё сродкам нацыянальнага адраджэння беларускага народу, мастацкая творчасць адначасова была палітычнай, грамадскай, навуковай, асветніцкай дзейнасцю. Літаратура стала зброяй ў нацыянальнай барацьбе, сродкам распаўсюджвання новых ідэй і духоўных павеваў. Дзеячы нацыянальнага Адраджэння сваёй галоўнай задачай бачылі абуджэнне беларускага сялянства, бо менавіта ў ім бачылі тыя

сілы, якія здольныя будуць сфармаваць незалежную, нацыянальную культуру, дадуць інтэлігенцыю, якая створыць праграму фармавання і развіцця беларусаў як нацыі, дазволяць стварыць сваю нацыянальную дзяржаву. Найперш неабходна было даць абяздоленаму хлебаробу кніжку на матчынай мове з тым, каб ён адчуў адказнасць за свой лёс і лёс Бацькаўшчыны, каб у яго з’явілася жаданне звацца беларусам, мець сваю школу, сваю газету, нацыянальны тэатр [7, с. 10].

У такі няпросты час і вельмі выразна стаў гучаць мастацкі талент Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча – Якуба Коласа. Па паходжанні селянін, Якуб Колас прайшоў складаны шлях станаўлення свайго мастацкага светапогляду. Безумоўна, паходжанне, сям’я аказала значны ўплыў на фармаванне светапогляду мастака ў рэчышчы традыцыйнай сялянскай культуры. Сын песняра, Даніла Міцкевіч, успамінаў: “Сялянскае паходжанне на ўсе жыццё адбілася на яго абліччы, характары, на яго звычках… Ён многа ведаў народных прыкмет, па якіх можна прадказаць, якое надвор’ё будзе заўтра…Сялянскае паходжанне бацькі выяўлялася і ва ўкладзе яго штодзённага жыцця.” [6, с.182–183]. Веданне сялянскага жыцця не абмяжоўвался толькі веданнем яго побытавых рысаў. Вось што пісаў Колас у аўтабіяграфіі: “С миром вне нашей семьи и домашней обстановки знакомился я также по рассказам моих родственников… И мир, открывавшийся передо мной в этих рассказах был полон глубокого интереса и привлекательности. От своей матери я слышал много народных песен, которые так сильно трогали и захватывали меня своею поэзией и безыскусственною простотою” [3, с. 20]. Адукацыя, атрыманая Коласам, спачатку хатняя, а потым навучанне ў семінарыі, пашыралі кругагляд маладога паэта. Пад уплывам рускай класічнай літаратуры (найперш творчасць А. Пушкіна, М. Гогаля, А. Крылова) Я. Колас пачынае пісаць вершы па-руску, спрабуе па-беларуску і сам адзначыў у аўтабіяграфіі 1913 г.: “Руская мова не можа выклікаць у такім поўным аб’ёме, калі я пішу, тых адчуванняў, тых пачуццяў і тае каларытнасці, якія ўласцівыя беларускай мове, беларускім малюнкам, у якім дае беларуская мова, што з малаком маці ўвайшла ў маю натуру” [3, с. 20]. Пісаць па-беларуску было складана, бо не было дзе друкавацца, а яшчэ “белорусский язык, казалось, и существовал только для того, чтоб позабавиться над ним и посмеяться” [3, с. 22]. Сумныя развагі маладога паэта наконт перспектываў роднай мовы ўзмацняліся яшчэ і становішчам беларускага сялянства ў грамадстве: “Беларусь”, “беларус”, як тэрміны, былі мне вядомы яшчэ ў пачатковай школе, але за гэтымі тэрмінамі не было ў мяне рэальнага зместу, толькі ж яны мяне кранналі” [2, с. 27]. Або

ў іншай аўтабіяграфіі мастак заўважаў: “Мне здаецца, што такое прыніжанае, абязлічанае становішча народа, як беларускі народ, не можа не выклікаць пратэсту і пачуцця крыўды ў душы больш ці менш чулага яго прадстаўніка. Хай нашы родныя пачаткі, хай наш жыццёвы ўклад зневажаюць, хай нас выхоўваюць у чужым духу, усё-такі ў душы такога прадстаўніка, пакуль не парвана канчаткова сувязь з народам яго, не можа не жыць скрыты, пасіўны пратэст супраць ігнаравання яго чыста нацыянальных пачаткаў. Мы можам не ўсведамляць яго, але ён жыве ў нашай душы” [3, с. 20].

Я. Колас, як ніхто з беларускіх пісьменнікаў пачатку XX ст., здолеў адчуць і перадаць этнічную самабытнасць беларускай нацыі. Пры гэтым ён зрабіў акцэнт на паказе беларускага селяніна, бо лічыў яго носьбітам рысаў беларускага нацыянальнага характару. На нашу думку, беларусы як нацыя ў творчасці Я. Коласа могуць быць успрыняты ў вобразе Нёмана ў апавяданні “Нёманаў дар”: ”Страшэнны штукар і свавольнік гэты Нёман… Не знае стрымання ён, не ведае, куды дзець свае магутныя сілы. Але ніхто не жаліўся на яго свавольства… бо ён для сяла быў, як родны бацька: і карміў, і паіў, і на сваіх плячах кожнага вынасіў, і кожнага за лета разоў тры ў Коўна і Гродна вазіў ды яшчэ на дарогу даваў грошы… І ўсе важнейшыя справы былі так ці інакш звязаны з Нёманам” [4, Т. 1, с. 71]. Гэтым параўнаннем, нам думаецца, Я. Колас сцвярджае думку, што нацыя, як велічная і магутная стыхія, перад якой усе грамадскія фармацыі роўныя і аднолькавыя перад ёй сваёй бездапаможнасцю. Матыў “народ – стыхія” моцна звязаны з матывам “народ – прырода” і найбольш выразна гучыць у вершах Я. Коласа “Перад бураю” (1917), “Нёман”(1906). Можна смела гаварыць пра тое, што “сацыялагізацыя” прыроды ва ўзгаданых вершах выходзіць за межы звычайнай алегорыі – вобразы становяцца празмерна празрыстымі, прасочваюцца прамыя паралелі з рэчаіснасцю [1, с. 74]. Я. Колас справядліва ўбачыў, што дамінуючым, прадвызначальным пачаткам у развіцці беларуса з’яўляецца прыроднае асяроддзе. Свет прыроды цалкам прадвызначае лад жыцця селяніна, дыктуе яго зрытмізаванасць. Гэта было звязана не толькі з тым, што беларускі селянін працаваў на зямлі, здабываў з яе сродкі для існавання, але зямля была для яго верай, законам, крытэрыем вартасці ў жыцці.

Такім чынам, рухаючыся ў напрамку спасціжэння свету беларускага селяніна, Я. Колас выяўляў стрыжнёвыя моманты, якія кіруюць развіццём нацыі: прыродны, “натуралістычны“ пачатак, які, з аднаго боку, служыць ахоўнікам, кансервантам нацыі, а з другога,

у кардынальна новых сацыяльна-эканамічных, палітычных умовах можа стаць трывалым падмуркам для якасна новых змен у яе лёсах.

У сваёй творчасці Я. Колас пайшоў далей сістэмнага даследвання духоўнай сутнасці беларусаў. Зразумеўшы, што беларусы вартыя лепшай долі, неабходна было выявіць сілы, якія б дапамаглі пераадолець коснасць мінулага, якія б маглі даць штуршок да нацыянальнага адраджэння. У творчасці Я. Коласа чырвонай ніткай праходзіць матыў, "што чалавек у асноўным сам павінен сфармаваць, "пабудаваць" сябе як духоўную асобу і пераважна сам, не дужа на некага пакладаючыся і не вельмі перад кімсьці згінаючыся "траўкай пахілаю", выкаваць "спружыны ўласнай долі". Селянін, герой апавядання "Паўлюковы думкі", абстрагуецца ад штодзённых клопатаў, ён спрабуе аналізаваць законы, па якіх усталяваны свет, спрабуе зразумець прычыны сацыяльнай несправядлівасці. "Мой моцны Божа! Усім ты даў запаведзь – вялікую запаведзь – у цяжкай працы, потам крывавым даставаць хлеб свой. Чаму ж не ўсе людзі працуюць? Чаму адны знялі ярмо з свае шыі і ўзлажылі яго на шыі другіх?.. Няўжо ж ты, божачка, пчале і мурашцы даў большы розум і душу, як чалавеку?" [4, Т. 4, с. 24]. У творах Я. Коласа з'яўлюцца "новыя" сяляне, па сутнасці, новае пакаленне беларусаў, якія не толькі моцныя ўсведамленнем уласнай годнасці, але і перакананнем, што вырашэнне іх лёсу толькі ў іх руках. Ва ўсіх гэтых персанажах мы бачым цэльнасць, імкненне змяніць жыццё, нясцерпную прагу зламаць аковы прыгнёту, надакучлівага страху выйсці за межы сваёй сацыяльнай нішы. Пакуль што гэты пошук ідзе пераважна ў напрамку напружанай ўнутранай барацьбы, спасціжэння свайго ўнутранага "я", усведамленні сябе як самакаштоўнаснай адзінкі свету. Самым яскравым, з гэтага пункту гледжання, у галерэі персанажаў новай генерацыі беларусаў з'яўляецца вобраз Міхала ў паэме "Новая зямля". Яго асаблівая моц заключаецца ў тым, што спрадвечныя турботы і спадзяванні селяніна набываюць тут якасна новы, больш высокі сэнс і гучанне. Набыццё зямлі для Міхала вырашае самае галоўнае пытанне – пытанне волі.

У паэме фактычна створана мадэль існавання нацыі. Як уласная зямля дасць умовы для годнага жыцця Міхала, так і незалежнасць можа стварыць аптымальныя ўмовы для паўнавартаснай эвалюцыі нацыі. Незалежнасць створыць умовы для новага жыцця, для жыцця на якасна новым узроўні, бо гэта будзе якасна новы тып сацыяльных зносін. Такім чынам, мы можам лічыць паэму "Новая зямля" праграмным творам беларускага Адраджэння, убачанага вачыма Я. Коласа: твор скандэнсаваў у сабе не толькі знешнія,быццёвыя праявы ўнутранага свету

селяніна, але і выразна акрэслівае адзінамагчымы варыянт развіцця нацыі. У гэтым сэнсе і назва твора набывае новае гучанне: “новая зямля” – “terra inkognita”. Я. Колас указвае на незавершанасць, незакончанасць самаідэнтыфікацыі беларускага этнасу ў плане духоўнага ўсведамлення сваёй нацыянальнай адметнасці, і разам з тым гучыць матыў спасціжэння гэтага неспазнанага мацерыка” [5, с. 76].

У пачатку XX ст. Я. Колас стаў творчай асобай, якая на высокамастацкім, высокаэстэтычным узроўні здолела выразіць памкненні, ідэалы свайго народу, свайго часу, акрэсліць праграму нацыянальнага развіцця. На пачатку XX ст. актуальнасць Коласавых твораў была абумоўлена не толькі унікальнасцю творчай манеры пісьменніка, асаблівасцю яго мастацкага светапогляду. Сын земляроба, ён геніяльна проста і зразумела паказаў “свой”, сялянскі свет, сялянскую культуру найперш для “сваіх” зразумелымі, “сваімі” словамі. Зрабіў ён гэта сістэмна, шматузроўнева. Дыяпазон яго паказу сялянскага светапогляду пайшоў праз энцыклапедычны паказ “абыдзенай” паўсядзённасці да глыбокага і вельмі тонкага даследавання душы селяніна, вылучэння характарыстычных элементаў яго светапогляду, а значыць і менталітэту. Такі паказ селяніна, такая інтэрпрэтацыя мадэлі сялянскага светапогляду добра ўпісваліся ў запатрабаванні, чаканні грамадства: пошук новых ідэалаў новага грамадства, каштоўнасцей для пабудовы новай культуры. І “сялянскасць“ псіхікі паэта, якая выявілася ў ціхім і натхнёным выяўленні любові да родных палёў, лясоў, народу, рабіла яго зразумелым усім класам беларускага грамадствам. Здольнасць самыя празаічныя і штодзённыя праявы рэчаіснасці годна ўвасобіць у літаратуры сур’ёзнай якасці, узняць на небывала высокі эстэтычны ўзровень, выразіць глыбінна ўнутранае і перажытае, пра самае важнае і набалелае сказаць проста і кранальна – усё гэта разам дазволіла Я. Коласу стаць адным са стваральнікаў культурнай пляцоўкі ў развіцці беларускай культуры XX ст. і тым самым стаць у шэраг геніяльных мастакоў слова беларускага Адраджэння.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**


1 Жураўлёў, В. П. Чалавек на шляху "малой" і вялікай свабоды / В. П. Жураўлёў // Каласавіны : матэрыялы навук. канф. (1997). – Мінск,1998. – С. 71–75.

2 Колас, Я. Аўтабіяграфія / Я. Колас / З жыццяпісу Якуба Коласа : Дакументы і матэрыялы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 383 с.

3 Колас, Я. Аўтабіяграфія 1913 г. / Я. Колас / З жыццяпісу Якуба Коласа : Дакументы і матэрыялы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 383 с.

4 Колас, Я. Збор твораў у 14 тт. – Мінск : Маст. літаратура,1972. – 243 с.

5 Максімовіч, В. Я. Колас і мадэрнізм / В. Максімовіч // Каласавіны : матэрыялы навук. канф. (1997). – Мінск,1998. – С.76–77.

6 Міцкевіч, Д. Слова пра бацьку / Д. Міцкевіч / Успаміны пра Я. Коласа. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 246 с.

7 Мушынскі, М. І. Свайму часу і вечнасці / М. І. Мушынскі / Колас Я. Збор твораў. У 20 тт. Т.1. Вершы (1898–1910). – Мінск : Беларус. навука, 2007. – С. 8–145.

**УДК 94:323.1(476)"19":929*А.Л.Погодин**

**С. Ф. Шимукович**
(Минск, ГУО «Республиканский институт высшей школы»)

## ПРОФЕССОР А. Л. ПОГОДИН И БЕЛОРУССКОЕ НАЦИОНАЛЬНОЕ ДВИЖЕНИЕ В НАЧАЛЕ XX ВЕКА

Белорусское национальное движение в начале XX в. почти не привлекло внимания российских интеллектуальных элит, отсутствуют сколько-нибудь серьезные аналитические работы о причинах белорусского движения, его характере, специфике, целях и задачах. Одновременно отметим, что украинское национальное движение, более мощное и ранее оформившееся, вызывало неподдельный интерес среди российских специалистов-гуманитариев, что можно объяснить, как наличием в начале столетия на украинских землях нескольких высших учебных заведений, и это давало возможность наблюдать процессы нациестроительства как бы изнутри, так и стратегическим значением украинского региона в составе империи.

В этой связи определенный интерес представляют немногочисленные работы по национальному вопросу в России, в которых белорусское национальное движение хотя бы просто упоминается. Одним из представителей интеллектуальных элит империи, который знакомил коллег с белорусами, был профессор Варшавского (позднее – Харьковского) университета, известный исследователь истории славян, Александр Львович Погодин. Современные российские исследователи отмечают его заслуги в изучении всех славян, особенно в полонистике [1; 2; 3],

но ничего не пишут о его интересе к белорусскому движению. Интерес А. Л. Погодина к белорусам исходит из особенностей его биографии.

А. Л. Погодин родился в Витебске в семье русского чиновника, работавшего в губернской администрации. В детстве он выучил польский язык, доминировавший в среде региональных элит, познакомился с польской культурой, к которой сформировал уважительное отношение [2, с. 166–167]. Стоит отметить, что враждебное отношение среди русских чиновников не только к польской культуре, но и проявлениям белорусскости, было обычным. Более того, некоторые «правые» профессора, например, П. А. Кулаковский (уроженец Западного края), отмечал, что белорусское возрождение – это польская интрига, а белорусчизна – это пустая выдумка, так как белорусы, украинцы и великорусы – это один народ [4, 1909. № 21].

А. Л. Погодин отмечал, что в либеральных кругах российского общества, готового согласиться с автономией Польши, отсутствовало согласие на польские претензии на Западный край: «…русское общественное мнение делало в своей оценке восстания коренное различие между самой Польшей, с одной стороны, и Литвой, и Юго-Западным краем, с другой. Если с поляками из Царства считали возможными известные примирительные соглашения, то участие поляков литовских и украинских в восстании возбуждало всеобщее негодование. <...> Притязания поляков на Литву наткнулись на протест среди русских либералов, сделав невозможными дальнейшие попытки сговориться» (цит по: [1, с. 39]). В свою очередь, обвинения в том, что белорусское движение есть «польская интрига» вызывало настороженное отношение к белорусам среди русских либералов.

В этой связи молодому белорусскому движению огромную поддержку оказал профессор А. Л. Погодин, который с научной точки зрения обосновывал право народов на культурное развитие, при этом отмечал готовность белорусов к самостоятельному национальному развитию. А. Л. Погодин являлся крупнейшим для своего времени специалистом по польскому вопросу, он был автором ряда системных работ по польской истории. Например, его исследование «Главные течения польской политической мысли (1863–1907)» хоть и вызвала критические отзывы некоторых коллег, но в целом показало, что А. Л. Погодин прекрасно разбирался в тонкостях польского вопроса и в региональной специфике [1, с. 37–38]. Естественно, рассмотрение белорусского вопроса было невозможно вне польского контекста. Ученый не склонен был идеализировать польское влияние в Западном крае, указывая на вред полонизации, однако некоторые исторические процессы трактовал

в разрез с официальной установкой. Будучи профессором Варшавского университета, в 1901 г. он опубликовал исследование «Виленский учебный округ в 1803–1831 гг.», в котором подчеркнул просветительское и научное значение университета, его заслуги в подготовке научных кадров для региона, зарождавшийся интерес к региональным исследованиям и региональному развитию среди профессоров и студентов в рамках тайных обществ [6].

А. Л. Погодин детально интересовался всем, что происходило в рамках белорусского движения и оказывал ему информационную поддержку. В свою очередь, на страницах «Нашей Нивы» он стал самым упоминаемым российским профессором. Газета перепечатывала выдержки из его статей, опубликованных в центральных изданиях, анонсировала его научные труды, освещала события с участием ученого.

Так, в мае 1909 г. газета писала о прошедшем в предыдущем году славянском съезде в Петербурге, на котором А. Л. Погодин вступил в полемику с профессорами П. А. Кулаковским и И. П. Филевичем, отметив, что: «не нужно препятствовать развиваться никакой нации, пусть она сама управляет своей жизнью как хочет. Все равно развитию национального духа помешать нельзя. Так нужно смотреть и на украинцев и на белорусов. <…> и украинское и белорусское движение – государственное, они не ведут к разделу и развалу государства, они работают на то, чтоб Россия была сильная и единая, и это будет тогда, когда все нации в России получат равные права» [4, 1909. № 21].

Ранее, в декабре 1908 г., газета писала посещении А. Л. Погодиным Вильно с публичной лекцией о кризисе в Боснии и Герцеговине. Однако в Вильно профессор прокомментировал и «белорусский вопрос». Как писала газета: «Вот и теперь, на лекции, вспоминал он добрым словом наш народ, а в беседе с корреспондентом «Виленского Вестника» ясно высказал желание, что для белорусов нужно завести белорусские народные школы, так же как и у литвинов есть школы, где детей учат на их родном языке. Из этих слов проф. Погодина видно, <…> что только «истиннорусские» люди унижают наш язык и говорят использовать его только в доме <…>, за то лучшие из русских людей искренне сочувствуют возрождению белорусов» [4, 1908. № 26].

Право малых наций на культурное развитие, национальную автономию он развил и в работе, опубликованной в рамках полемики вокруг сборника «Вехи». В статье «К вопросу о национализме» А. Л. Погодин писал, что: «…народности, достигшие известного культурного развития, предъявляют к государству требование на признание за их культурой тех прав на самоуправление и национальную школу, которые

заключаются в разумной децентрализации государственного управления; добровольно соглашаясь на эти требования, государство делает национализмы провинций для него не опасными; но если между ним и этими национализмами начинается борьба, то государство находится в положении больного…». Профессор с сожалением констатировал: «…нас раздирает нелепая, ненужная война между государством и народами, составляющими его» [7, с. 142].

